Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 КРАСАВІКА 2009 г.
СУБОТА
№ 68
(26426)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Вялікдзень 12 красавіка 2009 года

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Вялікаднем Хрыстовым.

Традыцыі гэтай светлай урачыстасці зыходзяць з глыбіні стагоддзяў, сімвалізуючы перамогу жыцця, адраджэнне і абнаўленне духоўнага свету чалавека. Вялікдзень раскрывае сапраўдны гуманізм хрысціянства, які сцвярджае вялікую духоўную энергію ўсёдаравання і любові.

У такія дні вернікаў перапаўняюць пачуццё глыбокай, шчырай радасці і імкненне рабіць добрыя справы, акружаць цяплом і клопатам тых, хто мае патрэбу ў спагадзе і спачуванні.

Няхай вялікае свята Уваскрэсення Хрыстовага прынясе ў вашы дамы і сем'і дабрабыт, узаемаразуменне і веснавы настрой, надасць сілы для новай працы ў імя ператварэння і росквіту беларускай зямлі, умацавання ідэалаў справядлівасці, міласэрнасці і бескарыслівай дапамогі блізкаму.

Шчыра жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў ва ўсіх пачынаннях, шчасця і дабра.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Пастырскае пасланне на Вялікдзень 2009

УВАСКРЭСНУЦЬ У ХРЫСЦЕ ЎВАСКРОСЛЫМ

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Уваскрасенне Тваё славім, Хрыстэ Пане.

Дарагія ў Хрысце Уваскрослым браты ў святарстве, законнікі і законніцы, браты і сёстры, людзі добрай волі!

«Не бойцеся. Шукаеце Езуса Назаранина, укрыжаванага; Ён уваскрос, Яго тут няма. (...) Але ідзіце, скажыце вучням Ягоным і Пятру: Апярэдзіць вас у Галілеі. Там Яго ўбачыце, як Ён сказаў вам» *(Мк 16, 6—7).*

З гэтымі словамі звярнуўся Анёл да жанчын міраносіц, якія на трэці дзень раніцай прыйшлі да грабніцы Хрыста, каб паводле юдэйскага звычаю намасціць Ягонае цела пахучым алеем — мірам. Ім, спачатку перапалоханым, гэтыя словы далі новую надзею на тое, што іх Настаўнік жыве. Гэтыя словы і сёння нам, людзям XXI стагоддзя, таксама даюць новую надзею, якая ёсць у Езусе Уваскрослым. Таму разам з прарокам Осіям мы можам усклікнуць: «Смерць! Дзе тваё джала? Пекла! Дзе твая перамога?» *(Ос 13, 14).*

Падчас сваёй развітальнай размовы з вучнямі Езус аб'яўляе ім пра сваю смерць і ўваскрасенне таямнічаю фразаю: «адыходжу і прыйду да вас» *(Ян 14, 28).* Смерць — гэта адыход, прычым адыход назаўсёды, без магчымасці вяртання. Кожны з нас гэта вельмі добра разумее. Аднак у Евангеллі мы сустракаемся з чымсьці істотна новым, і гэтая навіна змяняе свет. Увесь наш вопыт сведчыць пра тое, што памерці — гэта значыць адысці навечна, бо адтуль няма вяртання. Езус жа пра сваю смерць кажа: «адыходжу і прыйду». Звычайнаму чалавеку вельмі складана зразумець, якім чынам у адыходзе можна бачыць прыйсце. Аднак на самай справе адыход Езуса распачынае Яго новую прысутнасць. Ягоная смерць — гэта акт любові, а любоў несмяротная. Менавіта таму Ягоны адыход ператвараецца ў новае прыйсце, у такую форму прысутнасці, якая ніколі не завяршаецца, як кажа Папа Бэнэдыкт XVI[1].

У жыцці кожнага з нас бываюць такія моманты, калі здаецца, што ўсё выпадае з рук, што няма выйсця з цяжкай сітуацыі. Часам даводзіцца перажываць такі глыбокі духоўны крызіс, што чалавекам пачынаюць апаноўваць адчай і роспач. І толькі ўваскрослы Хрыстус вяртае надзею нават насуперак надзеі *(Рым 4, 18).* Бо хто і калі бачыў, каб памерлы сам уваскрос? А тут Ён, укрыжаваны Езус, зноў сярод нас. З намі Той, хто заўсёды памятае пра нас і спяшаецца нам на дапамогу. Гэта Езус, які перамог смерць, грэх і злога духа. Ён перамог і кліча нас на сустрэчу з Ім; кліча таксама, як некалі клікаў апосталаў. Месца сустрэчы — Галілея.

Сапраўды, Галілея — гэта цудоўнае месца на Святой Зямлі, поўнае зеляніны, што з'яўляецца сімвалам жыцця. У гэтым куточку нібы сама прырода буяннем дрэваў і красак сярод навакольнай бязжыццёвай пустыні сведчыць пра тое, што жыццё перамагло смерць. Гэта таксама нерукатворная алегорыя духоўнага жыцця, якое ў Езусе Хрысце не ведае смерці.

Дзе ж тая Галілея і як туды трапіць? Каб знайсці адказ на гэтае пытанне, мы павінны мець на ўвазе не геаграфічную Галілею, а Галілею духоўную. Для кожнага верніка прызначаная месцам сустрэчы Галілея знаходзіцца там, дзе ёсць Езус. Гэта перадусім святы Касцёл — містычнае цела Хрыста, які існуе ў часе і ў прасторы. Езус заснаваў свой Касцёл як знак еднасці і як бы сакрамэнт паўсюднага збаўлення[2]. Кожны чалавек павінен задумацца над словамі святога Кіпрыяна Карфагенскага, які ўжо ў трэцім стагоддзі пісаў, што *extra Ecclesiam nulla salus* — па-за Касцёлам няма збаўлення. Гэта — надзейны арыенцір, і калі мы будзем прытрымлівацца яго, ніколі не заблукаем.

Сёння мы ўсе спяшаемся ў нашыя прыгожа аздобленыя святыні, каб пад велічны перазвон званоў і ўзнёслы спеў «Хвала на вышынях Богу» святкаваць урачыстасць, якая з'яўляецца падмуркам нашае веры. Яшчэ святы Павел сказаў, што «калі Хрыстус не ўваскрос, дык марнае і прапаведаванне нашае, і вера наша марная» *(1 Кар 15, 14).* А пра тое, што і наша вера, і абвяшчэнне Евангелля — гэта не пустыя словы, найлепш сведчыць сама гісторыя хрысціянства. Столькі ў ёй было і ёсць пераследаў, столькі ўнутраных цяжкасцяў, здрадаў і адыходаў ад Евангелля, што сапраўды ўжо неаднойчы здавалася, што «Бог памёр», як казаў прадвеснік нацызму і папярэднік постмадэрнізму Фрыдрых Ніцшэ, або, што рэлігія — гэта толькі «опіум для народа», як пісаў стваральнік «навуковага камунізму» Карл Маркс. Сёння фаліянты гэтых ідэолагаў атэізму пакрываюцца пылам на паліцах бібліятэк, ды і пра іх саміх ужо мала хто згадвае, а слава Уваскрослага Пана абвяшчаецца ва ўсім свеце.

Аднак у гэтыя радасныя хвіліны мы павінны таксама задумацца і над некаторымі менш аптымістычнымі рэчамі. Хоць сёння нашыя святыні перапоўненыя, а па вуліцах праходзяць Эўхарыстычныя працэсіі ў гонар Уваскрослага Пана, нас не можа не турбаваць пытанне, чаму не кожную нядзелю ў касцёлах бывае столькі людзей. Сённяшняя вялікая колькасць вернікаў — што гэта: сапраўдны і глыбокі выраз нашай веры, ці толькі даніна традыцыі і модзе? Маўляў, усе ідуць і я пайду, бо што скажуць суседзі, знаёмыя... Ці мы сапраўды кожны дзень нашага жыцця жадаем жыць ісцінай Уваскрасення? Ці імкнемся на ёй будаваць нашую веру? Ці стараемся ўздымацца над сваімі слабасцямі і паўставаць з грахоў?

(Заканчэнне на 2-й стар.)

[1] *Пар. гамілія Бэнэдыкта XVI падчас Пасхальнай вігіліі ў ватыканскай базыліцы св. Пятра, 22 сакавіка 2008 г.*

[2] *Пар. LG 1.*

Аляксандр Лукашэнка і Патрыярх Кірыл абмеркавалі праблемныя пытанні ва ўзаемаадносінах Беларусі і Расіі

Учора падчас рабочага візіту ў Расійскую Федэрацыю Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам. Дамоўленасць аб гэтай сустрэчы была дасягнута падчас візіту кіраўніка дзяржавы ў Сочы.

На сустрэчы з Прадстаяцелем Рускай праваслаўнай царквы ў Маскве беларускі Прэзідэнт паведаміў, што «хацеў бы расказаць, як ідуць справы ў Беларускай праваслаўнай царкве, якія праблемы і як яны вырашаюцца, што адбываецца цяпер на брацкай беларускай зямлі, якую вы вельмі добра ведаеце». Сустрэча працягвалася больш як тры з паловай гадзіны.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, падводзячы вынікі гутаркі, на сустрэчы разгледжаны цэлы комплекс пытанняў, што датычацца праваслаўнай царквы, узаемаадносінаў з іншымі канфесіямі. «Мы абмеркавалі пытанні нашага адзінства, перш за ўсё Беларусі і Расіі, пытанні, якія вырашаюцца і не вырашаюцца ў адносінах дзвюх краін», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён таксама дадаў, што Патрыярх добра ведае Беларусь, наведаў многія гарады і вёскі, таму «нам было прасцей кантактаваць».

У сваю чаргу Патрыярх Кірыл адзначыў, што размова насіла вельмі адкрыты характар. «Гутарка была без якой-небудзь штучнай дыпламатыі», — сказаў ён. Паводле слоў Патрыярха, яму было важна даведацца меркаванне Прэзідэнта Беларусі наконт сувязяў, кантактаў з Расіяй, тэмы міжканфесійных адносінаў. «Я расказаў Аляксандру Лукашэнку, над чым мы працуем у Расіі, як павінны развівацца царкоўна-дзяржаўныя адносіны», — сказаў Патрыярх.

Фота БЕЛТА.

Акрамя таго, паводле слоў прадстаяцеля Рускай праваслаўнай царквы, на сустрэчы абмеркаваны пытанні «ўдасканальвання адносінаў паміж народамі, перш за ўсё брацкімі, якія ўвахо-дзяць у святую Русь, — рускімі, беларусамі, украінцамі». Ён дадаў, што сустрэча дапамагла яму «зразумець многія рэчы».

Пасля завяршэння сустрэчы з Патрыярхам Кірылам Прэзідэнт Беларусі наведаў Богаяўленскі (Елахаўскі) кафедральны сабор, дзе ўсклаў кветкі на магілу нябожчыка Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі даюць імпульс вырашэнню многіх непераадольных пытанняў

Учора пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са сваім расійскім калегам Дзмітрыем Мядзведзевым. Сустрэча праходзіла ў загараднай рэзідэнцыі кіраўніка расійскай дзяржавы «Горкі».

«Нашы сустрэчы актывізуюць чыноўнікаў, як вы кажаце, трымаюць іх у тонусе. Напярэдадні вырашаюцца многія пытанні, якія здаваліся непераадольнымі да сустрэчы», — сказаў беларускі лідар.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

(Больш падрабязна — у наступным нумары.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГРУЗІНСКАЯ АПАЗІЦЫЯ АБВЯСЦІЛА АКЦЫЮ ГРАМАДЗЯНСКАГА НЕПАДПАРАДКАВАННЯ

Прадстаўнікі грузінскай апазіцыі, якія 10 красавіка зноў сабраліся на мітынг у Тбілісі, абвясцілі, што пачынаюць «акцыі грамадзянскага непадпарадкавання».

«Непадпарадкаванне» будзе выяўляцца ў тым, што штодня, з 15:00 да 21:00 прыхільнікі апазіцыі будуць пікетаваць будынак парламента, будынак Грамадскага тэлебачання, а таксама трасу, якая вядзе да прэзідэнцкай рэзідэнцыі. У 21:00 апазіцыянеры плануюць збірацца каля парламента, каб узгадніць планы на наступны дзень. Апазіцыя заяўляе, што зробіць усё магчымае, каб сарваць працоўны графік прэзідэнта і яго атачэння. Неўзабаве аналагічныя акцыі могуць пачацца па ўсёй краіне.

АБАМА ЛЮБІЦЬ СЕРЫЯЛЫ, А НАВІНЫ ДАВЕДВАЕЦЦА З ГАЗЕТ

Прэзідэнт ЗША Барак Абама падладжвае свой працоўны графік пад серыялы і можа гадзінамі глядзець спартыўныя трансляцыі.

Пра любімыя тэлешоу гаспадара Белага дома піша The Daily Mirror. Высветлілася, што 44-ы прэзідэнт ЗША ў захапленні ад даволі скандальнага серыяла Entourage — «мыльнай оперы», дзе, дарэчы, істотнае месца займае і тэма сэксу. Амерыканскі лідар гатовы змяніць свой працоўны графік, каб не прапусціць ніводнага эпізоду серыяла. Акрамя таго, амерыканскі прэзідэнт любіць крымінальны серыял The Wire. Аднак больш за ўсё Абаму падабаюцца рознае спартыўныя перадачы і трансляцыі. Навіны па тэлевізары Абама амаль ніколі не глядзіць, а любіць даведвацца пра ўсё з газет.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

У гарадскім пасёлку Шарашова Пружанскага раёна прыходжане парафіі і касцёла Святой Тройцы напярэдадні Вялікадня абнавілі фігуру Хрыста на прыдарожным крыжы.

Закрытое страховое акционерное общество «Бролли»

220030, г. Минск, ул. Ульяновская, 31, факс (017) 210 46 33, тел. 222 48 80

УНП 100782388

ГОДОВОЙ БАЛАНС за 2008 год *тыс. руб.*

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	2989830,8	**Источники собственных средств, всего**	**8265170,0**
Нематериальные активы	2931,3	в том числе:	
Финансовые вложения, всего	310579,7	уставный фонд	6548187,6
в том числе:		резервный фонд	19974,5
инвестиции в дочерние общества	—	добавочный фонд	44710,3
инвестиции в другие организации	3000,0	фонд накопления	794651,8
облигации и другие долговые обязательства	307579,7	фонд потребления	—
прочие финансовые вложения	—	целевое финансирование	—
Доля перестраховщиков в страховых резервах	**1337343,4**	нераспределенная прибыль прошлых лет	—
Дебиторы, всего	**605170,0**	нераспределенная прибыль отчетного года	857645,8
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	45195,4	Страховые резервы и фонды, всего	10249050,4
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	—	в том числе: страховые резервы	10122703,8
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	559974,6	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	126346,6
Прочие активы, всего	**13789756,6**	гарантийные фонды	—
в том числе: незавершенное строительство	—	Кредиторы, всего	501390,4
материальные ценности и затраты	470881,3	в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	95873,2
денежные средства	13318844,9	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	—
собственные акции (доли)	—	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	—
прочие активы	30,4	заемные средства	—
Непокрытые убытки прошлых лет	**173836,0**	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	405517,2
Непокрытые убытки отчетного года	—	**Прочие пассивы**	**193837,0**
БАЛАНС	**19209447,8**	**БАЛАНС**	**19209447,8**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ за 2008 год *тыс. руб.*

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
страховые взносы (премии)	010	—
страховые выплаты	020	—
изменения резерва по страхованию жизни (+или-)	030	—
отчисления в гарантийный фонд	040	—
расходы на ведение дела	041	—
Результат от операций по страхованию жизни (+или-)	050	—
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	064	16874217,2
изменение резерва незаработанной премии-нетто перестрахование (+или-)	067	- 2340943,4
оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование	082	7291910,6
изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+или-)	092	- 536659,6
изменение других технических резервов (+или-)	100	—
изменение иных страховых резервов (+или-)	105	—
отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	49212,6
расходы на ведение дела	120	7109758,0
комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	161014,8
комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	68034,8
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+или-)	130	- 361287,0
III.Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
операционные доходы	140	1913563,2
операционные расходы	145	88386,8
внереализационные доходы	150	36998,9
внереализационные расходы	155	215337,9
прибыль и убытки	157	1285550,4
использовано прибыли	158	427904,6
Нераспределенная прибыль(убытки) отчетного периода (+или-)	170	857645,8

Достоверность бухгалтерской отчетности подтверждена обществом с дополнительной ответственностью «Промаудит» 16 февраля 2009 года, специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495307 от 19.12.2008 года выдана Министерством финансов РБ со сроком действия до 02.02.2014 года.

Справочно: сообщаем, что с 17.02.2009 г. изменилось наименование ЗСАО «Бролли» на Закрытое акционерное общество «Страховая компания «Белросстрах».

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской (финансовой) отчетности

Генеральному директору ЗСАО «Бролли» С.Н. Ковалеву

Аудируемое лицо:

Наименование: Закрытое страховое акционерное общество «Бролли».

Местонахождение: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ульяновская, дом 31, литер Е 6/к.

Государственная регистрация: № 100782388 от 23 августа 2001 года. УНП 100782388. ***Аудиторская организация:***

Наименование: Общество с дополнительной ответственностью «Промаудит».

Местонахождение: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кольцова, дом № 39, корп. 1, комн. 1.

Государственная регистрация: №100073476 от 31 октября 2000 года, УНП 100073476.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности: № 02200/0495307 выдана Министерством финансов Республики Беларусь (решение № 432 от 19 декабря 2008 года) и действительна до 02 февраля 2014 года. Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности закрытого страхового акционерного общества «Бролли», состоящей из:

- бухгалтерского баланса страховой организации на 1 января 2009 года;
- отчета о финансовых результатах страховой организации, приложения к балансу страховой организации, отчета об основных показателях финансово-хозяйственной деятельности страховой организации, отчета о движении денежных средств страховой организации, отчета о платежеспособности страховой организации, отчета о размещении страховых резервов за период с 1 января по 31 декабря 2008 года;
- пояснительной записки с приложениями к ней.

Руководство ЗСАО «Бролли» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на:

- разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий;
- выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности и соответствии совершенных ЗСАО «Бролли» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значение и раскрытие информации в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ЗСАО «Бролли» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗСАО «Бролли», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗСАО «Бролли» на 1 января 2009 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год. При этом совершенные ЗСАО «Бролли» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Руководитель аудиторской организации:
Директор ОДО «Промаудит»
А.В. Анисович **16 февраля 2009 года**

Аудитор, возглавлявший аудит:
Директор ОДО «Промаудит»
А.В. Анисович **16 февраля 2009 года**

белагропромбанк
традиции будущего

Вниманию акционеров открытого акционерного общества «Белагропромбанк»

г. Минск, проспект Жукова, 3

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что согласно решению годового Общего собрания акционеров от 27.03.2009, протокол № 4, с 25 мая т.г. начнется выплата дивидендов по итогам работы банка за 2008 год.

Размер дивидендов составляет:

- по привилегированным акциям – 300 рублей на 1 акцию
- по простым (обыкновенным) акциям всех выпусков – 3,44 рубля на 1 акцию.

Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, формируется на основании реестра владельцев акций по состоянию на 20.02.2009.

Выплата дивидендов осуществляется в филиалах и отделениях банка юридическим лицам в безналичном порядке путем зачисления на текущие (расчетные) счета, физическим лицам — в безналичном порядке путем зачисления на счета для размещения вкладов (депозитов), карт-счета и другие счета или по заявлению акционера наличными денежными средствами при предъявлении документа, удостоверяющего личность.

Дополнительная информация по телефонам: (8017) 228 53 03, 250 60 01.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней; звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ; звонок с мобильного телефона (Life:), Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Суботнік для роднай зямлі

Рэспубліканскі суботнік, які адбудзецца сёння, прымеркаваны да Года роднай зямлі. Асноўная ўвага — на добраўпарадкаванне мемарыяльных комплексаў, месцаў вайсковай славы, пахаванняў воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны. Федэрацыя прафсаюзаў прыняла рашэнне аб правядзенні суботніка на комплексе «Курган славы» — паведаміла карэспандэнту «Звязды» **прэс-сакратар ФПБ Вольга ЗУЁНАК.** Пяць гадоў таму гэты мемарыял быў адноўлены сіламі ФПБ. Жыхары Міншчыны таксама будуць працаваць на добраўпарадкаванні комплексаў «Хатынь» і «Дальва». У суботніку будуць задзейнічаны і лесагаспадарчыя аб'яднанні, вяскоўцы. Як адзначылі ў галоўным упраўленні ідэалагічнай работы Мінскага аблвыканкама, па папярэдніх разліках падчас правядзення рэспубліканскага суботніка ў цэнтральным рэгіёне ўдасца зарабіць каля 1 мільярда рублёў. Дарэчы, у адпаведнасці з пастановай урада, палову зароблены сродкаў накіруюць на фінансаванне інфраструктуры аграгарадкоў. Астатнія грошы застануцца ў распараджэнні рэгіёнаў. Яны будуць выкарыстаны на рамонт, рэканструкцыю, рэстаўрацыю, аднаўленне і добраўпарадкаванне памятных месцаў, на падрыхтоўку да сезона адпачынку аздараўленчых лагераў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ВЕРБНІЦА

Нядзеля на шостым тыдні Вялікага посту называлася Вербнай нядзеляй, Вербніцай. У некаторых рэгіёнах былі вядомы і такія назвы — Вербіца, Вярбіч, Вярба (ад назвы расліны, якая раней за астатнія рэагуе на веснавую цеплыню і лічыцца сімвалам урадлівасці: колькі вярбу ні ламай, а яна праз хуткі час дасць новыя галінкі). Свята беларускага народнага календара Вербная нядзеля, або Вербніца, мае ўласна хрысціянскія вытокі і звязана з евангельскімі падзеямі. У Евангеллі ад Мацвея, дзе апісваецца жыццёвы шлях Сына Божага Ісуса Хрыста, паведамляецца пра найвялікшае з Яго цудаў — уваскрэсенне памерлага чатыры дні таму Лазара. Назаўтра Ісус прыйшоў у Іерусалім, жыхары якога сустракалі яго як самага дарагога госця, усцілаючы дарогу пальмавымі галінкамі. Хрысціянская царква надала гэтай падзеі статус найвялікшага свята, якое адзначаецца ў апошнюю перадвелікодную нядзелю, напярэдадні перадвелікоднага тыдня. Толькі замест пальмавых галінак славяне, у тым ліку і беларусы, выкарыстоўваюць у сваіх абрадах вярбу.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ДА ЭЛІТЫ — КРОК?

Зборная Беларусі абыграла ўчора каманду Літвы з лікам 3:0 на юнацкім чэмпіянаце свету па хакеі ў дывізіёне I. У чацвер нашы юнакі не пакінулі шансаў украінскім аднагодкам — 5:0. У заключным і рашаючым паядынку турніру заўтра беларусы згуляюць з казахамі. Пуцёўку ў эліту атрымае пераможца групы.

ПЕРШАЕ ПАРАЖЭННЕ БАТЭ Ў СЕЗОНЕ

Прайшлі першыя паўфінальныя матчы Кубка Беларусі 2008/2009. У Наваполацку мясцовы «Нафтан» выйграў 1:0 у барысаўскага БАТЭ. Перамогу прынёс Філіп Рудзік з адзінаццаціметровай адзнакі за хвіліну да фінальнага свістка. Адзначым таксама, што амаль увесь матч чэмпіён гуляў у меншасці. На 17 хвіліне за фол апошняй надзеі быў выдалены галкіпер Сяргей Верамко. У матчы паміж гродзенскім «Нёманам» і салігорскім «Шахцёрам» была зафіксавана баявая нічыя 1:1. Адбыліся першыя чвэрцьфінальныя паядынкі Кубка УЕФА. Данецкі «Шахцёр» забіў на сваім полі два бездаказныя мячы ў вароты «Марсэля», кіеўскае «Дынама» і ПСЖ згулялі па нулях у Францыі. Нямецкія «Гамбург» і «Вердэр» перамаглі сваіх супернікаў — англійскі «Манчэстэр Сіці» і італьянскі «Удінэзэ» з лікам 3:1.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещении о проведении 29 апреля 2009 года открытого аукциона № 05-Сф-09 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в г. Минске (газета «Звязда» от 02.04.2009 № 61, газета «Вечерний Минск» от 06.04.2009 № 63) вместо слов «Аукцион состоится 29 апреля 2009 года в 11.00» – следует читать «Аукцион состоится 29 апреля 2009 года в 15.00».

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 11.04.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 835,00
▼ 1 еўра	3 722,64
1 латвійскі лат	5 251,95
1 літоўскі літ	1 078,27
1 чэшская крона	140,77
1 польскі злоты	851,21
▲ 1 расійскі рубель	84,30
1 украінская грыўня	351,74

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РБ

USD	33,6309
10 UAH	41,7257
1000 BYR	11,9216
EUR	44,1607

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Прэзідэнт павіншаваў

...В. Чарнамырдзіна з днём нараджэння

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Расійскай Федэрацыі ва Украіне, спецыяльнаму прадстаўніку Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па развіцці гандлёва-эканамічных адносінаў з Украінай Віктару Чарнамырдзіну з нагоды дня нараджэння.

...інфармагенцтва «Інтэрфакс-Захад»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка напярэдадні 15-годдзя інфармацыйнага агенцтва «Інтэрфакс-Захад» павіншаваў яго калектыў з гэтай датай.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ВЕРБНІЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

● Асноўнай абрадавай падзеяй гэтага святочнага дня стала наведванне царквы з мэтай асвяціць галінкі вярбы, якім прыпісваліся шматлікія магічна-аздараўленчыя ўласцівасці. Звычай асвячаць галінкі дрэва вядомы са старажытных часоў у многіх народаў свету. Асноўны яго сэнс — дрэва, якое раней за іншыя адгукаецца на веснавое цяпло, на прабуджэнне зямлі, павінна парадаваць сваю моц, здароўе, прыгажосць чалавеку і хатнім жывёлам.

● Галінкі вярбы рыхтавалі загадзя. Звязвалі ў пучкі па тры ці пяць і ўпрыгожвалі кветачкамі з каляровай паперы або нават кветкамі, спецыяльна падрыхтаванымі і засушанымі з лета, а таксама рознакаляровымі стужкамі.

● У гэты святочны дзень забаранялася працаваць. У кожнай хаце накрывалі стол, запрашалі суседзяў, родзічаў у госці. І хоць ежа на стале была поснай, гэта не змяншала агульнай радасці і весялосці.

● Нашы продкі верылі, што асвячоная вярба дапамагала перасцерагчы хатнюю жывёлу ад ведзьмаў, ад «уразу» (благога вока суседзяў ці іншых аднавяскоўцаў), спрыяла добрай малочнасці. У сувязі з гэтым гаспадар абыходзіў з галінкамі вярбы ўсе пабудовы, дзе стаяла розная жыўнасць, і тройчы злёгку сцябаў пруцікам кожную жывёліну, а затым утыкаў яго ў шчыліну сцяны.

● Потым гаспадар ішоў у сад і таксама тройчы сцябаў кожнае пладаноснае дрэва, тое ж самае адбывалася ў агародзе і на ніве.

● Напрыканцы рытуальнага абходу гаспадар кіраваўся на могілкі і трохразовым лёгкім хвасткам вітаў магілы сваіх суродзічаў. Дарэчы, галінкі вярбы, што браліся на ніву і на могілкі, не несліся дадому, а ўтыкаліся ў зямлю на месцы правядзення рытуалу. Пры гэтым не забывалі папрасіць у матухны-зямліцы здароўя сабе і сваім блізкім. Этнографы мінулага ўспаміналі, што ўваткнуты пруток часта пускаў карані і з яго вырастала новае дрэва.

● Сярод этнаграфічных запісаў пахавальнага абраду, зробленых у XIX-XX стст., таксама ёсць спасылка на вярбу. Лічылася, што калі ў падушку, якую клалі пад галаву нябожчыку, пакласці асвячоныя галінкі вярбы, то гэта паспрыяе душы памерлага лёгка ўзняцца на нябёсы.

● Цудадзейную сілу вярбы даволі часта скарыстоўвалі як ахоўны або лячэбны сродак. У вербную нядзелю кожнаму ў сям'і раніцай трэба было з'есці па тры пупышкі асвячонай вярбы і запіць святой (вадохрышча або грамнічнай) вадой. Пры гэтым трэба было чытаць малітву або замову, напрыклад, такую: «Добры вечар, цёмна ноч! На табе вярбу і маю бяду. А мне маё здароўе назад аддай». Народныя знахары лічылі, што пасля гэтага чалавек будзе менш хварэць і паддавацца сурокам.

● Частку асвячоных галінак хавалі за бажніцу — у чырвоны кут, частку ўтыкалі ў сцены ці пад страху ўсіх пабудоў. Там яны будуць захоўвацца на працягу года — да наступнай Вербніцы. Галінкі вярбы лічылі адным з самых надзейных сродкаў, каб зберагчы хату ад пажару, удару маланкі, паводкі, а яе насельнікаў — ад ліхіх людзей і «дурных» вачэй.

● Рэшткі вярбы ніколі не выкідвалі, а захоўвалі да наступнай Вербніцы. І пасля таго, як будуць асвячоныя новыя галінкі, старыя назаўтра спальвалі ў печы (у многіх месцах галінкі спальвалі ў перадсвяточную суботу). Прычым попел абавязкова збіралі і рассыпалі па градках (там, дзе не ступае нага каровы ці каня). З вуснаў у вусны перадавалася чутка пра тое, што на тых градах, дзе быў рассыпаны попел ад асвячоных вербачак, пры любых умовах і надвор'і заўсёды ўродзяць добрыя агуркі.

● Лічылася, што той, хто кіне ці ўпусціць галінку асвячонай вярбы на зямлю, накліча на сябе праклён. Таму такую вербачку трэба было хутка спаліць у печцы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

УВАСКРЭСНУЦЬ У ХРЫСЦЕ ЎВАСКРОСЛЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі жанчыны міраносіцы спяшаліся да грабніцы Пана, то разважалі паміж сабою: «Хто адсуне нам камень ад уваходу ў магілу?» *(Мк 16, 3).* Да іх невымоўнага здзіўлення, Хрыстус сам сваёю сілаю зрабіў гэта. Так, вельмі часта дзверы нашых душаў завалены камянямі нашых грахоў. Ніхто іншы, акрамя нас, не зможа ўпусціць Хрыста, каб у святой споведзі Ён здзейсніў цуд уваскрашэння з грахоў і залежнасцяў. Па праўдзе кажучы, часам чалавек не адчувае, што жыве ў грахоўнай залежнасці. А бывае і так, што, усведамляючы гэта, проста не жадае выходзіць з яе, падобна да таго, як часам хворы адмаўляецца лячыцца і прымаць лекі. Нават калі хтосьці адчувае, што з'яўляецца хворым духоўна, тым не менш не заўсёды як найхутчэй спяшаецца да Боскага лекара, бо так жывуць многія і ён таксама ўжо прызвычаіўся да такога жыцця. Парадокс: чалавек лічыць за лепшае заставацца хворым, абы не лячыцца. У такім выпадку хвароба становіцца хранічнай, і ў душы чалавека ўзнікае цяжкая паталогія, а менавіта — знікненне адчування граху.

У гэтым і заключаецца найбольшая праблема сучаснага секулярызаванага свету. Мы здольныя весці вялікія змаганні дзеля новых дасягненняў у навуцы і тэхніцы, у культуры і спорце, мы прыкладаем вялізныя намаганні дзеля спазнання таямніцаў жыцця, матэрыі, космасу... Але пры гэтым духоўныя справы ўсё часцей занядбоўваюцца, і людзі ўдзяляюць ім усё менш увагі.

Святкуючы сённяшнюю ўрачыстасць, нам трэба памятаць, што здаволіцца толькі ўспамінам факту Уваскрасення Езуса Хрыста, не напаўняючы ім сваё жыццё, — гэтага відавочна замала, як замала толькі называцца хрысціянінам, якога акрамя пасведчання хросту больш нішто не яднае з Касцёлам. Праўда Уваскрасення Хрыста павінна стаць праўдаю нашага жыцця.

Уваскрасенне Хрыста — гэта асноватворчая падзея ў гісторыі чалавецтва; падзея, якая вывела ўсіх людзей з грахоўнай няволі, адарыла новым жыццём ласкі Божай, неабходнай для збаўлення.

Дзякуючы адкупленню, якое было здзейснена праз крыж і ўваскрасенне Хрыста, мы сталі дзецьмі Божымі з усімі вынікаючымі з гэтага наступствамі. Крыж і Уваскрасенне — гэта найвышэйшае праяўленне Божай міласэрнасці, доказаў каторай у апошнія часы мы атрымалі вельмі многа. Выражаючы ўдзячнасць за гэты дар і адчуваючы патрэбу ў ім, як адзінай надзеі сучаснаму свету, у нядзелю Божай міласэрнасці ў Мінска-Магілёўскай Архідыяцэзыі распачынаецца перэгрынацыя абраза Езуса Міласэрнага і рэліквій нашага земляка благаслаўлёнага Міхала Сапоцькі. Такім чынам сёлетні Вялікдзень уводзіць нас непасрэдна ў гэтую вялікую пастырскую акцыю з мэтай ажывіць культ Божай міласэрнасці і дапамагчы чалавеку даверыцца яму. Як дзеці Божыя і спадакаемцы Хрыста мы прызначаныя да жыцця вечнага, умоваю якога з'яўляецца нашае паўстанне з грахоў і ўваскрашэнне да жыцця ў ласцы Божай, гэта азначае прыняцце Божай міласэрнасці.

Як бачым, таямніца Пасхі — гэта не толькі дар, але адначасова і заданне, якое патрабуе ад нас перайсці да якасна новага жыцця дзяцей Божых. У хаосе і мітусні сучаснага свету мы не можам застацца глухімі да праўды пасхальнай таямніцы, каб яна не прайшла міма нас. Яна павінна стаць часткаю нашага жыцця, каб ужо не мы жылі, але ў нас жыў Езус Хрыстус *(Гал 2, 20),* як навучае святы апостал Павел.

Уваскрослы Хрыстус праз служэнне Касцёла прыходзіць да нас і сілаю любові і ласкі яднае нашае жыццё са сваім і нас паміж сабою. Напачатку гэта ўсё можа здавацца толькі прыгожаю тэорыяй, мала звязанаю з рэальнасцю. Але калі мы сапраўды будзем жыць абавязкамі, ускладзенымі на нас сакрамэнтам хросту, то пачнем адчуваць жыццёвую праўду гэтых словаў. Архышчаныя вернікі, якія жывуць праўдаю Уваскрасення, ўжо больш не чужыя паміж сабою, бо іх яднае Езус Хрыстус. Яны могуць жыць на розных кантынентах, належаць да розных культураў, сацыяльных слаёў і гэтак далей, але заўсёды і паўсюль яны — хрысціяне, аб'яднаныя адною верай, надзеяй і любоўю, якія іх фармуюць. Падмурак нашага жыцця паўсюль той самы — гэта Уваскрослы Езус Хрыстус, у якім мы ўсе ўтвараем адно цэлае *(Эф 2, 13—18).* І гэта не словы нашага сучасніка Біла Гейтса, які з дапамогаю інтэрнэту зрабіў увесь свет падобным на адну вялікую вёску, але вучэнне самога Хрыста.

З'яднаныя ў Хрысце Пану Уваскрослым браты і сёстры!

Ад усяго сэрца віншую вас з радаснай і збаўчай урачыстасцю Уваскрасення Хрыста! Віншую таксама вернікаў іншых хрысціянскіх супольнасцяў, якія разам з намі адзначаюць гэтае свята святаў. Віншую праваслаўных братоў і сясцёр, якія духоўна рыхтуюцца перажыць пасхальныя ўрачыстасці, што будуць адзначаць праз тыдзень. Праўда ўваскрасення Хрыста адна для ўсіх хрысціянаў, і яна кліча нас быць аб'яднанымі, асабліва ў справе абароны хрысціянскіх каштоўнасцяў.

Віншую ўсіх людзей добрай волі. Няхай гэтае свята, як свята трыумфу жыцця, прынясе больш радасці ў нашае жыццё, зробіць яго больш шчаслівым і ўмацуе надзею.

Даручаючы ўсіх вас апецы Марыі — Маці Збаўцы і нашай духоўнай Маці, — праз Яе заступніцтва прашу Уваскрослага Езуса, каб нашае жыццё было прасякнута духам Пасхі — гэтага пераходу са смерці да жыцця, а мы самі былі людзьмі святла і глыбокай веры, поўнымі ўзаемнай любові. На шлях духоўнага ўваскрашэння ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца і Сына, і Духа Святога. Амэн.

Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

Прамая лінія

САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА: КАМУ І НА ЯКІХ УМОВАХ?

Адрасная сацыяльная дапамога, падтрымка маламаёмных грамадзян, ветэранаў і інвалідаў — усе гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Пятроўны СЯРГЕЕВАЙ, начальніка аддзела па справах інвалідаў Рыты Валянцінаўны СУШКО і начальніка аддзела па справах ветэранаў Івана Пятровіча НАГІБІНА. «Прамая лінія» пройдзе 14 красавіка з 11 да 12 гадзін па тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэдне пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.**

Абзац

■ Мінамётную міну часоў Вялікай Айчыннай выявілі ў дзіцячым садку ў Гродне. Выбухованебяспечны прадмет быў знойдзены пры ўборцы тэрыторыі дзіцячага садка № 11. Аператыўнікі МНС і РАУС тэрмінова прыехалі на месца небяспечнай знаходкі, тэрыторыя садка была ацэпленая, эвакуявалі 150 дзяцей. Міна вывезена ў бяспечнае месца і ліквідавана.

■ У сельскіх магазінах Віцебшчыны на час пасяўной забароняць продаж спіртнога да абеду. У вобласці лічаць, што гэта дадатна адаб'ецца на прадукцыйнасці працы, а таксама дапаможа знізіць вытворчы траўматызм.

■ У Харкаве работнікі завода жалезабетоннай тэхнікі ў знак пратэсту супраць затрымкі зарплаты і масавых скарачэнняў не пусцілі на завод дырэктара прадпрыемства. Каля 20 супрацоўнікаў выстраіліся перад пачаткам працоўнага дня жывым ланцугом каля прахадной, перагарадзіўшы дарогу машыне свайго кіраўніка. Здаючы назад, аўтамабіль траўмаваў начальніка аднаго з цэхаў завода. Пацярпелы шпіталізаваны. На прадпрыемстве 8 месяцаў не плацілі зарплату, пачаліся масавыя скарачэнні. Ва ўсіх бедах рабочыя абвінавацілі дырэктара.

Поўны абзац

■ У горадзе Камсамольск Палтаўскай вобласці 9 красавіка паставілі помнік інспектару Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі. Помнік устанавілі на вуліцы Леніна каля цэнтральнай клумбы — там заўсёды шмат і пешаходаў, і аўтамабілістаў. Скульптура інспектара мае каларытныя пышныя формы, на фуражцы напісана «ДАІ», на грудзях — ордэн «Даюць — бяры». Скульптар расказаў журналістам, што першапачаткова на фуражцы было напісана «ДАЙ!», але пасля таго, як у майстэрню праніклі невядомыя і паспрабавалі разбіць скульптуру, ён вырашыў памяняць надпіс.

■ Жыхар Аўстрыі падаў у суд на сваю 73-гадовую маці, якая атакуе яго сваімі тэлефоннымі званкамі. Па яго словах, маці званіла яму па некалькі разоў на дзень апошнія 2,5 года. Іншы раз колькасць званкоў даходзіла да 50 за дзень. «Я проста хацела пагаварыць з ім, — заявіла жанчына на судзе. — Я не магу пагаварыць ні з сынам, ні з дачкой. Я не бачыла нават свайго ўнука, а яму 15 гадоў». Тым не менш суд прызнаў жанчыну вінаватай у праследаванні ўласнага сына. Цяпер яна павінна выплаціць штраф у памеры 360 еўра.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Банкаўскі сектар

УЗАЕМАВЫГАДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ФІНАНСІСТАМІ ІТАЛІІ

Дзеля падтрымання і пашырэння магчымасцяў дзелавога супрацоўніцтва паміж італьянскімі і беларускімі прадпрыемствамі днямі Белагразпрамбанк сумесна з кампаніяй «Agrotecnica s.r.l.» правялі семінар «Фінансаванне ААТ «Белаграпрамбанк» інвестыцыйных праектаў у галіне жывёлагадоўлі. Новыя тэхналогіі ў жывёлагадоўлі, вопыт Рэспублікі Беларусь і Італьянскай Рэспублікі».

У семінары бралі ўдзел: пасол Італіі ў нашай краіне спадар Джуліа Прыджоні, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Міхаіл Савельеў, перадавыя айчынныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, італьянскія кампаніі «Agrotecnica s.r.l.», «Rota Guido» і «TDM», якія з'яўляюцца лепшымі еўрапейскімі вытворцамі сельскагаспадарчага абсталявання і поўнакамплектных жывёлагадоўчых комплексаў.

Кіраўнік кампаніі «Agrotecnica s.r.l.» спадар Джорджыя Понці адзначыў, што для ўкаранення самых якасных тэхналогій у сферы сельскай гаспадаркі вялікую значнасць набывае ўзаемны абмен вопытам і карэктная адаптацыя сучаснага італьянскага абсталявання на тэрыторыі Беларусі. У рамках абмену вопытам кіраўніцтва кампаніі «Agrotecnica s.r.l.» прадугледжвае візіты беларускіх дэлегацый у Італію для наведвання заводаў—вытворцаў абсталявання.

Адным з цікавых кірункаў дзейнасці кампаніі з'яўляецца выраб установак для атрымання біялагічнага газу на аснове заатэхнічных сцёкаў з ужываннем самых новых еўрапейскіх тэхналогій і патрабаванняў па ахове навакольнага асяроддзя.

Сяргей КУРКАЧ.

ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД ОТОПИТЕЛЬНОГО ОБОРУДОВАНИЯ»

ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ

о проведении очередного собрания акционеров 12 мая 2009 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 — зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ

внеочередного общего собрания акционеров открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования»:

1. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли, расходов на потребление, выплате дивидендов за 2008 год.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

С материалами по вопросу повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (профком) с 4 мая по 12 мая 2009 г. с 10 до 15 часов.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 15.00 до 15.45 в день и по месту проведения собрания на основании документа, удостоверяющего личность. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, — документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 1 апреля 2009 г.

Наблюдательный совет.

УНП 100008064

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ»!

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ

состоится 20 апреля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О согласовании участия генерального директора ОАО «Белгорхимпром» в Совете Директоров ОАО «Трест Шахтоспецстрой».

Регистрация акционеров в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНП 600024712.

В ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ОБЪЕКТА ДЕЛОВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА,

опубликованной в газете «Звязда» № 53 от 21 марта 2009 г.

Объектами долевого строительства являются:

— 25 однокомнатных квартир площадью 39,85— 47,23 кв. м;
— 15 двухкомнатных квартир площадью 62,28—64,79 кв. м.

Информацию об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1. Тел.: 017 237 29 50, 237 29 51.

УНП 100794022.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«КОМПАНИЯ ИТЦ»

Адрес: г. Минск, ул. Гурского, 3б, т./факс: 256 20 04

УНП 101138948

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 г.

Наименование статьи	В миллионах белорусских рублей
ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ	
Основные средства	1415
Нематериальные активы	
ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ	
Запасы и затраты	1266
Налоги по приобретенным ценностям	0
Дебиторская задолженность	244
Денежные средства	46
Финансовые вложения	292
Прочие оборотные активы	702
БАЛАНС	3965
КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ	
Уставный фонд	1340
Добавочный фонд	908
Нераспределенная прибыль	18
Целевое финансирование	1
РАСЧЕТЫ	
Кредиты и займы	1200
Кредиторская задолженность	498
БАЛАНС	3965
ЧИСТЫЕ АКТИВЫ	2266

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	В миллионах белорусских рублей
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	7846
Налоги, включаемые в реализацию продукции	1204
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	5702
Управленческие расходы	3
Расходы на реализацию	565
Прибыль (убыток) от реализации	372
Прочие операционные доходы	2129
Прочие операционные расходы	2105
Внереализационные доходы	114
Внереализационные расходы	-11
Прибыль отчетного периода	521
Налог на прибыль и иные обязательные платежи	18
Прибыль к распределению	503
Данные отчетности подтверждены (наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)	Аудитор ИП Кулаженко Л.И. Лицензия № 02200/0060086

Кол-во акционеров	**Всего**	**20**	**Юридических лиц**	**2**	**Физических лиц** **18**

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	59,5	27,7
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	74	40
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	1,7	2
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	0	0
Информация о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	0	11
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	0	0
Среднесписочная численность работающих (человек)		70	
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг		**оптовая торговля, транспортные услуги, производство изделий из проволоки**	

Генеральный директор **Повидайко В.Н.**

Главный бухгалтер **Маркина С.В.**

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«БелОМО-СТРОЙ»

Адрес: 220141, г. Минск, пр. Независимости, д. 172, к. 309. Т/ф. 260 47 38.
Полное ф.и.о руководителя: Управляющая организация — ООО «Ванир» в лице директора Гелдера Аарона
Полное ф.и.о гл. бухгалтера: Организация, оказывающая услуги по ведению бухгалтерского учета и отчетности, — ООО «Ванир» в лице главного бухгалтера Сахно Натальи Владимировны

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 года млн. руб.

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	1	27
Нематериальные активы	120	1	—
Доходные вложения в материальные ценности	130	—	—
Вложения во внеоборотные активы	140	2456	2945
В том числе: незавершенное строительство	141	2456	2945
Прочие внеоборотные активы	150	—	—
ИТОГО по разделу I	190	2458	2972
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	67	276
В том числе: сырье, материалы и другие активы	211	52	61
животные на выращивании и откорме	212	—	—
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	—	—
расходы на реализацию	214	—	—
готовая продукция и товары для реализации	215	15	—
товары отгруженные	216	—	—
выполненные этапы по незавершенным работам	217	—	—
расходы будущих периодов	218	—	215
прочие запасы и затраты	219	—	—
Налоги по приобретенным активам	220	12	25
Дебиторская задолженность	230	11	76
В том числе: покупателей и заказчиков	231	11	75
поставщиков и подрядчиков	232	—	—
разных дебиторов	233	—	—
прочая дебиторская задолженность	234	—	1
Расчеты с учредителями	240	—	—
В том числе: по вкладам в уставный фонд	241	—	—
Прочие	242	—	—
Денежные средства	250	37	11
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	251	—	—
Финансовые вложения	260	—	—
Прочие оборотные активы	270	—	—
ИТОГО по подразделу II	**290**	**127**	**388**
БАЛАНС	**300**	**2585**	**3360**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	175	175
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	—	—
Резервный фонд	420	—	—
В том числе:			
резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	—	—
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422	—	—
Добавочный фонд	430	306	305
Прибыль (убыток) отчетного периода	440	—	—
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	-446	-498
Целевое финансирование	460	2249	2364
Доходы будущих периодов	470	—	—
ИТОГО по разделу III	490	**2284**	**2346**
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	—	737
Краткосрочные кредиты и займы	520	—	—
Кредиторская задолженность	530	301	277
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	531	—	—
перед покупателями и заказчиками	532	228	154
по оплате труда	533	4	9
по расчетам с персоналом	534	—	1
по налогам и сборам	535	11	1
по социальному страхованию и обеспечению	536	2	1
разных кредиторов	537	—	—
прочая кредиторская задолженность	538	56	111
Задолженность перед учредителями	540	—	—
В том числе: по выплате доходов, дивидендов	541	—	—
прочая	542	—	—
Резервы предстоящих расходов	550	—	—
Прочие виды обязательств	560	—	—
ИТОГО по разделу IV	590	**301**	**1014**
БАЛАНС	600	**2585**	**3360**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	101	516
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	17	31
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	020	84	485
Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	—	—
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	160	117
Управленческие расходы	040	—	—
Расходы на реализацию	050	—	—
Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)	060	-76	368
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	88	32
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071	15	5
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	73	27
В том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	081		
От выбытия основных средств и нематериальных активов	082	73	27
Прочие операционные доходы	083		
Операционные расходы	090	29	395
В том числе: от сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	091		
От выбытия основных средств и нематериальных активов	092	3	395
Прочие операционные расходы	093	26	—
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	100		
Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций	110		
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090±100±110)	120	44	-368
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130		
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131		
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140		
В том числе: от списания кредиторской задолженности	141		
Курсовые и суммовые разницы	142		
Безвозмездно полученные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи)	143		
Прочие внереализационные доходы	144		
Внереализационные расходы	150		
В том числе: от списания дебиторской задолженности	151		
Курсовые и суммовые разницы	152		
Безвозмездно переданные активы (включая денежные средства)	153		
Прочие внереализационные расходы	154		
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160		
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+120+160)	200	-32	
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210		
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	20	
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)	240	-53	
Справочно (из строки 240). Сумма льготы по налогу на прибыль			

Данные отчетности подтверждены (наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)	Якубовский Валерий Евгеньевич, лицензия № 02200/0416419 от 03.05.2008 г.

Кол-во акционеров	**Всего**	**42**	**В том числе:**	**Юридических лиц**	**1**	**Физических лиц**	**41**

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Миллионов рублей	—	—
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	Рублей		
Обеспеченность акции имуществом Общества	Тысяч рублей	-3	6
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	Штук	—	—
Информация о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	Миллионов рублей		
Просроченная кредиторская задолженность	Миллионов рублей		
Среднесписочная численность работающих (человек)		9	
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг		**Услуги технического надзора в строительстве**	

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полное наименование:

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ПОСТТОРГ»

Адрес: 220009, г. Минск, ул. Клумова, 3
Полное ф.и.о. руководителя: Смольский Сергей Александрович
Полное ф.и.о. гл. бухгалтера: Бурая Сильвия Григорьевна

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 года в млн. рублей

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	5103	5538
Нематериальные активы (04, 05)	120	10	12
Доходные вложения в материальные ценности (02, 03)	130	—	—
Вложения во внеоборотные активы	140	188	1390
В том числе незавершенное строительство	141	—	—
Прочие внеоборотные активы	150	—	—
ИТОГО по разделу I	**190**	**5301**	**6940**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	3300	4353
в том числе:			
сырье материалы и другие активы	211	549	698
животные на выращивании и откорме	212	—	—
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	—	—
расходы на реализацию	214	7	17
готовая продукция и для реализации	215	2667	3576
товары отгруженные	216	4	
выполненные этапы по незавершенным работам	217	—	—
расходы будущих периодов	218	73	62
прочие запасы и затраты	219	—	—
Налоги по приобретенным активам	220	566	808
Дебиторская задолженность	240	92	79
В том числе:			
покупателей и заказчиков	241		
поставщиков и подрядчиков	242	35	12
по расчетам с персоналом	244	7	12
разных дебиторов	245	50	24
Расчеты с учредителями	250	—	—
В том числе:			
по вкладам в уставный фонд	251		
Денежные средства	260	1527	760
В том числе:			
Денежные средства на депозитных счетах	261		
Финансовые вложения	270		
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**5485**	**6000**
БАЛАНС	**300**	**10786**	**12940**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	2230	1873
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	—	—
Резервный фонд	420	76	151
В том числе:			
резервы, созданные в соответствии с законодательством	422	76	151
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами		—	—
Добавочный фонд	430	2367	2931
Прибыль (убыток) отчетного периода	440	—	—
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток))	450	555	662
Целев

Антыкрызісная эканоміка

Знак якасці атрымалі ў Оксфардзе

Цяплічны камбінат «Бярэсце» пачынае будаўніцтва геатэрмальнай станцыі. Летась тут прабурылі паўтаракіламетровую свідравіну, якая дасягнула ваданосных слаёў тэмпературай ад 25 да 40 градусаў. З узвядзеннем станцыі ваду будуць выкарыстоўваць для ацяплення комплексу цяпліц. Падземныя цёплыя воды стануць дадатковай крыніцай энергіі для вырошчвання прадукцыі камбіната.

Сваімі поспехамі прадпрыемства ў многім абавязана менавіта еўрапейскай сістэме энергазберажэння, якая ўкаранялася тут гадамі. Таму брэсцкі цяплічны камбінат — у шэрагу перадавікоў сярод вытворцаў агуркоў і памідораў. Летась тут вырасцілі прадукцыі на 20 мільярдаў рублёў, прадалі за межы рэспублікі агародніны на два мільёны долараў. А сёлета на «Оксфарскім саміце лідараў» камбінат «Бярэсце» быў адзначаны оксфардскай узнагародай нароўні з лепшымі вытворцамі свету. Гэты асаблівы знак прысуджаецца па паказчыках якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Прадпрыемства-лаўрэат атрымоўвае права размяшчаць адпаведную сімволіку на дзелавой дакументацыі, этыкетках, упакоўцы прадукцыі, выкарыстоўваць у рэкламе сваёй дзейнасці. Так што хутка брэсцкія агуркі, памідоры, іншая агародніна будуць прадавацца з оксфардскім знакам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Зварот у карпункт

Парыжская канапа...

У віцебскі карпункт «Звязды» звярнулася па дапамогу жыхарка беларускага Парыжа (вёскі ў Пастаўскім раёне) Яніна Пятроўна. Яна спытала: што рабіць, куды паскардзіцца, каб урэшце прывезлі з рамонту канапу? Абяцалі адрамантаваць канапу ўсяго праз некалькі дзён, пра што і паведамлялася ў мясцовай газеце ў аб'яве. А ўжо ж трэці тыдзень пайшоў.

— Дачка мая знайшла тую аб'яву ў раёнцы. Патэлефанавала. Прыехалі па канапу. Узялі з яе аванс, а гэта 400 тысяч рублёў. Усяго ж за рамонт папрасілі 700 тысяч рублёў, — распавядае Яніна Пятроўна. — Прайшоў тэрмін выканання, але канапы ўсё няма. Тэлефаную дыспетчару, якая працуе на індывідуальнага прадпрымальніка, а яна нават назвацца не хоча. Маўляў, толькі заказы прымаю. А сама прадпрымальніца зарэгістравана зусім у іншай вобласці — у Мінскім райвыканкаме. А дыспетчар у Слуцку прымае заяўкі.

На жаль, дачка паважанай чытачкі не ўзяла ў тых, хто забіраў у рамонт канапу, нават распіску. Не кажучы ўжо пра дагавор, які, вядома ж, трэба было падпісаць заказчыку і прадстаўніку вызначаную прама дома. Што датычыцца рэдакцыі мясцовай газеты, безумоўна, паважаныя калегі не павінны адказваць за тэксты рэкламных аб'яў, калі яны не супярэчаць заканадаўству. Тым больш што, як і трэба, паводле слоў чытачкі, у тэксце аб'явы былі надрукаваны ўсе юрыдычныя «рэквізіты» прадпрымальніцы.

Па каментарый я звярнуўся ў Віцебскае гарадское таварыства па абароне правоў спажыўцоў.

— Так, сітуацыя ў гэтым канкрэтным выпадку няпростая. Без дакументальнага пацвярджэння, без сведак перадачы грошай і адпраўкі канапы ў рамонт цяжка нешта зрабіць. Але, безумоўна, мы можам паспрабаваць дапамагчы. Ёсць нядрэнны вопыт і абароны правоў спажыўцоў у судах, — кажа **намеснік старшыні таварыства па юрыдычных пытаннях Таццяна МІРОНАВА**. — Што датычыцца тэрмінаў выканання заказу, безумоўна, выканаўца павінен заказчыку выплаціць кампенсацыю за кожны пратэрмінаваны дзень. Адлік вядзецца з таго дня, калі абяцалі прывезці з рамонту тую ж канапу, але на той дзень гэтага не зрабілі.

У таварыстве паабяцалі, што ў любым выпадку пракансультуюць чытачку і пастараюцца ёй дапамагчы.

Калі артыкул рыхтаваўся да друку, я звязаўся з Янінай Пятроўнай. Яна сказала, што канапу паабяцалі сёння ўвечары прывезці. Сяджу чакаю яе званка. Ці прывезлі канапу? Раніцай на наступны дзень сазваніліся. Высветлілася, што ўсё-такі прывезлі канапу... увечары а дзясятай гадзіне. Ды, паводле слоў чытачкі, «падстрахаваліся» тыя, хто прывёз канапу: прывезлі дагавор, праўда, чамусьці толькі ў адным экзэмпляры.

— Дарэчы, у гэтай паперы ўжо было надрукавана, што тэрмін выканання 7 дзён, — распавядае Яніна Пятроўна. — Што здзівіла яшчэ — ні подпісу, ні штампу ніякага з боку выканаўцы не было. Надалей мы будзем больш уважлівымі, калі прыйдзецца заказваць нейкія паслугі.

Каментарый **эксперта Таццяны МІРОНАВАЙ**: «Гэтая жанчына мае права на 1 працэнт кампенсацыі ад кошту выкананых работ за кожны пратэрмінаваны дзень. Зразумела, трэба паглядзець уважліва дагавор, каб разабрацца ва ўсіх нюансах. Калі ў дагаворы напісана 7 дзён, а прайшло, як вы сказалі, больш за 14, ёсць падстава для выплаты кампенсацыі».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВЕСНАВЫ КАПЕЖ У ПАДЗЕМНЫМ ПЕРАХОДЗЕ

Сітуацыя

Калі сказаць шчыра, то тэма гэтага артыкула нарадзілася з людскіх абгавораў. Магіляўчане, якія ходзяць па новым падземным пераходзе на перакрыжаванні вуліцы Ленінскай і праспекта Міру, часта звяртаюць увагу на розныя хібы. Маўляў, будаўнікам плацяць добрыя грошы, а яны і за іх не могуць якасна зрабіць сваю працу.

Можа, выснова і спрэчная, аднак калі ўвесну са столі актыўна закапала вада, гэта стала нагодай ужо для каментара службовай асобы. Непасрэдна ў падземным пераходзе мы сустрэліся з **дырэктарам Магілёўскага гарадскога ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Генадзем ДЗЕНГАЛЁВЫМ**. Гэта прадпрыемства — генеральны заказчык будаўніцтва падземнага пераходу, і яго кіраўнік мае поўнае права ацаніць, наколькі паспяхова перазімаваў вядомы магілёўскі аб'ект.

Але спачатку яго гісторыя. Пераход, другі па кольнасці ва ўсім абласным цэнтры, пачалі будаваць летась. Гэты час у гісторыі Магілёва трапна назвалі «пераходным перыядам», бо будаўніцтва сапраўды закранула многіх. Былі перакрыты важныя гарадскія вуліцы, аб'езды ды абходы не радавалі гараджанаў. Улада заклікала трываць і мела рацыю: цяпер усе цяжкасці ды нязручнасці пазабываліся, пераход працуе, зніклі аўтамабільныя пробкі ў цэнтры горада.

Першая чарга здадзена ў леташнім снежні. Сучасны пераход, выкананы ў бардова-карычневабэжавых колерах, спадабаўся ўсім. Але найбольшы гонар выклікалі сціслыя тэрміны будаўніцтва: яны былі ўдвая меншыя за нарматыўныя. Прычым асабліва падкрэслівалася, што хуткасць — без урону для якасці. Цяпер, праўда, з'явіліся іншыя думкі на гэты конт.

Але пра ўсё па парадку. Пры ўваходзе ў падземны пераход з Генадзем Дзенгалёвым гаворым пра тое, што ён пабудаваны за бюджэтныя грошы, і немалыя. Першая чарга пераходу каштавала каля 10 мільярдаў рублёў, што па мінуламу годнім дадэвальвацыйным курсе перавышала 4,5 мільёна долараў.

Людзі, якія плацяць падаткі, хочуць быць упэўненымі, што іх не змарнавалі: эканомнае расходаванне бюджэтных сродкаў у цяперашніх крызісных варунках — справа дзяржаўнай важнасці. Гарадская ўлада хоча, каб дробныя будаўнічыя хібы не псавалі агульнае добрае ўражанне ад важнага і патрэбнага для абласнога цэнтра збудавання.

Аднак хібы відаць ужо на ўваходзе. На вышыні чалавечага росту разламаная плітка ў сцяне. Гэта, відавочна, праца вандалаў.

— Глядзіце, яшчэ чорныя надпісы на сценах, — заўважае Генадзь Іванавіч. — Людзі павінны памятаць, што яны — падаткаплацельшчыкі, частка іх грошай і тут, у падземным пераходзе. Калі чалавек псуе плітку — ён, лічы, разбурае і сваю ўласнасць.

Але ёсць і цалкам будаўнічыя хібы. На падлозе не хапае каменных плітак — месца накрытае драўляным паддонам, у некаторых месцах яны хістаюцца пад нагамі. Расколіны на сценах з'явіліся пры ўсталяванні ліфтаў для інвалідаў-калясачнікаў.

Аднак самая галоўная праблема — працяканне шва. Вада льецца па сценах, часам капае са столі. Шво, вядома, мае вялікі і складаны назоў, але для пешаходаў самае важнае (і ў гэтым мяне запэўнілі ўсе афіцыйныя асобы) — што працяканне не з'яўляецца небяспечным і што на трываласць канструкцыі пераходу гэта не ўплывае.

Аднак трэба ўсё паправіць. Каля падземнага пераходу падчас нашай экскурсіі з'явілася драўляная агародж, і будаўнікі сталі капаць. Гаварыць, што выпраўленне хібаў не створыць нязручнасцяў для людзей, аднак канкрэтныя тэрміны заканчэння ўсіх работ усё ж не называюць.

— Так, у нас ёсць прэтэнзіі да будаўнікоў, і мы іх ужо выказалі, — завяршае экскурсію па пераходзе і падводзіць вынікі зімоўкі Генадзь Дзенгалёў. — Трэба сказаць, што будаўнікі выканалі сваю працу не на 100 %, а толькі на 98. Усё гэта добра выяўляецца пасля халоднага сезона. У падрадчыка ёсць гарантыйныя абавязацельствы, і хібы будуць ліквідаваныя.

ААТ «Лаўсанбуд» — генеральны падрадчык гэтага будаўніцтва. Яго **дырэктар Анатоль ЧОРНЫ** пацвердзіў, што работы пачаліся, аднак віну за працёк шва не спяшаецца ўскладаць на сваіх падначаленых.

— Мы адкрыем яго, і тады будзе ясна, хто вінаваты, — сказаў у тэлефоннай размове Анатоль Барысавіч. — Што ж, высокая хуткасць будаўніцтву не заўсёды ідзе на карысць. Трэба было пускаць рух на перакрыжаванні, усё рабілі хутка, таму магчыма, што нехта недзе не дапрацаваў.

Будаўнікі ківаюць на праектантаў. Можа, гэта іх няўдалае рашэнне? **Дырэктар «Магілёўграмадзянпраекта» Міхаіл КРАСНОЎ** катэгарычна абвяргае такія намёкі.

— Праект рабіўся абдумана, не з наскоку, — заявіў Міхаіл Аляксеевіч. — Больш за тое, мы папярэджвалі будаўнікоў аб такім развіцці падзеяў, калі назіралі за якасцю работ. Увогуле пра сітуацыю скажу так: мы ўсе ведаем, колькі ўзнікае праблем, калі нараджаецца 7-месячнае дзіця. Падобнае і тут.

З гэтым катэгарычна не згодзен Генадзь Дзенгалёў:

— Хібы ўзніклі не ад сціслых тэрмінаў будаўніцтва. Яны скарачаліся не за кошт якасці. А мы змаглі так арганізаваць працу, каб хутчэй завяршыць будаўніцтва.

Хто вінаваты — гэта вырашаць спецыялістам. Для магіляўчан галоўнае, што ўсе зацікаўленыя бакі не лічаць хібы новага пераходу вялікай трагедыяй і ўпэўнены ў іх хуткім выпраўленні.

— Не памыляецца той, хто не працуе, — лічыць дырэктар упраўлення капітальнага будаўніцтва. — У любой працы ўзнікаюць недахопы, якія трэба выправіць і якіх трэба не дапусціць надалей.

Між тым, працягваецца ўвод другой чаргі пераходу. Хутка адчыніцца грамадская прыбіральня — з асаблівай антывандальнай тэхнікай, якая працуе на фотаэлементах і якую немагчыма сапсаваць.

Завяршаецца ўсталяванне празрыстых казыркоў над уваходамі. Пачынаецца і пашырэнне праезнай часткі ў раёне падземнага пераходу, каб надоўга забыцца пра аўтамабільныя пробкі.

Цяпер робіцца праект новага падземнага пераходу: паводле планаў, яго пабудуюць на ажыўленым перакрыжаванні каля гандлёвага цэнтра на праспекце Пушкіна. Гарадская ўлада імкнецца стварыць для гараджанаў лепшыя ўмовы пражывання, а магіляўчане спадзяюцца, што ўсё будзе зроблена з розумам.

Ілона ІВАНОВА.

УРОКІ АДМЕНЕНЫ НЕ БУДУЦЬ

У Буда-Кашалёўскай школе позна вечарам спрацавала пажарная сігналізацыя «Маланка». Пажарныя, якія прыбылі па аўтаматычным выкліку, убачылі задымлены першы паверх пачатковай школы. Высветлілася, што адбылося кароткае замыканне электраправодкі бытавога халадзільніка ў памяшканні склада, які яшчэ тлеў на момант прыбыцця супрацоўнікаў МНС. Акрамя таго, пашкоджаны персанальны камп'ютар і 2 швейныя машынкі. Вартаўнік падчас здарэння абыходзіў тэрыторыю і задымлення не ўбачыў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЧУЖЫЯ ДЗЕЦІ

Гэтыя дзеці дзіўным чынам прымушаюць мяне задумацца аб сэнсе жыцця. Калі я ў думках размаўляю з імі і тлумачу, навошта ім трэба працаваць, не піць, не звальняцца, купляць пасцельную бялізну, дэзадарант, памыць вокны... Праз паўгадзіны я лаўлю сябе на тым, што размаўляю сама з сабой. Што гэта я задаю пытанні сабе і правяраю: веру альбо не веру сваім адказам. За шаснаццаць гадоў я зразумела толькі адно — гэта не я ім была пасланая, а яны — мне. Каб лепей даведацца пра сябе, і яшчэ, напэўна, для нечага...

Шаснаццаць гадоў таму мне было столькі, колькі зараз аднаму з іх, назаву яго Дзянісам, — 22 гады. Гэтым, напэўна, усё тлумачыцца. Ну яшчэ часам. Асаблівасцямі нашага пакалення. Мы выраслі ў савецкія часы, але самы «пратэставы» ўзрост наш прыйшоўся на гады Перабудовы. Перыяд юнацкага максімалізму ў нас супаў з перыядам хістанняў у крайнасці самой краіны, з разбурэннем ідэалаў, якое мы віталі ў сілу сваёй маладосці. Як усе юныя душы ва ўсе часы мы востра адчувалі фальш, удушлівасць сістэмы. Мы пелі пра жаданне перамен, пра скаваных адным цэпам і пра сценку, якая нам перашкаджае жыць...

Я гэта да чаго. У час, калі ўсё рушыцца, чалавек падсвядома шукае апоры, а сіла самазахавання ў маладых — асабліва моцная. Такую апору мы шукалі ва ўласнай паслядоўнасці, у імкненні не хлусіць, не прытварацца. Ну гэта і ёсць, напэўна, юнацкі максімалізм. Цяпер я аналізую зробленыя тады ўчынкі і сумняваюся, ці былі яны насамрэч шчырыя і паслядоўныя. Цяпер я ведаю, што для сапраўды добрага ўчынку мала аднаго жадання.

Гэтыя дзеці ў маім жыцці — вынік памылкі маладосці. Я не скажу, што шкадую аб тым, што сустрэла іх, але нешта я зрабіла не так. Думка пра іх драпае душу, асабліва калі ўдаецца выйсці на шчырую размову з самой сабой.

Мы сустрэліся, калі мне было 22 гады. Дзянісу — пяць. Усё лета 1993 года ён з братамі пражыў у боксе гарадской інфекцыйнай бальніцы, пакуль дзяржаўныя чыноўнікі аднаўлялі іх дакументы. Прытулкаў тады яшчэ не было. Восенню я стала забіраць іх з дзіцячага дома па чарзе на выхадныя дні дамоў.

Чаму я гэта рабіла? Я не зведвала ні сімпатыі, ні прывязанасці, ні, нават, жалю. Мне проста здавалася, што так будзе больш правільна і больш шчыра. Дырэктарка дзіцячага дома ўпэўнівала, што для дзяцей — гэта вельмі карысна, яны хаця б часова бачаць нармальную сям'ю, атрымліваюць неабходную інфармацыю пра многія жыццёвыя рэчы і г.д.

Цяпер я думаю, што ўсё нашмат больш складана і драматычна. Я памятаю, як вяла дамоў аднаго з іх. Я глядзела на яго, і ўнутры ў мяне халадзела: настолькі яно было чужое. Гэта было дзіця зусім іншага, варожага для мяне сацыяльнага слоя. Яно інакш рухалася, інакш выглядала, яго цікавілі іншыя рэчы... Яно было падобна на зменшаную копію чалавека, якога, сустрэўшы на вуліцы, я пастаралася б пазбегнуць. Але я казала сабе: «Гэта ўсяго толькі дзіця» і саджала яго за стол ляпіць пельмені, чытала яму казку пра доктара «Айбаліта» і з сумам глядзела ў спіну мужу, які імкнуўся на гэты час сысці з дому.

Але самае страшнае тое, што я тады і яшчэ шмат гадоў пасля не ведала, што гэтыя дзеці чакалі, што я іх забяру з дзіцячага дома назаўсёды. У мяне настолькі не было нічога падобнага ў думках, што я не адчувала перад імі віны. Я ім не абяцала. Але яны — спадзяваліся і былі падманутыя.

Адзін з іх мяне амаль не памятае, настолькі быў малы. Другі — ненавідзіць. А Дзяніс прыходзіць пасля некалькіх дзён голаду. Ён атрымаў запатрабаваную рабочую прафесію. На працягу апошняга года працаваў у трох арганізацыях, у кожнай — па два месяцы. Першы месяц усё было нармальна, пасля атрымання зарплаты ён закупляў прадукты, а на астатнія грошы, спачатку — піва, потым — гарэлку... На другі месяц яму прапаноўвалі звольніцца «па згодзе бакоў». Аднойчы звольнілі «па артыкуле». Месяцы два пасля звальнення ён жыў тым, што даядаў закупленыя прадукты: грэчку, рыс, макарону, бульбу. Потым галадаў. Потым ішоў да мяне, прасіў грошы на праходжанне медкамісіі, зноў уладкоўваўся, і ўсё паўтаралася. Часам ён прыходзіць у царкву, капае градкі альбо прыбірае будаўнічае смецце, там яго падкормліваюць. Так ён пражыў апошні год. За камунальныя паслугі завінаваціўся. Павінен мне, царкоўнаму прыходу і яшчэ некалькім чалавекам. Пажарнікі яго аштрафавалі за тое, што заснуў п'яны і не выключыў каструлю на электраплітцы ў сваім пакоі. Штраф ён не выплаціў, і цяпер яму пагражае «хімія». Тыдзень таму я запрасіла яго пажыць у мяне, часова.

Мне цяжка патлумачыць — чаму. І на што я спадзяюся. Проста аказалася невыносна — назіраць, як гінуць гэтыя дзеці. З усіх братоў я кантактую толькі з Дзянісам. Таму што прыходзіць, калі даходзіць да краю. Калі б не прыходзіў, мне было б лягчэй. Я б не бачыла і не ведала. Прапаў бы і ўсё. Калісьці, магчыма, так і здарыцца. Бо наіўна спадзявацца, што запрасіўшы яго, 22-гадовага хлопца, пажыць у сям'ю, я змагу яго ўпэўніць у тым, што ёсць сэнс не піць, працаваць, зарабляць грошы, абстаўляць кватэру, штодня мыцца...

У яго адзін камплект пасцельнай бялізны. Адзін ручнік. Адна пара абутку — зімовыя чаравікі, без вусцілак і, здаецца, часткова без падэшвы. Адна футболка. Шкарпэткі — адны, шарсцяныя, прыйшлося мыць іх двойчы, каб пазбавіцца непрыемнага паху ў кватэры.

Ён пагадзіўся застацца ў мяне з задавальненнем. Хоць у першы дзень моцна ўздрыгваў, калі я заходзіла ў пакой, дзе ён знаходзіўся. Неяк, затрымаўшыся на працы, папрасіла яго зварыць бульбу ў шалупінні, ён зварыў, але не памыў — не ведаў, што трэба. Елі такую, у земляных разводах, бо часу гатаваць нешта іншае не было.

На выхадныя ўзяла яго ў вёску, ускапаў там сотку зямлі. Суседка прыйшла спытаць, што за хлопец такі людскі... Кажу: «Сірата. Адпрацоўвае кавалак хлеба». А на тое, што людскі, паціскала плячыма. Не ведаю, што падумала пра мяне суседка. Ды мне і не важна. Столькі горычы звязана з гэтымі дзецьмі, што ўжо не хочацца ні хавацца, ні тлумачыць.

На самай справе, ён — людскі. Ён добры. У яго ёсць сэрца. Але ў яго настолькі многага няма, што страшна робіцца. Мой сын сказаў: «Я яго баюся, бо не магу зразумець, чым ён жыве і чаго жадае». Я думаю, што ён нічым не жыве і нічога не жадае. Пустата адчуваецца ў ім. Добрае сэрца ў пустэчы душы, якая не ведае радасці.

Уладкаваўся на працу. Трэці дзень працуе. Пасля працы прыходзіць стомлены, разам садзімся за стол, вячэраем, п'ём чай, размаўляем. Ён расказвае пра напарніка, пра брыгадзіра, пра тое, як рэзаў арматуру, як падрапаў нагу, як ледзь не пераклуў на сябе бетонны слуп...

Мне прыходзіцца больш гатаваць ежы. Менш часу застаецца на ўласных дзяцей. Муж кажа: «Не прывучай яго, а то прыйдзецца потым выстаўляць як бяздомную жывёлу за дзверы. Карысці ўсё роўна не будзе. Усё роўна яму з намі не жыць, а калі вернецца ў сваё асяроддзе, зноў пачне піць». Я не спрачаюся. Сваёй сяброўцы паспрабавала патлумачыць: «Можа ён хоць трошкі прывыкне да нармальнага жыцця, і яму не захочацца вяртацца ў бруд?». Аднак потым выходзіла з метро і думала: «Людзі, якія выраслі ў добрых сем'ях, спяваюцца і не знаходзяць сіл выкараскацца. А ты хочаш каб, гэты чалавек, ужо не дзіця, які нічога добрага не бачыў за ўсё сваё жыццё, пажыўшы ў цябе некаторы час, раптам змяніўся, стаў жыць інакш...». Смешна. І горка ад бяссілля.

Ён — адзін з соцень тысяч. Усе гэтыя дзеці, амаль усе, асуджаны на бязрадаснае жыццё, адзіноту, пакуты і раннюю агідную смерць. Бо не ведаюць, дзеля чаго ім жыць і як. У Дзяніса было, напэўна, каля дзясятка сотавых тэлефонаў. Зараз няма ніводнага. Ён чатыры разы губляў пашпарт. Ён страчвае ўсё, што набывае: плэеры, музычныя цэнтры, курткі... Нешта закладае ў ламбард, нешта дорыць, нешта псуе, нешта выкідае. Ён браў некалькі крэдытаў на мэблю, але дагэтуль спіць на падлозе. Ён марыў пра двухспальны ложак, і нават купіў яго, але потым прадаў, і быў час, калі ён жыў у пад'ездзе як бомж.

У яго ёсць асобны пакой, пусты халадзільнік і кошка. Кошка часам пакутуе ад недахопу ежы і адсутнасці вады. Думаю, ёй не соладка з такім гаспадаром, і наўрад ці яна доўга пражыве. Гэта трэцяя жывёла, якую ён прынёс у свой дом, лёс першых двух сумны.

У думках я вяртаюся ў 1993 год і пытаю сабе: «Можа больш правільна, паслядоўна і шчыра было б не браць гэтых дзяцей на выхадныя дні? Каб не даваць ім надзею тады, каб не губляць свой спакой цяпер. Альбо ўсынаўляць, ісці да канца, альбо нават не глядзець, не бачыць, не ведаць»...

Іх дзясяткі тысяч, а калі падлічыць тых, што выраслі, — сотні. Сотні тысяч душ, выпаленых болем і неапраўданымі дзіцячымі надзеямі. Ачарсцвелых і знявечаных. Не заўважаць іх — наўрад ці магчыма. І немагчыма не несці адказнасці за такую бездань адзіноцтва і самых розных яе наступстваў, да жорсткасці і злачынстваў. Так, не мы нараджалі, не мы спілося, не мы кінулі, але мы — жылі побач і... былі шчаслівыя.

Я пішу гэты матэрыял, каб даць імя сваёй трывозе. Каб уголас прамовіць свае сумненні. Каб спытаць людзей: «Вы жывяце больш спакойна, таму што ніколі не запрасілі ніводнага з гэтых дзяцей у свой дом?» Здзейсніўшы ўчынак, бяздумны, у маладыя свае гады, я пазбаўлена магчымасці ведаць адказ. Даруйце...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Класны стыль

ВЫДАТНЫ ВЫГЛЯД — ВЫДАТНАЯ ВУЧОБА

Ці абавязкова адзенне дзелавога стылю для школьнікаў павінна выглядаць сумна і змрочна? Як спалучыць строгі школьны стыль з сучаснай моладзевай модай? І чым увогуле можна зацікавіць прыдзірлівых падлеткаў? Адказы на гэтыя пытанні ўжо не першы год шукаюць і члены Каардынацыйнага савета па ўкараненні адзення дзелавога стылю, і медыкі, якія пільна сочаць за складам тканін, з якіх шыецца штодзённае школьнае адзенне, і мадэльеры прадпрыемстваў канцэрна "Беллегпрам". Летась у гандлёвых арганізацыях можна было знайсці больш як 200 мадэляў адзення для дзяўчатак, 170 мадэляў адзення для хлопчыкаў і 115 мадэляў абутку. Але і гэты, здавалася б, надзвычай разнастайны асартымент не змог задаволіць многія сем'і.

Днямі ў рамках міжнароднай выставы-кірмашу "БелТЭКСлегпрам" прайшоў пашыраны паказ новай калекцыі школьнага адзення, якую ўжо праз некалькі месяцаў можна будзе пабачыць на шматлікіх школьных кірмашах. Многае з прадстаўленага на ўсеагульнае меркаванне парадавала вока, праўда, не заўсёды меркаванне запрошаных на паказ школьнікаў і іх бацькоў супадала з меркаваннем членаў Каардынацыйнага савета. Але аб усім па парадку. Што збіраюцца прапанаваць сёлета вытворцы для хлопчыкаў? Адна толькі "Славянка" падрыхтавала для юных джэнтэльменаў 45 (!) мадэляў

касцюмаў на любы густ і кашалёк: касцюмы эканом-класа, бізнэс-класа і прэміум–класа. У калекцыі "Камінтэрна" "Джуніёр-класік" пераважаюць аднабортныя пінжакі, а іскрынкай калекцыі 2009 года можна лічыць мадэлі пінжакоў для падлеткаў са зручнай унутранай кішэняй для мабільнага тэлефона, пашытай з выкарыстаннем матэрыялаў, якія абараняюць дзіцячы арганізм ад шкоднага электрамагнітнага выпраменьвання. Швейная фабрыка "Бараўчанка" збіраецца зацікавіць пакупнікоў касцюмамі-тройкамі з сучаснымі лініямі крою, якія дазваляюць адчуваць сябе камфортна не толькі падчас вучобы, але і ў нефармальнай абстаноўцы. А фаварытам дзелавога стылю адзення для хлопчыкаў, можна смела сцвярджаць, застаюцца камізэлькі, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў адзенні як для самых маленькіх школьнікаў, так і для старшакласнікаў, прычым абсалютна ўсімі прадпрыемствамі. Парадавалі стваральнікі калекцый разнастайнасцю афармлення лацканаў, кішэняў і шліц. Былі прадстаўлены і касцюмы са светлых тканін, прызначаныя для нашэння ў цёплы час года.

Як зазначыў пасля прагляду калекцый усіх прадпрыемстваў намеснік міністра адукацыі Казімір Фарына, які ўзначальвае Каардынацыйны савет, бацькі змогуць без праблем сабраць хлопчыка ў школу. Вельмі добра папрацавалі для хлопчыкаў і швейныя, і абутковыя прадпрыемствы. А вось з апрананнем дзяўчатак-падлеткаў такія праблемы могуць узнікнуць. Справа ў тым, што кожная дзяўчына хоча быць адначасова і індывідуальнай, і яркай. Але як пры гэтым не выйсці за рамкі строгага стылю? ААТ "Элема" прапанавала калекцыю для дзяўчат старшай школьнай групы, якая складаецца з чатырох жакетаў, двух спадніц, штаноў і трох сукенак. Усе яны ўзаемазамяняльныя паміж сабой і любы з жакетаў прылеглага сілуэта можна насіць і са спадніцамі да калена, і з класічнымі штанамі. Калекцыю дапаўняюць элегантныя аднатонныя і эфектныя клятчатыя сукенкі. Дамінантным колерам ў калекцыі з'яўляецца чорны, як базавы класічны колер для адзення дзелавога стылю, але яго гарманічна дапаўняюць варыяцыі чорна-белага і адценні руж овага, якія з'яўляюцца цудоўным акцэнтам. Вось толькі ці пагодзяцца члена каардынацыйнага савета са смелымі каляровымі рашэннямі і сучаснымі мадэлямі ад "Элемы"?

У дзявочай калекцыі ЗАТ "Вяснянка" таксама выкарыстаны як мяккія натуральныя карычневыя і зялёныя адценні, так і двухкаляровая і шматкаляровая клетка – ад кансерватыўнай да прагрэсіўнай. Увогуле дзявочыя касцюмы, пашытыя з тканін-кампан'ёнаў выглядаюць адначасова і элегантна, і ярка, не выходзячы за рамкі дзелавога стылю, а камплекты, у якія ўваходзяць адразу некалькі адзінак адзення, страхуюць ад аднастайнасці ў адзенні і дазваляюць дзяўчатам карэкціраваць штодня свой дзелавы вобраз.

"Славянка" таксама актыўна выкарыстоўвае капсульны падыход ва ўсіх сваіх 40 мадэлях. Асаблівай увагі заслугоўваюць сарафаны для дзяўчатак малодшай школьнай групы, якія выпускаюцца з сумачкамі для сотавага тэлефона з тканін, што абараняюць ад электрамагнітнага выпраменьвання. Мінскае вытворчае прадпрыемства ААТ "Камволь"— адно з буйнейшых у СНД па выпуску тканін з утрыманнем шэрсці — вырашыла аб'явіць вайну сінтэтыцы і сумесна з дызайнерамі стварыць якаснае і стыльнае адзенне для школьнікаў. У калекцыю ўвайшлі 15 мадэляў для дзяўчат і пяць хлапчуковых мадэляў. Была пастаўлена задача даказаць, што адзенне з беларускіх тканін з утрыманнем шэрсці можа быць не толькі якасным, але і стыльным. У апошні час прадпрыемству ўдалося налепшыць уласцівасці выпускаемых тканін: зараз яны праходзяць праз новую тэхналогію механічнага змякчэння, да таго ж для іх прымяняюцца і спецыяльныя прапіткі, дзякуючы якім тканіны практычна не камечацца. У калекцыю ўвайшлі 15 мадэляў для дзяўчат і 5 хлапчуковых мадэляў. Многія з іх будуць мець некалькі каляровых варыянтаў.

Па словах Казіміра Фарына, прыкладна 60 працэнтаў з убачанага будзе Каардынацыйным саветам адобрана. За штосьці рублём прагаласуюць пакупнікі, бо на дэманстрацыі прысутнічалі і гандлёвыя арганізацыі, якія адбіралі мадэлі для афармлення заказаў на пашыў. Па традыцыі ў самы бліжэйшы час паказы школьнага адзення дзелавога стылю пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Крымінал

Стрэл з 1997-га

Тады ў маі позна вечарам на вуліцы Сурганава ў Мінску невядомы нанёс агнястрэльнае раненне 35-гадоваму сталічнаму жыхару і знік з месца здарэння.

Раскрыць гэтае злачынства беларускім праваахоўнікам удалося амаль праз 12 гадоў пасля ўчынення. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, супрацоўнікі міліцыі затрымалі на днях падазронага, які з мэтай наўмыснага забойства з пісталета «ERMA EP-882» сістэмы «Вальтэр» калібра 5,6 мм параніў тады 35-гадовага мінчаніна ў плячо: апошні, дарэчы, пацярпеў з-за таго, што спрабаваў спыніць хулігана. Генпракуратурай у дачыненні да затрыманага 43-гадовага спецыяліста аднаго з прадпрыемстваў узбуджана крымінальная справа. Падазроны зараз знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання, у яго канфіскаваная зброя. Між іншым, фігурант гэтай справы быў раней судзімы за спробу дачы хабару.

Ігар ГРЫШЫН.

GENERALI Insurance

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ИСЗАО «ГЕНЕРАЛИ» за 2008 год

млн. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	454,9	Источники собственных средств — всего	4443
Нематериальные активы	4,8	В том числе:	
Финансовые вложения — всего	3399,8	уставный фонд	3166,8
В том числе:		резервный фонд	149,5
инвестиции в дочерние общества	—	добавочный фонд	0,1
инвестиции в другие организации	—	фонд накопления	456,7
облигации и другие долговые обязательства	—	фонд потребления	—
прочие финансовые вложения	3399,8	целевое финансирование	—
Доля перестраховщиков в страховых резервах	—	нераспределенная прибыль прошлых лет	—
Дебиторы — всего	99,2	нераспределенная прибыль отчетного года	669,9
В том числе:		Страховые резервы и фонды — всего	139,4
дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	—	В том числе:	
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	—	страховые резервы	137,1
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	99,2	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	2,3
Прочие активы — всего	730	гарантийные фонды	—
В том числе:		Кредиторы — всего	106,3
незавершенное строительство	—	В том числе:	
материальные ценности и затраты	70,8	кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	12
денежные средства	279,5	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	—
собственные акции (доли)	—	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	—
прочие активы	379,7	заемные средства	—
Непокрытые убытки прошлых лет	—	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	94,3
Непокрытые убытки отчетного года	—	Прочие пассивы	—
БАЛАНС	**4688,7**	**БАЛАНС**	**4688,7**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ИСЗАО «ГЕНЕРАЛИ» за 2008 год

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	—
Страховые выплаты	020	—
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	—
Отчисления в гарантийный фонд	040	—
Расходы на ведение дела	041	—
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	—
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	154,8
Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -)	067	-130,2
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование	082	—
Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -)	092	-6,9
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	—
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	—
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	2,3
Расходы на ведение дела	120	80,2
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	—
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, прин

Краіна здароўя

Выпуск № 14 (128)

КАБ НЕ САПСАВАЦЬ СУСТРЭЧУ СА ШКОЛАЙ...

Прафілактычная акцыя «Ці гатова ваша дзіця да школы?» пройдзе ў Мінску з 13 па 19 красавіка.

— Мэта акцыі — павысіць інфармаванасць бацькоў у галіне медыцынскіх і псіхалагічных ведаў і папярэдзіць школьную дэзадаптацыю і неўратызацыю дзяцей, — паведаміла журналісту «Звязды» намеснік галоўнага ўрача Гарадскога клінічнага дзіцячага псіханеўралагічнага дыспансэра Святлана МАРОЗ. — Першы раз падобная акцыя прайшла ў сталіцы год назад і прыцягнула ўвагу 1,5 тысячы сем'яў. Высветлілася, што больш за палову пракансультаваных дзяцей псіхалагічна не былі падрыхтаваны да навучання ў школе.

Спецыялісты папярэджваюць, што меркаваць аб гатоўнасці дзіцяці да школы толькі па яго ўменні чытаць і пісаць — сур'ёзная памылка. Для будучага першакласніка куды больш важна ўмець пераказваць тэкст, абагульняць, параўноўваць і лагічна разважаць. Гатоўнасць нервовай сістэмы ўспрымаць вучэбны матэрыял, здольнасць дзіцяці канцэнтраваць увагу, парушэнні ў каардынацыі рухаў, цяжкасці з вымаўленнем, праблемы з запамінаннем — усё гэта павінна стаць прадметам вывучэння, а, магчыма, і карэкцыі для каманды спецыялістаў: псіханеўролагаў, псіхолагаў, лагапедаў... Спецыялісты звяртаюць увагу таксама і на сацыяльную гатоўнасць дзіцяці да навучання — пад ёй трэба разумець патрэбу ў зносінах з іншымі, настрой на працу і супрацоўніцтва, пэўную самастойнасць. Магчыма, камусьці з дзяцей лепш на год адкласці знаёмства са школай, каб не мець сур'ёзных праблем у будучыні.

Медыкі неаднаразова пераконваліся ў тым, што бацькі неаб'ектыўна ацэньваюць паводзіны сваіх дзяцей і ўпарта не жадаюць бачыць наяўную праблему. А рэкамендацыю ўчастковага педыятра пракансультавацца ў псіханеўралагічным дыспансэры некаторыя сем'і ўспрымаюць увогуле як абразу. Прыём псіхолагаў і псіхатэрапеўтаў будзе арганізаваны на базе гарадскіх дзіцячых паліклінік № 3, 7, 8, 10, 11, 13, 15 і 17, а таксама на базе псіханеўралагічнага дыспансэра ў Кунцаўшчыне. Ва ўсіх установах ужо вядзецца запіс на прыём да спецыялістаў, якія пратэсціруюць дзіця на яго гатоўнасць да школы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

Доктар адкажа

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (017) 222 70 80 плануюць:

13 красавіка — галоўны ўрач інфекцыйнай клінічнай бальніцы г. Мінска Мікалай Мікалаевіч ЮРОЎСКІ.

14 красавіка — галоўны ўрач Мінскага гарадскога скурна-венералагічнага дыспансэра Юрый Уладзіміравіч САЛУК.

15 красавіка — галоўны ўрач Мінскага гарадскога процітуберкулёзнага дыспансэра № 1 Міхаіл Міхайлавіч МЯРЗЛОЎ.

16 красавіка — галоўны спецыяліст аддзела ліцэнзавання Міністэрства аховы здароўя Андрэй Мікалаевіч КАМІНСКІ.

17 красавіка — дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін Усцінавіч ВІЛЬЧУК.

У графіку магчымыя змяненні.

Навука догляду хворага

У Мінску распачаліся ўнікальныя адукацыйныя курсы «Догляд дома». Іх мэта — павышэнне кваліфікацыі валанцёраў і супрацоўнікаў, якія даглядаюць інвалідаў і пажылых людзей.

Праект ажыццяўляецца аб'яднаннем «Сацыяльная служба міру і ўзаемаразумення паміж народамі» (Германія) і прыходам праваслаўнага храма абраза Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць». Фінансуе праграму федэральны фонд «Памяць. Адказнасць. Будучыня». (Германія).

У праекце ўжо ўзялі ўдзел больш за 50 чалавек. Гэта прадстаўнікі праваслаўных сястрыцтваў, валанцёры, студэнты, медыцынскія і сацыяльныя работнікі, кіраўнікі медыцынскіх устаноў і грамадскіх аб'яднанняў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пераварочваць слабага чалавека лягчэй, калі спачатку яму сагнуць нагу.

— Такіх ведаў не атрымаеш больш нідзе, — кажа сястра міласэрнасці Галіна. — Больш за пяць гадоў я працую ў рэабілітацыйным цэнтры пры Доме міласэрнасці, дзе знаходзяцца на рэабілітацыі хворыя з такімі праблемамі, як пералом шыйкі сцягна, інсульт. На жаль, літаратуры, якая дапамагла б на адпаведным узроўні аказваць ім дапамогу, я не знайшла. Многаму навучылася інтуітыўна. А тут нам прадэманстравалі, як гэта павінна рабіцца прафесійна. І, што вельмі важна, як, даглядаючы ляжачага чалавека, захаваць уласнае здароўе. Першае, што сказала выкладчык на курсах: «Вы павінны быць гатовыя да работы і цяпер, і праз пяць гадоў». Яна навучыла нас знімаць нагрузку са сваіх рук і плячэй. Яшчэ расказала, як наш настрой уплывае на хворага, як мы можам перадаць зарад аптымізму чалавеку, якога даглядаем.

Сітуацыя, калі сваякі не ведаюць, што рабіць з нямоглым чалавекам, не рэдкая. Людзі часам баяцца нават дакрануцца да яго, каб не нашкодзіць...

Выкладчык курсаў — **Габрыэла РОТГЕР, кіраўнік службы па доглядзе хворых цэнтра CURANUM** у нямецкім горадзе Аўгсбурга. Тэмы яе заняткаў самыя розныя: ад вядзення дакументацыі і базавага догляду хворага, кінестэтыкі і прафілактыкі пралежняў, прэласцяў, апрацоўкі ранаў да асаблівасцяў догляду пры інсульце, рассеяным склерозе, цукровым дыябеце і іншых хваробах і станах чалавека. Цэнтр, якім кіруе спадарыня Габрыэла, займаецца дапамогай пажылым людзям (некаторыя з іх жывуць у гэтым цэнтры), кансультуе сем'і, якія даглядаюць хворага сваяка. У CURANUM праходзяць практыку будучыя медыкі.

— Заняткі ў Беларусі я падзяліла на два этапы, — кажа спадарыня Габрыэла. — Спачатку я дала «сыры матэрыял»: тэорыю і практычныя навыкі. Другі этап пройдзе ў Мінску з 10 па 21 чэрвеня. Тады мы наведаем хворых, якіх даглядаюць слухачы курсаў. Я ўбачу, што з пачутага яны ўзялі «на ўзбраенне», якія веды ім не спатрэбіліся і чаго ім не хапіла.

Габрыэла кажа, што для яе самае важнае, каб чалавечая годнасць не была затаптаная хваробай. Нават калі чалавек ляжачы, нават калі памірае, у першую чаргу ён — асоба. Менавіта гэтую думку яна старацца данесці да тых, хто прыйшоў на яе лекцыі.

У Германіі служба догляду дома строга рэгламентаваная. Такімі хворымі займаюцца прафесійныя службы, дзе працуюць супрацоўнікі з адпаведнай адукацыяй. Навучанне спецыяліста доўжыцца не менш за тры гады. Людзі без адукацыі, нават калі гэта валанцёры, не маюць права займацца такой справай. Для сваякоў хворага чалавека наладжаны спецыяльныя курсы. Але, як правіла, нават калі за ляжачым даглядаюць блізкія, яны дадаткова наймаюць яшчэ і прафесіянала. У акрузе горада Аўгсбург прафесійных службаў догляду дома больш за 30. Кожная абслугоўвае ад 50 да 150 кліентаў.

— На жаль, у Беларусі не склалася практыка прафесійнага догляду, — кажа **каардынатар праекта «Догляд дома» па Беларусі сястра Ксенія ЗАБАШТАНСКАЯ**. — У нас даволі добрае медыцынскае абслугоўванне, але калі чалавек з інсультам ці рассеяным склерозам трапляе дадому, догляд яго кладзецца на плечы сваякоў. Тыя часта не ведаюць, што рабіць. Іх няправільныя паводзіны могуць ускладніць хваробу. Гэта вымотвае самі сваякоў, акрамя таго, чалавек, які даглядае хворага няправільна, можа сам сабе нашкодзіць. Напрыклад, у яго праз пару гадоў узнікаюць праблемы з пазваночнікам. На жаль, правільнаму догляду не вучаць ні ў вучылішчах, ні ў інстытутах. Таму гэтыя курсы вельмі запатрабаваныя.

Марына ЛЯВОШКА.

РАСЦІ, РУКАЛА!

Інфарм-укол

Рукала — аднагадовая расліна сямейства крыжацветных мае вышыню да 60 см. Утрымлівае алкалоіды і флаваноіды, якія забяспечваюць расліне яркі смак і водар. Валодае мачагонным, лактагенным, антыбактэрыяльным дзеяннем, стымулюе работу страўнікава-кішачнага тракта. Гэта расліна — з вялікай гісторыяй: у Старажытным Рыме яе ўжывалі як прыправу, а цяпер шырока выкарыстоўваюць у кухні краін Міжземнамор'я. Напрыклад, у Італіі лісце рукалы дадаюць у салаты, стравы з пасты, піцу, рызота. Рукала можа выкарыстоўвацца замест базіліка, паколькі мае ярка выражаны водар і востры гарчычна-арэхавы прысмак. Расліна гэта не патрабавальная, яе лёгка можна вырасціць з насення ў гаршку на падваконні ці на дачы. Высаджваць на падваконні можна з сакавіка, а ў адкрытую глебу — з сярэдзіны красавіка. Неабходна прытрымлівацца адлегласці паміж раслінамі ў радзе 8-10 см, паміж радамі — 30-40 см. Рукалу неабходна паліваць праз дзень, ніякага іншага догляду не патрабуецца. Па меры росту водар расліны ўзмацняецца. Рукала хутка паглынае нітраты, таму злоўжываць угнаеннямі не варта. Насенне рукалы прадаецца пад некалькімі назвамі: індаў, эрука салатная, эрука лясная, ракет-салата, аругула. Насенне знаходзіцца ў прадаўгаватых стручках.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Транспланталогія

НЫРКІ ДЗЕЦЯМ АДДАЛІ БАЦЬКІ

У Рэспубліканскім цэнтры дзіцячай уралогіі і нефралогіі паспяхова праведзены першыя аперацыі па трансплантацыі ныркі ад донараў-сваякоў двум дзецям — з Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці і Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці.

Асаблівасцю сваяцкай трансплантацыі ў гэтым выпадку лічыцца найбольшая працягласць жыцця такога донарскага органа — 17-20 гадоў. Перасадка ж дзіцячага ці трупнага органа не з'яўляецца пераважнай для няпоўнагадовых рэцыпіентаў, паколькі такі трансплантат «працуе» менш. Неадпаведнасць жа памераў дарослага органа ў дзіцячым арганізме вырашаецца з дапамогай спецыяльных тэхнічных методык, якія дазваляюць дабіцца таго, каб і нырка, і суседнія органы адчувалі сябе добра.

Донарам для першай перасадкі ныркі стаў 48-гадовы тата. Яго 11-гадовы сын пакутаваў ад рэдкага прыроджанага захворвання. Да 5 гадоў дзіця расло і развівалася як здаровае, аднак потым з'явіліся скаргі, якія запатрабавалі далейшага абследавання, правядзення біяпсіі нырак. Апошняя паказала наяўнасць ныркавага захворвання, якое не мае спецыялізаванага лячэння. Па меры развіцця гэтага стану, літаральна праз два гады, наступіла смерць органа, — функцыя нырак была страчана незваротна. Для працягнення жыцця хлопчыку было прызначана лячэнне — перытаніяльны гемадыяліз, дзякуючы якому ён і жыў апошнія тры гады. Дарэчы, дзіцячы гемадыяліз — марудная шматгадзінная працэдура, якая можа выконвацца ў стацыянары ці дома для забеспячэння жыццядзейнасці арганізма, — укаранілася ў нас у 1997-м. Да гэтага моманту магчымасцяў падоўжыць жыццё дзецям з хранічнай ныркавай недастатковасцю не было.

Другі, 10-гадовы, хлопчык пакутаваў ад прыроджанай анамаліі мачавых шляхоў. Захворванне было выяўлена фактычна з моманту нараджэння, першыя праблемы пачаліся на шосты дзень пасля з'яўлення на свет. Уролагам давялося зрабіць некалькі складаных рэканструктыўных аперацый, каб працягнуць функцыянаванне анамальных нырак. Аднак да 5-гадовага ўзросту дзіця ўжо мела патрэбу ў ныркавай замяшчальнай тэрапіі і атрымлівала лячэнне перытаніяльным дыялізам на працягу апошніх трох гадоў. У гэтым выпадку ідэальным, ці кажучы мовай медыкаў, аптымальна сумяшчальным з ліку сваякоў, донарам стала 28-гадовая маці.

— Стан усіх чатырох пацыентаў зараз стабільны, адпавядае цяжкасці перанесеных аперацый, — кажа галоўны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па нефралогіі і ныркавай замяшчальнай тэрапіі, урач-трансплантолаг Алег КАЛАЧЫК. — Донары хутка ўбачаць сваіх дзяцей... Ныркавыя трансплантаты працуюць добра, выконваюць усе свае функцыі. Толькі за першыя 12 гадзін пасля аперацыі яны выдзелілі каля 6 літраў мачы кожны, што дазволіла нармалізаваць асноўныя паказчыкі аналізаў крыві і мачы яшчэ ў раннім пасляаперацыйным перыядзе...

Донарскія аперацыі выконваліся на базе Рэспубліканскага цэнтра нефралогіі 4-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, пасля чаго ныркі былі спецыяльным чынам кансерваваныя і перавезеныя ў 2-ю дзіцячую клінічную бальніцу, дзе размяшчаецца Рэспубліканскі цэнтр дзіцячай нефралогіі і ўралогіі. Увесь цыкл аператыўных умяшанняў — ад пачатку забору органаў да пераводу пацыентаў у аддзяленні рэанімацыі запатрабаваў амаль 10 гадзін.

Разам з высокакласнай брыгадай айчынных трансплантолагаў, дзіцячых уролагаў, анестэзіёлагаў і нефролагаў у аперацыях бралі ўдзел спецыялісты з цэнтра-пабраціма Оксфарда. Замежнікі былі запрошаны нашым бокам у якасці кансультантаў і назіральнікаў для падрыхтоўкі пацыентаў да аперацыі і ў пасляаперацыйны перыяд.

— Асновай развіцця дзіцячай ныркавай трансплантацыі стала актыўнае развіццё дарослай ныркавай транспланталогіі, — адзначае кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай уралогіі Ізаокас СКОБЕЮС. — Мы набылі належны вопыт, які дазволіў падысці да найбольш адказных пацыентаў — дзяцей. Для гэтага нам спатрэбілася стварыць на базе 2-й дзіцячай бальніцы дапаможныя службы — аддзяленні гемадыялізу, перытаніяльнага дыялізу, без чаго трансплантацыі не можа быць, паколькі неабходна «прыкрыць» дзіця ў пасляаперацыйным перыядзе магчымасцю аказання такой дапамогі. Наогул Мінск з'яўляецца другім горадам у былым Саюзе, дзе яшчэ ў 70-я пачалі займацца падобным відам дапамогі. Сёння мы вывелі нашу ныркавую транспланталогію на вельмі высокі ўзровень...

Рэспубліканскі ліст чакання налічвае на сёння 22 дзіцяці, якім патрэбны донарскі орган. Будуць донары — будуць і чарговыя перасадкі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ВЯЛІКІЯ СУМКІ — ВЯЛІКІЯ ПРАБЛЕМЫ

Жаночыя сумкі вялікіх памераў вось ужо некалькі сезонаў не выходзяць з моды. Такія сумкі заўсёды вызначаліся практычнасцю і зручнасцю, а з-за старання дызайнераў яны сталі выглядаць больш прыгожымі, папоўніліся яшчэ большым арсеналам усялякіх кнопак, маланак, бляшак. Аднак модныя павевы падабаюцца далёка не ўсім. Медыкі ўспрымаюць іх з насцярожанасцю.

Часы, калі ў дамскай сумачцы можна было знайсці толькі расчоску, люстэрка і флаканчык духоў, даўно мінулі. Сучасная жанчына набівае сумку «неабходнымі» рэчамі пад завязку. Таму нярэдка жаночая сумка ўсё больш нагадвае дарожны баул, які цяжкім грузам адцягвае плячо. Спецыялісты сцвярджаюць: аб'ёмныя ўмяшчальныя сумкі вядуць да з'яўлення захворванняў апорна-рухальнага апарату. З-за няправільнага размеркавання вагі жаночая постаць скрыўляецца; з цягам часу дэфармуецца плечавы сустаў — усё гэта і выклікае болі ў шыі, плячах, пазваночніку.

Таксама даказана, што цяжкая сумка можа стаць прычынай не толькі парушэння паставы, але і галаўнога болю. Рамень цісне на трапецападобную мышцу (размешчана ў верхняй частцы спіны і задняй вобласці шыі), на крывяносныя сасуды і шыйна-плечавыя нервы, звязаныя непасрэдна з мозгам. Узнікаюць галаўныя болі напружання: сціскае скроні, расколваецца патыліца.

Шкоднае для здароўя і нашэнне сумкі на локці. Крывяносныя сасуды на плячы і перадплеччы размяшчаюцца блізка пад скурай. Пераціснуць іх — нічога не значыць. І калі «цягаць» на локці цяжкую сумку, сасуды моцна пераціскаюцца і парушаецца кровазварот. (Па сутнасці, гэта ўсё адно што накласці жгут для спынення крывацёку.) У выніку можа закружыцца галава нават у здаровага чалавека. А калі ёсць якія-небудзь праблемы з сэрцам ці ціскам, можа нечакана развіцца сардэчны прыступ.

Медыкі лічаць ідэальным «сумчатым» сродкам заплечнік. Апошні вызваляе абедзве рукі, а цяжар размяркоўваецца раўнамерна. Але і пры набыцці заплечніка звяртайце ўвагу на тое, каб лямкі не былі вузкімі і жорсткімі. Пажадана таксама, каб у спінцы заплечніка была ўмацавальная праслойка.

Аптымальны выбар для нашэння на плячы — гэта невялікая або сярэдніх памераў сумка з шырокім рэменем. Бяспечная вага — не больш як 2 кілаграмы.

Вось некалькі парад наконт таго, як палегчыць сабе ношу:

● Паспрабуйце перакідаць рамень сумкі праз галаву і прапускаць яго па дыяганалі праз тулава так, каб цяжар размяркоўваўся раўнамерна, а не клаўся толькі на адно плячо.

● Правядзіце рэвізію паперак і блакноцікаў у сумцы. Насіце з сабой толькі тыя дакументы, якія патрэбны вам пастаянна. Пакіньце дома або на працы карткі на зніжкі з крамаў, адрасы і тэлефоны службаў сэрвісу. (Дарэчы, калі згубіце сумку, у вас будзе менш прычын шкадаваць аб страце.)

● Пакідайце касметычку дома або ў офісе. Бярыце з сабой мінімум касметычных сродкаў, напрыклад, толькі губную памаду і пудраніцу.

● Купіце маленькую сумку. Тады ўжо вашы хатнія не асмеляцца дакучаць вам просьбамі прыхапіць з сабой сёе-тое з кніг, адзення або цацак. Вазьміце за правіла: адпраўляючыся з сям'ёй на прагулку або ў падарожжа, не «цягніце» ўсё на сабе, дайце кожнаму па сумцы або заплечніку.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Каб зняць напружанне шыйных мышцаў і расцягнуць шыйныя пазванкі, каб захаваць пазваночнік гнуткім і расслабленым, выконвайце штодзень наступныя практыкаванні:

● Раніцай, устаўшы з ложка, падыміце рукі і пацягніцеся, паступова становячыся на насочкі — як быццам хочаце ўзляцець, на выдыху плаўна апусціцеся.

● Уявіце сабе, што хтосьці цягне вас за нябачную нітку, прымацаваную да макушкі, і выцягвайце шыю ўверх (мышцы пры гэтым павінны быць максімальна расслабленыя). Калі да хвастца дойдзе адчуванне выцяжэння, уявіце, што вас цягнуць уперад за падбародак, і выцягвайце шыю ўперад (плечавы пояс пры гэтым застаецца нерухомым).

● На падлозе, на канапе або на ложку з цвёрдым матрацам станьце на карачкі, абапіраючыся на перадплеччы (спіна павінна заставацца прамой або крыху прагнутай). Расслабленa апускайце галаву, стараючыся дацягнуцца да грудзей.

● Станьце прама, апусціце падбародак на грудзі. Павольна паварочвайце галаву: левае вуха дакранаецца да левага пляча, затым патыліца — да спіны, правае вуха — да правага пляча, падбародак — да грудзей.

Памятайце: рухі павінны быць плаўнымі, болевых адчуванняў не дапускайце, дыханне не затрымлівайце.

Здароўе на талерцы

Матэін супраць кафеіну

Ці многія могуць уявіць раніцу без кубачка кавы? Бо толькі глынуўшы «пажыўнай вільгаці», наш арганізм канчаткова прачынаецца і здольны на далейшыя подзвігі. І хоць шкода празмернага ўжывання гэтага напою відавочная, адмовіцца ад яго мы не ў сілах... А што потым? Скача ціск, здаюць нервы, баліць сэрца. Няўжо няма чым замяніць звыклую каву? Аказваецца, ёсць чым!

Матэ — падарунак, які зрабілі насельнікі Паўднёвай Амерыкі еўрапейцам. Іншая назва матэ — парагвайскі чай (яго атрымліваюць з высушанага лісця трапічнай расліны падуб парагвайскі). Гэты травяны напой цудоўна танізуе, выклікае прыліў энергіі, паляпшае канцэнтрацыю ўвагі, да яго не развіваецца прывыкання, што робіць матэ ідэальнай заменай кавы.

Матэ — сапраўдная кладоўка вітамінаў (А, С, Е, B_1, B_2, B_5, РР) і мінеральных рэчываў (кальцый, калій, магній, натрый, марганец, крэмній, селен, жалеза, сера). Акрамя алкалоідаў тэафіліну і тэабраміну, матэ ўтрымлівае прыродны стымулятар матэін, які падобны па сваім уздзеянні на кафеін. Аднак, у адрозненне ад апошняга, матэін дзейнічае больш мякка, без пабочных эфектаў у выглядзе нервовай дрыготкі і пачашчанага сэрцабіцця. Як танізуючы напой матэ стымулюе дзейнасць нервовай сістэмы і заспакойвае пры ўзбуджэнні, здымае нервознасць, трывожнасць, а значыць, карысны пры дэпрэсіі. Матэ не парушае цыкл сну. Многія людзі адзначаюць, што ім патрэбна менш часу для таго, каб выспацца, пасля таго, як яны пілі матэ.

Парагвайскі чай садзейнічае ачышчэнню крыві і таму асабліва рэкамендуецца жыхарам вялікіх гарадоў, якія больш за іншых пакутуюць ад загазаванасці паветра, забруджанасці глебы і вады. Таксама матэ зніжае ўзровень халестэрыну, чым папярэджвае развіццё атэрасклерозу; дапамагае пры парушэннях страваванне нервовага паходжання і гастрытах. Нарэшце, гэты напой цудоўна заглушае адчуванне голаду, што робіць яго вельмі прывабным у вачах людзей, якія хочуць пахудзець.

Як бачна, паўднёваамерыканскі чай падыходзіць усім: дарослым — як крыніца энергіі і жыццёвых сілаў, дзецям — як крыніца вітамінаў і мікраэлементаў, неабходных для нармальнага росту і развіцця.

Набыць матэ можна ў спецыялізаваных крамах па продажы кавы і чаю. Там жа прадаюцца аксэсуары для яго заварвання. Матэ заварваюць у калабасе (ісп. Calabaza) — сасудзе, які выраблены з высушанага гарбуза, і п'юць праз спецыяльную трубачку — бамбіж'ю (ісп. Bombilla). У нiжняй частцы трубачкі ёсць маленькае сітца, праз якое не праходзяць чаінкі.

КЛАСІЧНЫ МАТЭ

У калабас засыпаюць заварку на 2/3 аб'ёму і крыху нахіляюць сасуд так, каб яна ссыпалася да адной сценкі. Затым маленькімі порцыямі падліваюць гарачую ваду. Яе патрэбна нямнога (у ідэале вада павінна толькі крыху намачыць заварку, цалкам усмактаўшыся). Настойваюць 2—3 хвіліны, а пасля акуратна ўстаўляюць трубачку, злёгку заглыбіўшы яе ў гушчу заваркі. Потым заліваюць матэ даверху гарачай вадой і, не настойваючы, пачынаюць піць. (Вада павінна быць гарачай — 65—80 °С, але не кіпенем. У адваротным выпадку напой страчвае свае смакавыя якасці і пачынае гарчыць.) У правільна прыгатаваным матэ сухая заварка моцна разбухае і запаўняе сабой збанок.

ХАЛОДНЫ МАТЭ

Гатуецца, як і класічны, толькі заліваецца халоднай вадой і настойваецца каля гадзіны. У халодны матэ часта дадаюць цукар, мёд, апельсінавы або лімонны сок, лісце мяты.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ЛЕКАВАЯ АРЫФМЕТЫКА

Асаблівасці лекавага забеспячэння насельніцтва ва ўмовах фінансавага крызісу і рацыянальная фармакатэрапія сталі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў міжнароднага форуму «Фармацэўтычныя рынкі краін постсавецкай прасторы. Агульныя шляхі рашэння», які прайшоў на мінулым тыдні на базе БелМАПА ў Мінску.

Не сакрэт, што дзяржаўная палітыка ў галіне льготнага лекавага забеспячэння — адно з найбольш складаных і сацыяльна вострых пытанняў. Але як забяспечыць сацыяльную справядлівасць ва ўмовах абмежаваных фінансавых рэсурсаў? Ці мэтазгодна выкарыстоўваць увесь арсенал выпускаемых лекавых сродкаў? На якія лекі трэба рабіць стаўку ў першую чаргу? Адказы на гэтыя пытанні шукаюць сёння ва ўсіх краінах свету, паколькі ніводная, нават самая заможная краіна не можа цалкам узяць на сябе лекавае забеспячэнне сваіх грамадзян. Адно з выйсцяў — стварэнне так званых абмежавальных спісаў. У розных краінах яны называюцца па-рознаму. У Беларусі — гэта Пералік асноўных лекавых сродкаў, які з'яўляецца асновай для фарміравання дзяржаўных закупак, стварэння фармулярных спісаў і льготнага водпуску лекаў. Сёння ён уключае 518 міжнародных непатэнтаваных найменняў лекаў, з іх 195 выпускаюцца ці фасуюцца ў Беларусі.

Дарэчы, сучасная фармакатэрапія налічвае сёння ўжо больш як 3,5 тысячы лекавых субстанцый і каля 300 тысяч зарэгістраваных прэпаратаў, і зарыентавацца ў гэтым лекавым «моры» надзвычай праблематычна. Пры гэтым існуюць доказы таго, што да 40 працэнтаў усіх прызначэнняў лекавых сродкаў робяцца нерацыянальна. У першую чаргу гэта датычыцца лячэння пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй, цукровым дыябетам, бранхіяльнай астмай і язвавай хваробай. Ці варта гэтаму здзіўляцца, калі толькі для сямейных урачоў напісана 30 кілаграмаў клінічных інструкцый, на іх разлічана 25 тысяч друкаваных медыцынскіх часопісаў і штодня з'яўляюцца 8 тысяч навуковых артыкулаў? Прычым 95 працэнтаў гэтых звестак не могуць рэальна ўплываць на прыняцце рашэнняў.

— Ва ўмовах росту кошту лячэння і пацыенту, і грамадству важна ведаць, наколькі апраўданы гэтыя выдаткі на лячэнне, інакш кажучы, цана на лякарства павінна адлюстроўваць яго важнасць для грамадскага здароўя, — лічыць **галоўны пазаштатны клінічны фармаколаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Ларыса ГАЎРЫЛЕНКА**. — Задача, якая ставіцца перад урачом, — правядзіць лячэнне ў адпаведнасці з клінічнымі рэкамендацыямі, заснаванымі на метадах доказнай медыцыны, з улікам індывідуальных асаблівасцяў пацыента, з найменшымі фінансавымі затратамі, але без шкоды для якасці лячэння. На практыцы на першы план нярэдка выходзяць перавагі ўрача, заснаваныя на так званым уласным вопыце, і прасочваецца тэндэнцыя прызначэння неэфектыўных прэпаратаў, якія традыцыйна прымяняліся раней. Плюс нельга скідваць з рахунку ціск з боку пацыентаў, якія літаральна дыктуюць урачу выпіску лекаў, настойліва просяць ці ўвогуле скардзяцца на дзеянні ўрача, а таксама прэсінг фармацэўтычных кампаній.

Існуюць доказы таго, што да 40 працэнтаў усіх прызначэнняў лекавых сродкаў робяцца нерацыянальна. У першую чаргу гэта датычыцца лячэння пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй, цукровым дыябетам, бранхіяльнай астмай і язвавай хваробай.

Наколькі добра нашы ўрачы арыентуюцца ва ўсіх навінках фармацэўтычнага рынку? У Беларусі зарэгістраваныя больш як 6 тысяч найменняў лекавых сродкаў. Так склалася, што асноўную інфармацыю аб новых леках урачы часцей за ўсё атрымліваюць ад іх вытворцаў, хоць фарміндустрыя не можа і не павінна вучыць урачоў рацыянальнаму выкарыстанню лекавых сродкаў. Сур'ёзныя надзеі ўскладаюцца на развіццё ў Беларусі службы клінічных фармаколагаў, якая пачала ўжо фарміравацца. Апошнія будуць дапамагаць урачам падбіраць для пацыентаў прэпарат, аптымальны па суадносінах «цана—якасць—эфектыўнасць».

Відавочная, на першы погляд, перавага больш таннага лекавага сродку можа абярнуцца на практыцы істотнымі стратамі. Старыя і больш танныя прэпараты часта маюць больш нізкую эфектыўнасць і іх неабходна прымяняць па некалькі разоў у суткі, што зніжае прыхільнасць да лячэння і павышае небяспеку лекавых узаемадзеянняў. А ў сучасных сродкаў, якія істотна зніжаюць працягласць лячэння і змяншаюць колькасць ускладненняў, ёсць адзін істотны недахоп — іх дарагоўля.

Але як вызначыць, ці апраўдана эканомія пры набыцці больш таннага прэпарата з улікам больш нізкай яго эфектыўнасці? Адказ на гэта пытанне дае фармакаэканоміка, якая нарадзілася на Захадзе больш як 20 гадоў таму. Фармакаэканоміка — гэта не спосаб зніжэння выдаткаў на ахову здароўя, а спосаб павышэння іх эфектыўнасці. А фармакаэканамічны аналіз — гэта той інструмент, які дапамагае зрабіць рацыянальны выбар у складаных сітуацыях, выбраць лякарства з найбольшай эфектыўнасцю ў разліку на адзінку кошту. Дарэчы, з пункту гледжання спецыялістаў Міжнароднага таварыства фармакаэканамічных даследаванняў і вынікаў лячэння (ISPOR), эканамічна выгадны прэпарат зусім не з'яўляецца сінонімам таннага лекавага прэпарата.

Эканамічна выгадны прэпарат зусім не з'яўляецца сінонімам таннага прэпарата.

— Мы выступаем з ініцыятывай стварыць пры Міністэрстве аховы здароўя рабочую групу па распрацоўцы рацыянальнай і празрыстай сістэмы прыняцця рашэнняў па пытаннях стварэння Пераліку асноўных лекавых сродкаў, — падкрэсліў **выканаўчы дырэктар Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў у Беларусі Аляксей СЫЧОЎ**. — Гэта павінна быць шматузроўневая сістэма, з абавязковым правядзеннем клінічнай і клініка-эканамічнай экспертызы, з прыцягненнем урачоў-практыкаў, фармвытворцаў і прадстаўнікоў прафесійных грамадскіх аб'яднанняў. Асацыяцыя гатова аказаць садзейнічанне ў падрыхтоўцы спецыялістаў для правядзення клініка-эканамічнай экспертызы.

Пытанне стрымлівання цэнаў на лекі актуальнае сёння для ўсіх постсавецкіх краін. У Расіі, напрыклад, у якасці антыкрызісных мераў прапануецца ўвесці абавязковую рэгістрацыю гранічных адпускных цэнаў вытворцам пры рэгістрацыі ім лекавага сродку і ўнесці ў ліцэнзійныя патрабаванні і ўмовы фармацэўтычнай дзейнасці патрабаванне аб захаванні вызначаных гранічных аптовых і рознічных надбавак. У Беларусі напрыканцы студзеня быў праведзены аналіз цэнаў на лекавыя сродкі ў дзяржаўнай аптэчнай сетцы, вынікі якога паказалі, што цэны на лекі ўзраслі, але толькі на тую прадукцыю, якая ўвезена ў краіну ўжо ў новым годзе і па новых кантрактах. Праўда, мелі месца і выпадкі неабгрунтаванага завышэння цэнаў некаторымі айчыннымі вытворцамі. З мэтай ажыццяўлення кантролю за цэнамі Міністэрствам аховы здароўя наладжаны штотыднёвы маніторынг за рознічнымі цэнамі па найбольш запатрабаваных найменнях у аптэках усіх формаў уласнасці па ўсёй краіне. У пералік для маніторынгу былі ўключаны як беларускія, так і замежныя прэпараты, такія, як *прэдуктал, бератэк, но-шпа, карсіл, найз* і іншыя. Да таго ж Міністэрства аховы здароўя звярнулася да ўсіх юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, у якіх маюцца ліцэнзіі на фармацэўтычную дзейнасць, з прапановай максімальна магчымага зніжэння прымяняемых аптовых і гандлёвых надбавак.

Старшыня назіральнага савета праекта «Фармсадружнасць» Айдар ІШМУХАМЕТАЎ узняў яшчэ адну праблему — якасці лекавых прэпаратаў, якая асабліва актуальная ва ўмовах фінансавага крызісу: «Пры любым пагаршэнні эканамічнай сітуацыі рызыка з'яўлення на рынку фальсіфікаваных лекаў істотна ўзрастае. Абараніцца ад нядобрасумленных вытворцаў можна толькі з дапамогай адзіных падыходаў да вытворчасці і рэалізацыі медпрэпаратаў на рынках краін СНД і празрыстасці адносінаў». Папярэджанне Айдара Ішмухаметава прагучала фактычна адначасова з паведамленнем аб 23 пацярпелых у Кургане, Пензе і Кемераве, якія сталі ахвярамі выкарыстання ілжэмілдранату. Прычым двое з іх загінулі. Прэпарат «мілдранат» вельмі распаўсюджаны і прызначаецца для лячэння сардэчна-сасудзістых захворванняў, але чамусьці на гэты раз укол мілдранату цягнуў за сабой удушша і спыненне сэрца. Як высветлілася ў ходзе праведзенага расследавання, у ампулах замест мілдранату аказаўся зусім іншы прэпарат, які выкарыстоўвецца для анестэзіі пры штучнай вентыляцыі лёгкіх. У яго надзвычай шырокі пералік пабочных дзеянняў, сярод якіх і параліч дыхальных мышцаў. Расследаванне ўстанавіла, што ілжэмілдранат быў выпушчаны на суперсучасным прадпрыемстве з аўтаматызаваным кантролем, пабудаваным у Падмаскоўі ўсяго пяць гадоў таму. Проста на вытворчасці... пераблыталі этыкеткі. Прычым падмена не была выяўлена і ў спецыяльных цэнтрах па кантролі за якасцю лекаў, дзе, згодна з інструкцыяй, выбарачна правяраюцца толькі 30 працэнтаў прэпаратаў, што паступаюць у рэгіён. І ампулы з ілжэмілдранатам ў поле кантролю проста не трапілі.

У Беларусі ў 2008 годзе па інфармацыі, агучанай намеснікам міністра аховы здароўя Валерыем Шаўчуком, было праверана 112 тысяч партый лекаў, з якіх 65 партый былі забракаваныя. Але фальсіфікаваных лекаў у Беларусі ў апошнія гады не выяўлялася.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 7 (53)

Колькасць гімназій і ліцэяў застанецца нязменнай

Сетка агульнаадукацыйных навучальных устаноў новага тыпу ў найбліжэйшы час у Беларусі пашырацца не будзе. Пра гэта паведаміў на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО**.

— Ліцэі і гімназіі — гэта асаблівыя навучальныя ўстановы, якія могуць даць больш глыбокія веды таленавітым адораным вучням, стварыць умовы для раскрыцця здольнасцяў дзяцей. Таму чыста фармальна да іх адкрыцця нельга падыходзіць, недастаткова проста змяніць шыльду, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — У сталіцы сёння дзейнічаюць каля 40 навучальных устаноў новага тыпу, і мы ўпэўнены, што колькасць ліцэяў і гімназій у Мінску здольная цалкам задаволіць патрэбы мінскіх школьнікаў. Летась былі дастаткова высокія конкурсы ў гэтыя навучальныя ўстановы, што сведчыць пра іх запатрабаванасць. Але паступленне ў гімназію не павінна быць вынікам рэалізацыі бацькоўскіх амбіцый. Выбар навучання ў гімназіі павінен быць матываваным у першую чаргу з боку дзіцяці...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Урад зацвердзіў архітэктурны праект рэканструкцыі і рэстаўрацыі будынка Белдзяржцырка

Каштарысная вартасць будаўніцтва складае амаль Br130 млрд у цэнах 2006 года, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.

Новыя аб'екты прадугледжваецца ўзвесці каля будынка цырка. Побач, па праекту, размесціцца памяшканне водападрыхтоўкі. Менавіта адсюль непасрэдна на арэну цырка будуць дастаўляць ваду, каб стварыць басейн. Дзякуючы такім магчымасцям цырк зможа запрашаць на гастролі артыстаў, якія працуюць з экзатычнымі маркскімі жывёламі. Акрамя таго, на тэрыторыі цырка намечана ўзвесці сямівавярховы будынак. У ім размесцяцца трэніровачная арэна, а таксама адміністрацыйныя памяшканні і вальеры для жывёлаў.

Нарматыўны тэрмін будаўніцтва такога комплексу — 2 гады. Аднак Мінгарвыканкам паставіў задачу завяршыць работы ў лістападзе гэтага года.

Пяць стагоддзяў вязыні

Рыштаванні Бацькаўшчыны

Як аднавіць гістарычную сядзібу Гецэвічаў?

Ад аранжарэі захаваўся толькі невялікі фрагмент.

Спецыялісты адносяць старажытныя сядзібы да першай катэгорыі культурных ландшафтаў. У адпаведнасці з міжнароднай канвенцыяй аб сусветнай спадчыне гэтым каштоўнасцям надаецца асаблівая ўвага. Ва ўсім свеце такія гістарычныя рарытэты ацэньваюцца як унікальны капітал. І кожная краіна імкнецца захаваць іх для нашчадкаў. Такое трапяткое стаўленне можна зразумець, бо некалі сядзібы з'яўляліся складанымі комплексамі, якія гарманічна ствараліся з архітэктурных і прыродных элементаў. На жаль, у шэрагу выпадкаў цяпер ад былога хараства мала што засталося. Аднак апошнім часам робяцца намаганні, каб адрадзіць колішнія сядзібна-паркавыя комплексы. Вялікая іх колькасць — на Вілейшчыне. Як тут аднаўляюць гістарычную спадчыну? Каб высветліць гэта, я і завітаў у маляўнічыя мясціны.

Ігар СУДНІКОВІЧ прапануе шпацыр па ўнікальнай ліпавай алеі.

Фальварак на Іллянцы

Вязынь вядомая вельмі даўно — гэтае месца ўзгадваецца яшчэ з XV стагоддзя. Тады тут былі каралеўскія ўладанні. Пасля Вязынь пераходзіць ва ўласнасць Збароўскіх, а ў 1628 годзе, у якасці пасагу, — да Рамана Валовіча. Праз колькі часу гаспадарыла тут яго дачка Марыяна Вітунская. 18 жніўня 1795 года (захавалася такая дакладная дата) у адпаведнасці з сенацкім указам Вязынь набыла статус мястэчка. Кацярына II падарыла тутэйшы маёнтак разам з навакольнымі землямі Горычу, які ў 1808-м прадаў яго Гецэвічам. З таго часу гэты шляхецкі род пачаў тут абуладкоўвацца.

Сядзібу ўзводзілі ў першай палове XIX стагоддзя. Прасторны дом з дзвюма верандамі стаяў на ўзгорку, парадны фасад будынка выходзіў на вадаёмы. Паколькі на той час побач не было воднай прасторы (гэта цяпер непадалёк пачынаецца Вілейскае «мора» — самае вялікае ў Беларусі штучнае вадасховішча: вадаём цягнецца ў даўжыню на 27 кіламетраў!), то вырашана было зрабіць тры даволі вялікія сажалкі. Яны злучаліся паміж сабой і з рэчкай Іллянкай — атрымаўся цэлы гідратэхнічны комплекс. Каля вадаёмаў былі абуладкаваныя месцы для адпачынку. Напэўна ж, гаспадарам і іх гасцям тут вельмі падабалася бавіць час, ды і з маёнтка вельмі прыгожы від адкрываўся.

— Апроч таго, сажалкі мелі практычнае значэнне — у іх вырошчвалася рыба, — кажа **старшыня Вязынскага сельскага Савета Ігар СУДНІКОВІЧ**. — Прычым рыбаводствам працягвалі займацца нават у савецкія часы, калі гэта былі землі саўгаса «Вязынскі». Таксама ваду з сажалак выкарыстоўвалі для патрэб тутэйшага бровара.

Дарэчы, бровар у Вязыні, напэўна, самы стары ў Беларусі — яго ўзвялі яшчэ ў 1856 годзе. Моцны мураваны будынак захаваўся дасюль, праўда, па прызначэнні ўжо даўно не выкарыстоўваецца. Як і былыя канюшні, дзе цяпер зрабілі сховішча. Так што гаспадарчыя памяшканні яшчэ і сёння не стаяць закінутыя. Пабеленая цэгла, безумоўна, выглядае не так эфектна, аднак так удаецца пэўным чынам засцерагчы будынкі ад разбурэння. На падмурку панскай канюшні можна прачытаць дату яе ўзвядзення — 1848 год.

У Вязыні калісьці было мноства гаспадарчых пабудоў — цэлы фальварак, дзе выраблялася ўсё неабходнае. Побач з канюшняй былі зроблены караганавыя кругі, дзе абучалі коней. Напэўна, вырошчвалі племянную жывёлу, за якую пасля выручалі добрыя грошы. У фальварку таксама была кузня, лядоўня, млын, кароўнікі, свінарнікі, птушнікі, свіраны ды шмат чаго іншага. Нездарма сядзібу Гецэвічаў прыводзілі ў прыклад як адну з самых добраўпарадкаваных. Шкада толькі, што далёка не ўсе будынкі захаваліся — да прыкладу, ужо не ўдасца ўбачыць малачарню, якая некалі тут працавала.

Мара рамантыка

Агульная плошча сядзібна-паркавага комплексу Гецэвічаў складала каля 30 гектараў. Нішто сабе ўладанні, праўда? Вядома, усё тут было арганізавана па загадзя складзеным праекце, ад увасаблення якога імкнуліся не адыходзіць. Па планіроўцы сядзіба ў Вязыні абрысамі нечым нагадвае сэрца. Вялікі масіў пабудоў складаўся ў тры вуліцы — Цэнтральную, Палявую і так званы «пасёлак парабкаў». Вядома, для абслугоўвання вялікай гаспадаркі патрабавалася шмат работнікаў. На тэрыторыі сядзібы размяшчаліся дамы эканома і кіраўніка гаспадаркі.

У парку стаяла хатка агародніка. Тут была цяпліца і вялікая аранжарэя. На бліжэйшым участку, які быў абмежаваны пасаджанымі елкамі, вырошчвалася шмат розных кветак: бягоніі, браткі, гладыёлусы, гіяцынты, цюльпаны, півоні, вяргіні. Цяпер застаўся толькі фрагмент паўночнага боку сцяны аранжарэі, якая, мяркуючы па ім, падзялялася на дзве часткі (цёплую і халодную). Тут узімку падтрымліваліся розныя тэмпературныя рэжымы — 18-20 і 10-12 градусаў.

У сцяне зроблены адтуліны, хуткі ўсё, па іх праходзіла гарачае паветра і такім чынам абагравалася памяшканне. Такая схема цеплазабеспячэння калісьці прымянялася не толькі ў гаспадарчых, але і ў жылых будынках (да прыкладу, у доме апошняга гаспадара Івянца). У былыя часы на дарозе, якая вяла да маёнтка, стаяла прыгожая ўязная брама. Цяпер на гэтым месцы — некалькі старых дрэў, яны быццам аберагаюць спакой колішняй панскай сядзібы. Дарога праходзіла па тэрасе, каля сажалак, сярод чароўных краявідаў.

Паглядзець тут сапраўды было на што — адзін парк чаго варты! Вялікі зялёны масіў карпатліва высаджваўся з сярэдзіны XIX стагоддзя. Знаўцы кажуць, што ў яго планіроўцы прасочваюцца рысы рамантызму.

— У парку былі не толькі шырока распаўсюджаныя мясцовыя пароды дрэў, але і даволі каштоўныя, — заўважае Ігар Суднікоўіч. — Сярод іх — лістоўніца, серабрыстая таполя, веймутава хвоя. Рос нават кедр, які, на жаль, не захаваўся.

На тэрыторыі сядзібы была створана вельмі складаная сістэма сцяжынак. Шпацыр па парку і садзе можна было працягваць гадзінамі. Унікальнай сярод паркаў Беларусі лічаць ліпавую алею ў Вязыні. Яна пасаджана дзесьці ў 1870 годзе і працягнулася ад уязной брамы ў напрамку касцёла. Праўда, храм узвялі пазней — ужо ў пачатку XX стагоддзя. Алея даволі доўгая, дасюль захавалася каля 400 ліп. Дрэвы ўтвараюць своеасаблівы зялёны калідор.

Прынада для інвестара

Ад парадной часткі палаца на ліпавую алею выходзілі чатыры сцяжынкі. Адна з іх была пракладзена ўздоўж пчальніка і клубнічнага поля, другая ішла ў глыбіню саду. Ад крайняга вадаёма сцяжынка выводзіла да старых ліп і бяроз, каля якіх стаяла прыгожая альтанка. Тут было цудоўнае месца для адпачынку, любілі працаваць мастакі. Захаваліся зместкі, што ў сядзібным комплексе існавала і тэнісная пляцоўка (спартыўнае збудаванне не захавалася).

Як бачым, у Вязыні шмат чаго страчана, але ж засталіся ўнікальныя аб'екты, іх варта зберагчы. Можна аднавіць гідратэхнічную сістэму. Зразумела, рэчка Іллянка за гэты час пераўтварылася ў ручай, аднак сажалкі можна аднавіць. Быў складзены грунтоўны праект іх добраўпарадкавання.

— У 2005 годзе за сродкі раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя была даведзена да ладу дарога ўздоўж сажалак, — адзначае Ігар Суднікоўіч. — На гэта пайшло 9 мільёнаў рублёў. У 2006-м сельскім Саветам складзена дакументацыя па расчыстцы сажалак. З улікам добраўпарадкавання бліжэйшай тэрыторыі спатрэбіцца значная сума — каля 1 мільярда рублёў. Зразумела, ні сельсавет, ні раён такі аб'ём фінансавання проста не пацягне. Таму звярнуліся ў Мінскую гарадскую інспекцыю прыродных рэсурсаў (усё ж такі вадаёмы ўваходзяць у Вілейска-Мінскую сістэму і вада адсюль паступае ў сталіцу). Там абяцалі дапамагчы, аднак дасюль пытанне прынцыпова не вырашана.

Зразумела, на месцы таксама не сядзяць склаўшы рукі. Вязынскі парк замацаваны за тутэйшай школай, амбулаторыяй і сельгаспрадпрыемствам, якія праводзяць добраўпарадкаванне. Аднак толькі такімі мерамі нельга абмежавацца. Паводле слоў Ігара Суднікоўіча, прыязджаюць людзі, якія цікавяцца праектам аддаржэння сядзібна-паркавага комплексу Гецэвічаў, але не больш за тое. Ёсць прапановы зрабіць у Вязыні гасцініцу, адкрыць кавярню, аднак пакуль такія планы далёкія ад увасаблення. Між тым застаецца надзея на аднаўленне гістарычнай сядзібы. Надта ўжо прывабнае месца — побач Вілейскае вадасховішча. Таму дзе, як не тут, развіваць турызм, а адначасова і адраджаць гістарычную спадчыну.

— Мясцовыя ўлады будуць усяляк спрыяць інвестарам, якія падключацца да аднаўлення сядзібна-паркавага комплексу Гецэвічаў, — запэўніў **старшыня Вілейскага раённага Савета дэпутатаў Яўген ІГНАТОВІЧ**. — Гэта вельмі перспектыўны праект, рэалізацыя якога прынясе агульную карысць. А самае галоўнае — удасца захаваць усё для нашчадкаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Вілейскі раён.

Фота аўтара.

Пакроўская царква стаіць прама на ўзбярэжжы Вілейскага «мора».

Касцёл нараджэння Дзевы Марыі — былая фамільная капліца Гецэвічаў.

Эмацыйні пастаянка

Вова і сон

Вова хварэе, хутка стамляецца і засынае. Учора ён заснуў на маім ложку. Я сядзеў на ягонай канапе і глядзеў фільм «Пасля прачытання спаліць». Вова хацеў паглядзець пра агента 007 і казіно «Раяль», але я адмовіўся, бо мы з ім ужо тры разы разам сачылі за прыгодамі агента Бонда ў Монтэ Карла. Засмучаны Вова пайшоў у маю спачывальню чытаць і тамака з кнігаю «Птушкі Еўропы» ў руцэ заснуў. Я спрабаваў яго пабудзіць, але ён капрызіўся і адмаўляўся прачынацца, давялося перанесці яго на руках. Нёс я нашага соннага хлопчыка і думаў: для мяне сон унука Вовы вельмі важны, для мяне мала што ў свеце важнейшае за сон Вовы, ды нічога і няма ў гэтым свеце больш важнага за сон дзіцяці... Таго, хто не зразумеў, мне зусім не шкада, бо шкада Вову, які захварэў, нэньдзіцца і хутка стамляецца.

Памежныя колеры

Пад раніцу, у неглыбокім сне ўбачыліся колеры: цёмны задумліва-бэзавы і светлы знерваванa-зялёны. Зялёны пачаў заплываць залаціста-лімонным, і я канчаткова прачнуўся ў сонечным пакоі.

Радэн і сабор

Скульптар Радэн, малюючы натуршчыцу, прымушаў яе хадзіць па майстэрні. Ён маляваў пяром і тушшу, падфарбоўваў малюнкі акварэллю, а натуршчыца хадзіла і хадзіла па атэльэ да знямогі. У Радэна быў свой погляд на чалавека, ён называў чалавека саборам у руху. Але для паўнаты такога светагляду ў Радэна не хапае натуршчыка. Для гарманічнага чалавека-сабора акром натуршчыцы Евы павінен быць і натуршчык Адам, тады іх рухі набудуць сэнс. Ці маляваў Радэн з натуры натуршчыка з натуршчыцаю ў час эратычнае гульні? Дакладна невядома, але скульптур з падобным зместам у Радэна шмат.

Самсон і сям'я

Яшчэ ў часы Самсона ваяры ведалі, што сямейных людзей нельга браць у партызаны. Ведаць усе ведалі, але беларусы гэты закон у час апошняй вайны парушалі. Яны ішлі ў партызаны, пакідаючы жонак і дзяцей безабароннымі. Чаму так? Хай гісторыкі разбіраюцца. Галоўнае, не забыць бы пра гэты партызанскі закон...

Смаляк і подзвіг

Маё сяброўства з Андрэем Смаляком скончылася тады, калі я кінуў піць. Пакуль піў гарэлку, у мяне было шмат знаёмых, з якімі я любіў цэлую ноч прасядзець за сталом, пазастаўляным бутэлькамі. Піць са Смаляком было адно задавальненне; бо і закуска мелася, і пітво не скончалася. Так, Андрэй мог сто разоў за адзін вечар паўтарыць: «Я — геній!» Спрачацца за гарэлачным сталом не трэба. Дзевяноста адсоткаў забойстваў у нашай талерантнай і лагоднай Беларусі здараюцца за сталом з гарэлкаю ці віном. Выпівалі, спрачаліся, адзін схапіўся за нож, і маем яшчэ адно злачынства з халодным трупам пад раніцу. Ні мне, ні Андрэю труп сабутэльніка не патрабаваўся. Мы пілі, разважалі пра жывапіс, гаварылі пра пакупнікоў карцін, абмяркоўвалі заможных замоўцаў парадных партрэтаў... Жонкі глядзелі на нашае п'янства даволі скептычна, але выпіваць не заміналі. Каб я і далей выпіваў, дык і цяпер па сто разоў на вечар чуў бы Андрэева «Я — геній! І ты — геній! І яна...» Працверазеўшы, я інакш глянуў на творчасць Смаляка. Што б ты мне ні казаў, а подзвіг Андрэй здзейсніў. Бясконцымі паўторамі ён прысабеціў слоўца «геній». Мастак Смаляк стаў геніем, і дзякуючы гэткаму пераўтварэнню астатнія мастакі парабіліся анёламі, бажкамі, кумірамі, культавымі творцамі, паўбагамі жывапісу, ідаламі, крэатыўшчыкамі, багамі...

Іра і Ядзя

Цэлы дзень пісаў на палатне малочна-белую спіну натуршчыцы Іры. Вечарам у студыю зайшла дачка Ядзя. Мы пасварыліся. Яна казала, што я няўважлівы да яе творчасці; я гаварыў, што яна злоўжывае ненарматыўнай лексікай у размовах з чужымі людзьмі. Дачка заплакала і ўцякла, нават свой ружовабокі сотавік пакінула на маім стале. Я расхваляваўся так, што ажно сашкрэб і змыў з палатна спіну малочнацелай натуршчыцы.

Фелікс і боль

Надыходзіць такі момант у жыцці, калі ты пачынаеш рухацца праз боль. Цябе папярэджвалі пра тое, але ты не думаў пра кепскае, спадзяваўся на лепшае. Мяне папярэджваў Фелікс Кучар. «Толькі праз боль і можна ісці, усё лепшае робіцца праз боль!» — ён так сказаў. Я пагадзіўся, бо Фелікс аднаго ўзросту з маім бацькам. Мы абмяркоўвалі сыход майго таты з жыцця, калі Фелікс нагадаў пра боль. Як я мог яму запярэчыць? Цяпер і Фелікса няма. «Часам людзі паміраюць!» — так ён сказаў на развітанне. Боль яго адпусціў, спадзяюся.

Мора і чалавечнасць

Мора так ачалавечылася, што нават на пустым даляглядзе людзям бачацца караблі.

Адам ГЛОБУС.

Экслібрыс «Звязды»

Усе дарогі вядуць дахаты...

З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі/ уклад. Мікола Мінзер. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. — 464 с.

У традыцыях беларускага кнігавыдання — знаёмства чытача з аўтабіяграфіямі пісьменнікаў.

Калісьці, у 1963, 1966 і 1973 гадах, адна за другой пабачылі свет тры томікі аўтабіяграфічных эсэ літаратараў — «Пяцьдзесят чатыры дарогі», «Пра час і пра сябе» і «Вытокі песні». Велізарную, важкую справу па іх укладанні зрабіў вядомы літаратуразнаўца Янка Казека.

РВУ «Літаратура і Мастацтва» з ініцыятывы Міколы Мінзера вярнулася да гэтай традыцыі: толькі што пабачыла свет кніга «З росных сцяжын». Пад адной вокладкай — 54 (!) аўтабіяграфіі. Разам сабраны жыццяпісы празаікаў, паэтаў, драматургаў, крытыкаў, якія прыйшлі ў нацыянальную літаратуру ў асноўным у апошнія дзесяцігоддзі і па зразумелых прычынах яшчэ не маглі расказаць пра сябе ў папярэдніх кнігах.

Чытач пазнаёміцца з вытокамі творчасці, «малой» радзімай Міхася Башлакова, Алеся Жука, Сяргея Давідовіча, Навума Гальпяровіча, Уладзіміра Гніламёдава, Анатоля Бутэвіча, Анатоля Казлова, Алеся Марціновіча, Уладзіміра Карызны, Міколы Мятліцкага, Валянціна Лукшы, Вячаслава Рагойшы, Васіля Ткачова, Уладзіміра Федасеенкі...

Укладальнік прадставіў у зборніку і тэксты, якія вяртаюць да аўтабіяграфічнага выкладання жыцця і творчасці Рыгора Семашкевіча, Міколы Купрэева, Алеся Пісьмянкова, Яўгена Крупенькі, Міколы Калінковіча. Гэтыя пісьменнікі даўно пайшлі з жыцця.

У выпадку з паэтам Рыгорам Семашкевічам пра паэта красамоўна сведчыць верш «Аўтабіяграфія». Творчае аблічча Міколы Купрэева дапамагае ўсвядоміць, асэнсаваць яго інтэрв'ю паэту Леаніду Галубовічу.

Мажліва, у тых кнігах аўтабіяграфій, якія выйдуць следам, знойдзецца месца і для тэкстаў, адшуканых у архівах. І гэта абавязкова трэба зрабіць. Інакш нешта згубіцца, калі і не знікне бясследна, то застанецца па-за ўвагай шырокага кола чытачоў.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Первичная профсоюзная организация Щучинского отделения филиала ОАО «БПС-Банк» по Гродненской области заявляет о прекращении своей деятельности. Адрес: Гродненская область, г. Щучин, ул. Октябрьская, 2, УНН 590350182, свидетельство о государственной регистрации № 18/3-007 от 18.03.2008 г. Выдано Щучинским районным исполнительным комитетом.

Претензии предъявляются в течение 2 месяцев со дня опубликования, **тел. 8 01514 29 8 38**.

Бяседныя песні

Ах, бяда

Моладзь заўсёды прагне ўзнёслага палёту, хмельнага кахання. Таму ў мінулым годзе Якаў Навуменка прапанаваў прыцягальна-вабнай Уладзе стварыць вакальны абразок пры выкананні песні «Ах, бяда», якую напісаў сумесна з Алай Фіялкоўскай.

Таленавітая спявачка мае багатыя артыстычныя набыткі. З шасці гадоў яна на сцэне, спявала ў «Верасятах» і цяпер уражвае сваёй неардынарнасцю. А ў песні «Ах, бяда», насычанай неадольнай пачуццёвасцю, каханне якраз вобразна паўстае то «звонкай крыніцай» з зачараванай вадой, то «бядой-спакусай», ад якой няма паратунку. Улада ўдала перадала вобраз неўтаймоўнай каханкі, вынесла на людскі перасуд і даверлівую радасць, і непрыхаваную трывогу.

На бяседзе, калі пасля чаркі знікае адчужанасць, песня робіцца непасрэднай прапановай, жаночым поклічам.

Верш Алы Фіялкоўскай
Музыка Якава Навуменкі

Ты прыгожы, быццам Бог,
Ты такі прыгожы!
Колькі ж пройдзена дарог
Прада мной, быць можа?

Прыпеў:
Ах, бяда, мая бяда!
Ах, бяда-спакуса!
Не ўратуюся ніяк
Ад гарачых вуснаў.
Ах, бяда, мая бяда —
Звонкая крыніца:
Зачарована вада —
Нельга наталіцца.

Ззяюць зоры давідна,
Кліча гул дарожны.
Не сумуй, мая струна,
Не гучы трывожна...

Прыпеў.

Затрымайся — не спяшы,
Расставання просінь!
Яшчэ полымя ў душы
Захмялелых вёсен.

Прыпеў.

Забірае зноў цябе
Клапатлівы будзень...
Не хачу я знаць цяпер,
Што назаўтра будзе...
Прыпеў.

Падрыхтаваў
Міхась ШАВЫРКІН.

Рыштаванні Бацькаўшчыны

МАЛІТВА Ў ДАРОГУ

З самага маленства прайшлі праз сэрца маё звонкія струны чыгуначных рэек, загучалі меладычным перастукам колаў, таямнічымі гудкамі паравоза, высвеціліся на ўсё жыццё агнямі чыгуначнага палатна, завабілі прыгожай формай, чырвонымі шапкамі і жоўтымі жэзламі. І не дзіўна. І дзед Раман, якога ніколі не забываю ў памінальных запісках, і іншыя мае сваякі былі з роду цесляў і чыгуначнікаў, таму што зусім блізка ад маёй роднай вёскі на Гомельшчыне размясцілася невялікая станцыя Дземяхі, якую ўяўляю цяпер цэлым сусветам. Менавіта з гэтай прывакзальнай вёскі і пачалася для палескай дзяўчынкі асаблівая **Малітва дарогі**. Згадваецца некалі прачытанае: «Усе мы — падарожнікі на гэтай зямлі і прышэльцы, і ўзлакнем неба...»

Што да падарожнікаў, то, мяркую, на дзень сённяшні колькасць іх на зямлі даўно перасягнула мільённыя лічбы. Нямала нас, пасажыраў, і ў гісторыі чыгункі Беларусі. Бо менавіта яна, чыгуначная дарога, перажывала разам з народам усе складанасці і перыпетыі гістарычных паваротаў, разбурэнняў і аднаўленняў. І сёння, калі прыходжу на шыкоўны чыгуначны вакзал у Мінску, дзе міжволі згадваю іншыя вакзалы і станцыі, якіх у маім жыцці сабралася ўжо ці не адна тысяча, то думаю аб тым, што ўся гэтая своеасаблівая рэйкавая сістэма руху ўяўляе сабой цэласны арганізм і, падобна дзівоснай карце, адлюстроўвае ўвесь гістарычны шлях нашай радзімы. І ў мірны час, і ў гады вайны, і ў перыяд рэпрэсій 30-х... Бо ўсе вакзалы і станцыі Беларусі звязаны між сабой найперш людзьмі — лёсамі пасажыраў, народнымі бедамі і радасцямі, нашымі надзеямі і памкненнямі, сустрэчамі і развітаннямі. Часам хочацца звычайны вагон назваць спавядальным памяшканнем, дзе людзі адкрываюць адно аднаму сэрцы і патаемныя думкі. Вось чаму большасць тых, хто працуе на чыгунцы, пачынаючы ад праваднікоў у вагонах, агорнуты асаблівым святлом дабрыні і — хрысціянскай веры. І вера іх праяўляецца найперш у пастаяннай увазе да пасажыра, бо і ў няпростых умовах дарожнай бясконніцы трэба падтрымліваць парадак. І ўсё ж як часта не хапае нам бласлаўлення, таму што ў спешцы перад выездам, як звычайна, не паспявае чалавек пайсці ў царкву і пачуць ад святара малітву: «Благодатию Твоею спутешествуй рабом Твоим, пошли Ангела-хранителя». Патраціш хвіліны — а сэрца на ўсю дарогу атрымлівае супакаенне. Справа, зрэшты, не ў хвілінах, бо калі падлічыць, колькі часу беларускія пасажыры, да прыкладу, на цэнтральным вакзале, прабаўляюць у пустых перамовах ці разгадванні старых крыжаванак, то складуцца суткі, месяцы і нават гады. Ды і сама я не раз апыналася ў сітуацыі, калі чакаючы цягнік, уздыхала: і ў найбліжэйшую царкву дайсці не паспею, і заняцца няма чым. Ды і пасля прыезду дамоў шукаем мы хутчэй не дарогу да храма, а метро ці аўтобусны прыпынак. Таму ўсё часцей згадваецца даўняе правіла нашых продкаў мець пры вакзале святое месца прысутнасці Божай, што ўспрымецца найперш як месца саборнага яднання і адзінадумства людзей. Асабліва ўгоднымі лічыліся храмы, збудаваныя на ахвяраванні, на тыя «дзве лепты ўдавы», што здаўна выяўлялі пабожнасць чалавека.

У гэтай сувязі нагадаю некаторыя моманты з гісторыі мінскіх храмаў.

Прынамсі, у даведцы супрацоўніка Мінскай епархіі Генадзя Шэйкіна сказана, што некалі ў раёне сучаснай плошчы Мяснікова знаходзіліся два храмы, асвечаныя ў гонар цудатворнай іконы Божай Маці «Казанскай» і названыя прыхажанамі «прывакзальным» і «чыгуначным». Адзін з іх быў драўляным і даволі сціплым паводле свайго вобліку, другі, цагляны, вылучаўся велічнасцю і архітэктурнай вытанчанасцю. Адрозніваючыся абставінамі ўзвядзення, храмы гэтыя адрозніваліся і сваімі гістарычнымі лёсамі. Перадгісторыя першага, драўлянага храма сягае ў 70-я гады XIX ст., калі ў дадатак да Маскоўска-Брэсцкай (пазней Аляксандраўскай), пачалося пракладванне Лібава-Раменскай чыгункі. Пры створаным у Мінску буйным чыгуначным вузле ўзнікла і адпаведнае Упраўленне, супрацоўнікі якога не толькі імгненна рассяліліся ў прывакзальнай частцы горада, але і задумалі пабудову сваёй царквы, бо тая, што ўжо была ў горадзе, знаходзілася ад вакзала на значнай адлегласці. У выніку ўжо ў 1890 г. сама Лібава-Раменская чыгунка асігнавала на будаўніцтва 10 тыс. рублёў, а яшчэ праз год пасля шматлікіх хадайніцтваў на месцы злучэння тагачасных Захар'еўскай і Маскоўскай (цяпер Савецкая і Мяснікова) вуліц і была ўзведзена прывакзальная драўляная царква, асвечаная ў гонар іконы Казанскай Божай Маці.

Дарэчы, Казанскі вобраз Багародзіцы далёка не самы старажытны, але адносіцца да ліку найболей шануемых у праваслаўнай царкве. Паказальна, што знаходзіцца яна ў абсягу «Адзігітрыя», што азначае «Шляхаводжай маці» («Путеводительница»). Знойдзена ікона была ў 1579 г. у Казані і праславілася сваёй цудатворнасцю, таму карысталася асаблівай народнай любоўю, бо з ёю лучацца шматлікія лёсавызначальныя падзеі старажытнасці. Прынамсі, звязаныя і са смутным часам вызвалення Масквы 1612 г., і, значна пазней, з абаронаю Ленінграда ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Такім чынам першы прывакзальны храм у Мінску пачаў сваю дзейнасць, але хутка выявілася, што ўсіх ахвотных змясціць ён не можа, а таму ўжо ў 1896 г., пасля збору сродкаў, наладжанага святаром Іаанам Квачэўскім, адбылося пэўнае пашырэнне плошчаў. Справа аднак на гэтым не завяршылася. А пакольскі паток прыхажан шырыўся, пры царкве было створана Брацтва па вышуку сродкаў для будаўніцтва новага храма. Статут Брацтва быў зацверджаны Мінскім архіерэем Прэасвяшчэнным Сімяонам (Ліньковым). Вынікам дзейнасці Брацтва стаў грунтоўны прытак ахвяраванняў ад чыгуначнікаў, сярод якіх асабліва вылучыўся начальнік Лібава-Раменскай чыгункі П.І. Шастакоў. Вызначальным у пэўным сэнсе стаўся 1912 год, калі па хадайніцтве тагачаснага начальніка чыгункі Г. Генрыхсена на будаўніцтва храма Міністэрствам шляхоў зносінаў было выдзелена 32 000 руб. У дадатак Брацтва атрымала таксама 15 000 руб. ад Святейшага Сінода, а ў сувязі з набліжэннем святкавання трохсотгоддзя Дома Раманавых у скарбонку новага храма паступіла і 1000 рублёў ад самога імператара Мікалая II, ужо ў наш час разам са сваёй сям'ёй прылучанага Царквою да ліку святых угоднікаў Божых. Такім чынам, па звестках Генадзя Шэйкіна, яшчэ напрыканцы 1908 г., калі Брацтва ўжо мела 40 000 руб., стварыліся ўсе ўмовы для прыняцця рашэння пра ўзвядзенне новага храма. Месца для яго было выбрана ў непасрэднай блізкасці да ўжо наяўнага драўлянага, але крыху бліжэй да чыгуначнага палатна. Праект, дарэчы, быў распрацаваны вядомым інжынерам Прозаравым.

Будаўніцтва праводзілася пад назіраннем членаў спецыяльна створанага камітэта, і ўжо напачатку 1914 г. храм з белага каменю, на грунтоўным каменным фундаменце, быў узведзены. Заставаліся толькі ўнутраныя работы, завершаныя ўжо ў кастрычніку. Пабудаваны ў візантыйскім стылі ў выглядзе крыжа з трыма апсідамі, новы храм быў разлічаны на 1000 вернікаў і радаваў вока пяццю ацынкаванымі жалезам купаламі. Грунтоўнасцю вызначаліся дубовыя іканастасы і выкананыя на цынку ў тым жа візантыйскім стылі іконы. Урачыстасці асвячэння новазбудаванага храма, сабраўшы вялікую колькасць людзей, адбыліся 17/30 кастрычніка 1914 года. Чын святара галоўнага прастола ў гонар Казанскай іконы Божай Маці здзейсніў епіскап Мінскі і Тураўскі Мітрафан (Краснапольскі), у наступным архіепіскап Астраханскі і Царэўскі, які быў у свой час далучаны да ўгоднікаў Божых, як святы пакутнік.

Першая прывакзальная драўляная царква, асвечаная ў гонар іконы Казанскай Божай Маці.

Пустку, утвораную пасля разбурэння велічнага Свята-Казанскага храма, назвалі плошчай Мяснікова.

Пасля пабудовы новага храма драўляны будынак быў адведзены пад захаванне царкоўнага рыштунку, а яшчэ пазней, пры савецкай уладзе, абрабаваны і зладжаны пад «клуб глуханямых», калі над уваходнымі варотамі ўсе ўбачылі партрэты савецкіх «вождей» і чырвоныя сцягі. Службы ў новым будынку, што выглядаў, як велічны сабор, праходзілі да самага 1930 года, пасля чаго, зняўшы крыжы, у яго памяшканні размясцілі клуб чыгуначнікаў. Але самае важнае было наперадзе. Няўмольна набліжаўся грозна-крывавы 1936-ты... Год суцэльных рэпрэсій, які, на жаль, не абмінуў сваёй знішчальнай увагаю і цэрквы. Менавіта ў гэты год найперш быў разбураны кафедральны сабор, пасля чаго ў выніку наймагутнейшага выбуху быў знішчаны і велічны Свята-Казанскі храм. Як сведчаць архівы, падрыўнымі дзеяннямі па ўказанні ўладаў кіраваў афіцэр Чырвонай Арміі Грыгарэнка (у наступным генерал, які ў 70-я гады стаў шумна вядомым сваімі антысавецкімі выступленнямі і закончыў жыццё ў адной з псіхіятрычных лячэбніц Нью-Ёрка). Пакольскі разбурэнне храма насіла выключна паказальны характар, на дзеянні падрыўнікоў прыйшлі паглядзець кіраўнікі беларускага ўрада, сярод якіх былі Гікала, Галадзед, Чарвякоў. Для лепшай бачнасці правядзенне акцыі было намечана на шэсць гадзін раніцы, а для пашырэння «кругагляду» ўсе размясціліся на балконе левага крыла Дома ўраду. Менавіта адтуль і ўбачыліся яны ўчыненае, пачулі, як страшна прагрымеў выбух. А роўна праз год усе названыя ўрадаўцы самі сталі ахвярамі рэпрэсій з боку сваіх жа паплечнікаў. Дарэчы, асвечаны ў гонар Казанскай іконы Божай Маці прытвор сучаснага Мінскага кафедральнага сабора стаўся своеасаблівым помнікам узарванаму ў 1936 годзе прывакзальнаму храму.

...Прайшло зусім мала часу, і пустку, утвораную пасля разбурэння прывакзальнага храма, назвалі плошчай Мяснікова. Такой бачым мы яе і сёння: з валуном, на якім накрэслена, што тут будзе пастаўлены помнік названаму дзяржаўнаму дзеячу савецкай эпохі.

Што да першай драўлянай прывакзальнай Свята-Казанскай царквы, то па літасці Божай яна доўга заставалася цэлай і пасля акупацыі горада немцамі ў 1944 г. была адчынена. Правячы Мінскі архіерэй уладыка Васілій (Ратміраў) палічыў неабходным менавіта гэты сціплы храм зрабіць Крыжаўздвіжанскім. Тут жа, у дварыцаркві, размяшчаўся дом з архіерэйскімі пакоямі і епархіяльнай канцылярыяй. Аднак у 1961 годзе ўсё памянялася: царква была спачатку зачынена, а затым, па распараджэнні ўладаў, канчаткова знесена. На сведчанні старажылаў, на месцы яе знаходжання каля Дома ўраду ўтварыўся невялікі астравок з дрэў, лісце якіх з самай раніцы пачынае шаптаць сваю бясконцую малітву за ўсіх в

ШКОЛА «ІНТЭГРАЛА»



**На «Інтэграле» працуюць:
2 члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
6 дактароў навук,
23 кандыдаты навук,
3 прафесары,
2 дацэнты, 21 лаўрэат Дзяржаўнай прэміі і прэміі Савета Міністраў,
3 дактаранты,
13 аспірантаў.**

У канцы мінулага года, у адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай развіцця і павышэння эфектыўнасці работы мікраэлектроннай галіны, у навукова-вытворчым аб'яднанні «Інтэграл» уведзена ў эксплуатацыю вытворчасць для выпуску інтэгральных мікрасхем з мінімальнымі праектнымі нормамі 0,35 мікраметра. Гэта — вельмі важны і вельмі значны крок «Інтэграла», у цэлым рэспублікі па шляху далейшага навукова-тэхнічнага прагрэсу, асваення высокіх тэхналогій. Абазначым тут жа значэнне мікраэлектроннай галіны для любой з краін. Сёння іх тэхнічны прагрэс і ступень развіцця вызначаюцца ўзроўнем развіцця інфармацыйных тэхналогій — асновай жа такіх тэхналогій і з'яўляецца менавіта мікраэлектроніка. Радыёэлектронная прамысловасць выступае як базавая сярод вядучых галін і, па сутнасці, з'яўляецца галоўнай рухальнай сілай эканомікі любой краіны, паколькі менавіта яна дазваляе выкарыстаць на поўную моц усе дасягненні сучаснай тэхнікі. Сёння ў свеце ўсяго дзесяць індустрыяльна развітых краін маюць сучасную інфраструктуру электроннай прамысловасці, структуру, якая забяспечвае поўны цыкл праектавання і буйнамаштабнай вытворчасці паўправадніковых вырабаў, інакш кажучы — мікрасхем. Наша краіна якраз і ўваходзіць у лік гэтых дзесяці краін. І як бы ні ацэньвалі нашы магчымасці ў гэтай галіне асобныя скептыкі, у нас, тым не менш, створаны і задзейнічаны сур'ёзны адпаведны навуковы і вытворча-тэхнічны патэнцыял. У краіне склалася свая, айчынная школа мікраэлектронікі, склалася выдатная школа спецыялістаў, кадраў.

Аднак пра пэўныя рухальныя сілы айчыннай мікраэлектронікі яшчэ будзе сказана крыху ніжэй, а цяпер вернемся да ўжо зазначанай мінулагодняй падзеі на «Інтэграле». Што будуць мець ад асваення новых праектных нормаў як само прадпрыемства, так і ў цэлым краіна?

Велічыня асвоенай праектнай нормы адлюстроўвае мінімальна магчымыя, дасягнутыя распрацоўшчыкамі мікрасхем геаметрычныя памеры паміж элементамі на крышталіку мікрасхемы. Зразумела, чым меншай будзе гэта норма, тым вышэйшай будзе ў распрацоўшчыка мікрасхемы магчымасць уціснуць у яе большую колькасць інфармацыі. На «Інтэграле» да гэтага працавалі ў асноўным з праектнымі нормамі 0,8 мікраметра і болей. Ацэньваючы належным чынам цяперашні, яшчэ раз падкрэслім, вельмі важкі крок «Інтэграла» па асваенні новай мікравелічыні, разам з тым удакладнім: у свеце вядучыя вытворцы мікрасхем ужо працуюць з праектнымі нормамі 0,18 мікраметра і нават пачынаюць асвойваць 90 нанаметраў. Гэта, аднак, ніколькі не прыніжае цяперашняга дасягнення «Інтэграла»; хутчэй, наадварот, характарызуе яго пастаянную нацеленасць менавіта на сусветныя дасягненні. Тут жа, забягаючы крыху наперад, зазначым: на «Інтэграле» ўжо цяпер ставяць перад сабой працуюць у галіне мікраэлектронікі (са шматлікіх расійскіх прадпрыемстваў — цяперашніх партнёраў і канкурэнтаў «Інтэграла», засталіся дзеяздольнымі, па сутнасці, толькі два — «Мікрон» і «Ангстрэм» у Падмаскоўі). На сітуацыю з кадрамі на расійскіх прадпрыемствах негатыўна паўплываў прыход на расійскі рынак шматлікіх філіялаў і прадстаўніцтваў вядучых замежных фірмаў, што працуюць у галіне мікраэлектронікі — у гэтых філіялах і прадстаўніцтвах расійскія спецыялісты «знайшлі» намнога большую, чым на сваіх ранейшых прадпрыемствах, заработную плату. Выгадароніка — дысцыпліна хутказменлівая, тэорыя часта не паспявае за практыкай, за новымі ўнікальнымі распрацоўкамі і дасягненнямі. І, напрыклад, учарашняга выпускніка вышэйшай навучальнай установы з тым, каб ён добра «ўехаў у сваю тэму», па-сапраўднаму зразумеў сутнасць сваёй работы і абавязкаў, трэба было б вучыць яшчэ столькі ж гадоў на самім прадпрыемстве... На «Інтэграле», маючы гэты факт на ўвазе, пачалі самі максімальна ўдзельнічаць у навучальным працэсе студэнтаў, задзейнічалі для гэтага сваіх лепшых спецыялістаў. Так, шэраг інтэгралаўскіх спецыялістаў чытаюць курс лекцый у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, у прыватнасці, на прыборабудаўнічым факультэце; пры гэтым наладжаны добры кантакт з дэканам факультэта прафесарам Алегам Гусевым. Курс лекцый інтэгралаўскіх спецыялістаў студэнты прахадзяць, пачынаючы ўжо з трэцяга года навучання, пры гэтым чытаюцца два асобныя курсы — для будучых распрацоўшчыкаў мікрасхем і для тэхнолагаў. Студэнты ў выніку не толькі атрымліваюць больш сучасныя веды, разам з тым адбываецца свайго роду іх селекцыя — больш таленавітыя з іх, зразумела, трапляюць сваім інтэгралаўскім настаўнікам «на аловак», а з іншага боку, студэнты — будучыя спецыялісты «Інтэграла» (а яны яшчэ, акрамя ўсяго, пішуць на базе «Інтэграла» свае дыпломныя работы), калі прыходзяць на прадпрыемства, ужо адразу менавіта ўваходзяць у сваю тэму. Такія ж курсы лекцый чытаюцца і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Генеральны дырэктар НВА «Інтэграл» Віктар ЕМЯЛЬЯНАЎ (справа) са знакамітым вучоным, госцем «Інтэграла» Жарэсам АЛФЁРАВЫМ падчас наведвання вытворчасці прадпрыемства.

Дзейнічае вучэбны клас і ў самым, так бы мовіць, сэрцы «Інтэграла», або там, дзе і нараджаюцца мікрасхемы, — у навукова-тэхнічным цэнтры «Белмікрасістэмы». Тут праходзяць свой дадатковы курс навук, адначасова знаёмяцца з унікальным абсталяваннем НТЦ, працэсамі праектавання, выконваюць лабараторныя работы студэнты фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. «Курс навук», і ў прыватнасці па асаблівасцях сістэм сучаснага праектавання, праводзяць такія высокакампетэнтныя спецыялісты «Інтэграла», як член-карэспандэнт Акадэміі навук, намеснік дырэктара цэнтра «Белмікрасістэмы» Уладзімір Піліпенка, галоўны канструктар цэнтра па САПР Васіль Кунцэвіч, вядучы тэхнолаг Віктар Малышаў, кандыдат тэхнічных навук, начальнік аддзела Сяргей Ефіменка і многія іншыя спецыялісты.

***

Стварэнне ўласных навуковых школ, уласных навуковых напрамкаў, а адпаведна — уласнага звяна спецыялістаў найвышэйшай катэгорыі, — трэці напрамак ва ўсёй сістэме работы «Інтэграла» з кадрамі. Як падкрэсліваюць тут, каб рухацца далей, трэба добра разумець і вывучаць далей тыя фізіка-хімічныя працэсы, якія ляжаць у аснове мікрасвету і ў аснове яго ляжыць сплываць за мяжу.

У нашай краіне, па шэрагу абставінаў, замежныя філіялы і прадстаўніцтвы такога прытулку, як у Расіі, не знайшлі. Гэта нам і дазволіла ў асноўным захаваць свае кадры (калі не браць да ўвагі той факт, што пры гэтым нямала беларускіх спецыялістаў усё ж такі апынулася за мяжой — на тых жа прадпрыемствах радыёэлектронай прамысловасці). І ўсё ж у асноўным кадры радыёэлектронікі ў краіне былі захаваны.

***

«Інтэгралу» дапамаглі не толькі абставіны — ён, вырашаючы кадравую праблему, у многім, так бы мовіць, дапамог сабе сам. Тут усю сістэму падрыхтоўкі кадраў разбіваюць на тры ўзроўні. Да першага ўзроўню адносяць падрыхтоўку наладчыкаў, аператараў і г.д. І гэты ўзровень, калі мець на ўвазе тое, што «Інтэграл» мае свой базавы прафесійна-тэхнічны каледж электронікі, асаблівага клопату не выклікаў. Затое пастаянна хвалявала падрыхтоўка кадраў другога ўзроўню — распрацоўшчыкаў мікрасхем, або, як яшчэ на прадпрыемстве называюць гэтых спецыялістаў, — дызайнераў, а таксама інжынераў-тэхнолагаў. Сучасная радыёэлектроніка патрабуе ад спецыялістаў, якія працуюць у галіне мікраэлектронікі, ведаў у розных галінах фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, вылічальнай тэхнікі, праграмавання. Таму ў падрыхтоўцы кадраў для «Інтэграла» прымаюць удзел прадстаўнікі розных кафедраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа. Вялікая ўвага надаецца работе з моладдзю. Ужо на трэцім курсе студэнты-фізікі, якія выявілі жаданне звязаць свой лёс з «Інтэгралам», праходзяць вытворчую практыку на прадпрыемстве, а на чацвёртым курсе пачынаюць выконваць дыпломныя работы, якія, як правіла, маюць канкрэтную прыкладную накіраванасць. Пасля заканчэння ВНУ большасць з іх прыходзіць на прадпрыемства.

Другі напрамак супрацоўніцтва з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, у прыватнасці з універсітэтам інфарматыкі і радыёэлектронікі, — падрыхтоўка інтэгралаўскімі работнікамі спецыяльных навучальных курсаў, якія потым чытаюць непасрэдна выкладчыкі ўніверсітэта. Як вельмі станоўчы прыклад такога супрацоўніцтва на «Інтэграле» называюць супрацоўніцтва з кафедрай прафесара, доктара фізіка-матэматычных навук В. Барысенкі, дзе прафесар Уладзіслаў Нелаеў вучыць студэнтаў самым перадавым метадам праектавання мікрасхемаў.

На самім «Інтэграле», ці дакладней — на яго прадпрыемстве «Транзістар», створаны і паспяхова працуе на працягу ўжо шэрагу гадоў філіял адной з кафедраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, у прыватнасці кафедры акадэміка Анатоля Дастанкі (ад «Інтэграла» філіял узначальвае доктар тэхнічных навук, прафесар Леанід Ануфрыеў). Гэта кафедра з'яўляецца базавай па падрыхтоўцы будучых спецыялістаў менавіта для «Транзістара».

Дзейнічае вучэбны клас і ў самым, так бы мовіць, сэрцы «Інтэграла», або там, дзе і нараджаюцца мікрасхемы, — у навукова-тэхнічным цэнтры «Белмікрасістэмы». Тут праходзяць свой дадатковы курс навук, адначасова знаёмяцца з унікальным абсталяваннем НТЦ, працэсамі праектавання, выконваюць лабараторныя работы студэнты фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. «Курс навук», і ў прыватнасці па асаблівасцях сістэм сучаснага праектавання, праводзяць такія высокакампетэнтныя спецыялісты «Інтэграла», як член-карэспандэнт Акадэміі навук, намеснік дырэктара цэнтра «Белмікрасістэмы» Уладзімір Піліпенка, галоўны канструктар цэнтра па САПР Васіль Кунцэвіч, вядучы тэхнолаг Віктар Малышаў, кандыдат тэхнічных навук, начальнік аддзела Сяргей Ефіменка і многія іншыя спецыялісты.

***

Стварэнне ўласных навуковых школ, уласных навуковых напрамкаў, а адпаведна — уласнага звяна спецыялістаў найвышэйшай катэгорыі, — трэці напрамак ва ўсёй сістэме работы «Інтэграла» з кадрамі. Як падкрэсліваюць тут, каб рухацца далей, трэба добра разумець і вывучаць далей тыя фізіка-хімічныя працэсы, якія ляжаць у аснове мікрасвету і ў аснове яго ляжыць сплываць за мяжу.

У нашай краіне, па шэрагу абставінаў, замежныя філіялы і прадстаўніцтвы такога прытулку, як у Расіі, не знайшлі. Гэта нам і дазволіла ў асноўным захаваць свае кадры (калі не браць да ўвагі той факт, што пры гэтым нямала беларускіх спецыялістаў усё ж такі апынулася за мяжой — на тых жа прадпрыемствах радыёэлектронай прамысловасці). І ўсё ж у асноўным кадры радыёэлектронікі ў краіне былі захаваны.

***

«Інтэгралу» дапамаглі не толькі абставіны — ён, вырашаючы кадравую праблему, у многім, так бы мовіць, дапамог сабе сам. Тут усю сістэму падрыхтоўкі кадраў разбіваюць на тры ўзроўні. Да першага ўзроўню адносяць падрыхтоўку наладчыкаў, аператараў і г.д. І гэты ўзровень, калі мець на ўвазе тое, што «Інтэграл» мае свой базавы прафесійна-тэхнічны каледж электронікі, асаблівага клопату не выклікаў. Затое пастаянна хвалявала падрыхтоўка кадраў другога ўзроўню — распрацоўшчыкаў мікрасхем, або, як яшчэ на прадпрыемстве называюць гэтых спецыялістаў, — дызайнераў, а таксама інжынераў-тэхнолагаў. Сучасная радыёэлектроніка патрабуе ад спецыялістаў, якія працуюць у галіне мікраэлектронікі, ведаў у розных галінах фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, вылічальнай тэхнікі, праграмавання. Таму ў падрыхтоўцы кадраў для «Інтэграла» прымаюць удзел прадстаўнікі розных кафедраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінскага дзяржаўнага вышэйшага радыётэхнічнага каледжа. Вялікая ўвага надаецца работе з моладдзю. Ужо на трэцім курсе студэнты-фізікі, якія выявілі жаданне звязаць свой лёс з «Інтэгралам», праходзяць вытворчую практыку на прадпрыемстве, а на чацвёртым курсе пачынаюць выконваць дыпломныя работы, якія, як правіла, маюць канкрэтную прыкладную накіраванасць. Пасля заканчэння ВНУ большасць з іх прыходзіць на прадпрыемства.

Намеснік генеральнага дырэктара НТЦ «Белмікрасістэмы» «Інтэграла» Анатоль БЕЛАВУС, першы намеснік старшыні прэзідыума НАН Беларусі Пётр ВІЦЯЗЬ і госць «Інтэграла» Жарэс АЛФЁРАЎ у выставачна-інфармацыйным цэнтры аб'яднання.

На ўвазе ў «Інтэграле» і ўдасканаленне ўжо існуючых і стварэнне новых сістэм якасці, якія адпавядаюць самым высокім сусветным патрабаванням. Гэта, у прыватнасці, сістэма якасці, якая адпавядае патрабаванням стандарта ISO 9001:2000, сістэма якасці, якая адпавядае патрабаванням стандарта ISO/TS 16949:2002, сістэма якасці, якая адпавядае патрабаванням стандарта ISO 14001:2004, сістэма якасці, якая адпавядае патрабаванням стандарта OHSAS 18001:2007.

Ужо цяпер «Інтэграл» — буйнейшае прадпрыемства ў краіне, якое мае ў сваім распараджэнні ўласны комплекс мікраэлектронікі. Ён уключае ў сябе ўласную вытворчасць крышталёў, пласцін, фоташаблонаў, мікрасхем, а таксама ўласную вытворчасць электронных прыбораў, у якіх выкарыстоўваюцца мікрасхемы «Інтэграла». Ён уключае ў сябе ўласную вытворчасць крышталёў, пласцін, фоташаблонаў, мікрасхем, а таксама ўласную вытворчасць электронных прыбораў, у якіх выкарыстоўваюцца мікрасхемы «Інтэграла». Ён уключае ў сябе ўласную вытворчасць крышталёў, пласцін, фоташаблонаў, мікрасхем, а таксама ўласную вытворчасць электронных прыбораў, у якіх выкарыстоўваюцца мікрасхемы «Інтэграла».

Ёсць нагода

На пыльных сцяжынках далёкіх планет...

12 красавіка — Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі. Праўда, рамантыка прафесіі касманаўта ўжо не вабіць сучасных дзяцей — калі ў 60-я гады ў СССР амаль пятая частка хлопчыкаўпадлеткаў марылі стаць касманаўтамі, то цяпер у спісе 10 самых прывабных прафесій гэтай няма зусім.

Больш за тое — цяпер пятая частка расійскіх падлеткаў не ведае, з якой краіны родам першы касманаўт. Смешна?.. А вы ці многа ведаеце пра гісторыю асваення космасу? Прапануем экспрэс-тэст на гэту тэму:

1. Колькі часу правёў у космасе першы чалавек — Юрый Гагарын?

а) 24 гадзіны;
б) 1 гадзіну 48 хвілін;
в) 3 гадзіны;

2. А прызямліўся першы пілатуемы касмічны карабель «Усход-1»...

а) у Алтайскім краі;
б) у Саратаўскай вобласці;
в) у Казахстане — паблізу Байканура.

3. Дата дэбютнага старту першага беларускага касманаўта Пятра Клімука...

а) 12 красавіка 1970 года;
б) 24 кастрычніка 1975 года;
в) 18 снежня 1973 года;

4. Якога звання няма ў беларускага касманаўта Уладзіміра Кавалёнка?

а) Герой Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі;
б) Герой Польскай Народнай Рэспублікі;
в) Герой Мангольскай Народнай Рэспублікі;

5. Як прозвішча астранаўта, які зрабіў першы крок па паверхні Месяца?

а) Колінз;
б) Армстранг;
в) Сінатра.

6. Радзімай упакоўкі для прадуктаў харчавання касманаўтаў лічыцца...

а) Эстонія;
б) Малдавія;
в) Кітай.

7. Хто па нацыянальнасці першы касмічны турыст?

а) італьянец;
б) амерыканец;
в) японец.

8. На якой планеце «прадбачыў» яблыневы сад савецкі паэт-песеннік?

а) Юпіцер;
б) Венера;
в) Марс.

20 жніўня 1961 года. Канструктар Алег Газенка без пагаднення з кіраўніцтвам арганізаваў сваім падапечным «касмічным дварнякам» Белцы (справа) і Стрэлцы прэс-канферэнцыю ў ТАСС. У тыя гады ў свеце не было больш знакамітых сабак — аднаго са шчанюкоў Стрэлкі Мікіта Хрушчоў потым нават даслаў у падарунак у Белы дом Жаклін Кенэдзі.

ПРАВАПРАЕМ АДКАЗЫ:

1. 108 хвілін доўжыўся першы палёт чалавека ў космас, а вось другі арбітальны палёт, які здзейсніў Герман Цітоў у жніўні 1961 года, доўжыўся ужо больш за суткі, 25 разоў вакол 18 хвілін.

2. Карабель зрабіў 1 віток вакол Зямлі і вярнуў насадку неабходнае ад вёсак Смелуха Цярноўскага раёна Саратоўскай вобласці.

3. Першы касмічны палёт з удзелам беларуса адбыўся 18 снежня 1973 года. Усяго ж Пётр Клімук за тры палёты правёў больш як 78 дзён.

4. Героем Польскай Народнай Рэспублікі Уладзімір Кавалёнак не быў; затое сярод яго ўзнагарод ёсць польскі ваенны орден «Крыж Грунвальда» III ступені.

5. Першым з людзей на лаверкно Месяца ступіў амерыканскі астранаўт Ніл Армстранг. Высадка адбылася 21 ліпеня 1969 года.

6. Першы аэракасмічны турбо для ўнаркоўкі «касмічнага меню» вырабляліся ў Эстоніі, хоць іх вытворчасць спачатку не была спецыялізаваная менавіта для космасу. З 1970 года касмічныя заказы перайшлі да Ціраспальскага завода метазлітарэфій (Малдавія), а разнавіднасці тэхналогіі была перапрацаваная, і другія арбітальныя палёты ўжо больш нагадвалі «Марыю Мантэсорі».

7. Пытанне з падвохам — першым у свеце касмічным турыстам стаў амерыканскі мультымільянер італьянскага паходжання Дэніс Ціта, які ў 2001 годзе адвёў міжнародную касмічную станцыю. Ён, як і астатнія турысты — вязнаем з ПАР Марк Шатлуорт — запланаў за гэта падарожжа Федэральнаму касмічнаму агенцтву Расіі 20 мільёнаў долараў. Ларэ, дарэчы, кошт касмічнага туда вырас амаль да 40 мільёнаў долараў. Таксама два разы таму была названа цана на новую пасуду — выхад у адкрыты космас — вам каштуе 15 мільёнаў долараў.

8. «І на Марсе будуць вулічы цацкі» — гэта песня пра парагнала у 1963 годзе у савецкім фантастычным кінафільме «Марыя насустрач».

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного аукциона по продаже объекта республиканской собственности с установлением начальной цены продажи равной одной базовой величине и права заключения договора аренды земельного участка

Предмет аукциона	**Лот №1** **Незаконсервированное не завершенное строительством капитальное строение «Производственный корпус для обработки семян» и право заключения договора аренды земельного участка площадью 1,5117 га, сроком на 50 лет**
Место нахождения объектов	Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Свердлова, 203 (Лида-14, Северный промузел)
Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	87 583,710
Сумма задатка, тыс. руб.	8 758,000
Продавец недвижимого имущества	Республиканское унитарное предприятие «Гродносортсемовощ», контактные телефоны: (8 01561) 5 82 30, 5 82 32
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82

1. Аукцион состоится **27 апреля 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 23 апреля 2009 года до 16.00**, кабинет 6.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549.

4. Решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

5. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды этого участка, возместить расходы, связанные с проведением данного аукциона и формированием земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка.

6. После совершения победителем аукциона названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

7. Подробная информация – в извещениии о проведении аукциона, ранее опубликованном в газете «Звязда» **от 5 марта 2009 года № 41 (26419)**.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении аукциона по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков

Предмет аукциона	**Лот № 1** **Капитальное строение (здание аптеки № 33 с верандой, сенями, сараем, погребом и колодцем) № 421/С-1682 и право заключения договора аренды земельного участка** для обслуживания продаваемого недвижимого имущества
Место нахождения объектов	Гродненская область, Вороновский район, дер. Заболоть, ул. Ленина, 50
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	26 018,895
Сумма задатка, тыс. рублей	2 601,000
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактные телефоны: (8 0152) 74 43 96, 74 43 92
Характеристика объектов недвижимого имущества	Здание аптеки № 33 с верандой, сенями, сараем и погребом – 1929 года постройки, общая площадь 91,3 кв.м, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые облицованы кирпичом, перегородки бревенчатые, перекрытия деревянные; крыша стальная, полы дощатые; веранда – плитка и бетон; сени – бетон; отопление печное, электроснабжение – скрытая проводка. Колодец – 1956 года постройки, глубина 10 м, ж/б кольца, двускатный деревянный навес
Условия использования недвижимого имущества	Благоустройство объекта и прилегающей территории
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 421381705652000060 площадью 0,0386 га, срок договора аренды 50 лет
Условия использования земельного участка; ограничения по использованию земельного участка	Занятие земельного участка не позднее шести месяцев после получения свидетельства о государственной регистрации права на него
Предмет аукциона	**Лот № 2** **Капитальные строения: здание аварийно-профилактической службы – мастерские инв. № 441/С-443, сооружение специализированное энергетики – кабельные линии электропередачи инв. № 441/С-9520, сооружение специализированное коммунального хозяйства – канализационные сети инв. № 441/С-9521, сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водопроводные сети инв. № 441/С-9524 и право заключения договора аренды земельного участка** для обслуживания недвижимого имущества
Место нахождения объектов	Гродненская область, Ивьевский район, дер. Геранены, ул. Школьная, 9
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	262 566,460
Сумма задатка, тыс. рублей	26 256,000
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Республиканское унитарное предприятие «Белорусский радиотелевизионный передающий центр». контактные телефоны: (8 0152) 43 01 66, 43 44 28
Характеристика объектов недвижимого имущества	Здание аварийно-профилактической службы – мастерские - 1982 года постройки, отдельно стоящее, в части механических мастерских двухэтажное, гаражей – одноэтажное; общая площадь 489 кв.м, фундамент бутобетонный; наружные и внутренние капитальные стены и перегородки кирпичные; перекрытия – сборные ж/бетонные плиты; крыша односкатная рулонная, ворота металлические; отопление – электрообогрев; электроосвещение – скрытая проводка; водопровод – подключение от артезианской скважины, трубы металлические; канализация – трубы чугунные; вентиляция – приточно-вытяжная. Кабельные линии электропередачи (подземные) – 1982 года постройки, протяженностью 75,0 п. м. Канализационные сети (чугунные) – 1982 года постройки, протяженностью 17,81 п. м. Водопроводная сеть (стальная) – 1982 года постройки, протяженностью 26,0 п. м.
Условия использования недвижимого имущества	Производственное назначение (складское)
Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 422980702601000232, площадь 0,2848 га, срок договора аренды 50 лет
Условия использования земельного участка; ограничения по использованию земельного участка	Осуществление в двухмесячный срок после принятия районным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок
Предмет аукциона	**Лот № 3** **Капитальное строение (здание аптеки с пристройкой, погребом, холодной пристройкой, уборной, забором, калиткой, воротами и дорожкой) инв. № 413/С-5324, сарай инв. № 413/С-7927 и право заключения договора аренды земельного участка** для обслуживания недвижимого имущества
Место нахождения объектов	Гродненская область, Свислочский район, дер. Доброволя, ул. Урбановича, 71
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	22 081,894
Сумма задатка, тыс. рублей	2 208,000
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактные телефоны: (8 0152) 74 43 92, 72 28 30, 74 43 96, 74 06 91
Характеристика объектов недвижимого имущества	Здание аптеки с двумя пристройками и погребом – 1968 года постройки, отдельно стоящее, общая площадь 68,2 кв. м, фундамент бутобетонный; наружные и внутренние капитальные стены щитовые, обложенные кирпичом, перекрытия деревянные, крыша шиферная, отопление печное, электроосвещение – наружная проводка; газоснабжение – сжиженный газ; имеется радио и телефон; уборная дощатая с бетонным выгребом – 1968 года постройки; забор металлический с воротами и калиткой – 1968 года постройки общей площадью 107 кв. м; дорожка – 1968 года постройки, бетонная, площадь 20 кв. м. Сарай – 1968 года постройки, общая площадь 29,2 кв. м, фундамент бутобетонный; стены и перегородки блочные; кровля шиферная
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 425281301101000067 площадью 0,0508 га, срок договора аренды 50 лет
Условия использования недвижимого имущества	Вовлечение в хозяйственный оборот в течение одного года с момента приобретения
Условия использования земельного участка; ограничения по использованию земельного участка	Осуществление в двухмесячный срок после принятия районным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок
Предмет аукциона	**Лот № 4** **Капитальные строения: здание административно-хозяйственное инв. № 430/С-15996, здание специализированное автомобильного транспорта инв. № 430/С-1246 и право заключения договора аренды двух земельных участков** для обслуживания недвижимого имущества
Место нахождения объектов	Гродненская область, г. Новогрудок, ул. Комсомольская, 5
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	580 575,863
Сумма задатка, тыс. рублей	58 057,000
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Учреждение образования «Новогрудский государственный аграрный колледж», контактные тел. (8 01597) 2 13 24, 2 16 21
Характеристика объектов недвижимого имущества	Здание административно-хозяйственное – 1959 года постройки, отдельно стоящее, трехэтажное с подвалом общей площадью 2346,0 кв. м, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия междуэтажные и чердачные – деревянные, крыша шиферная, полы дощатые, ДСП, линолеум; водопровод – металлические трубы, канализация – чугунные трубы, электроосвещение – скрытая электропроводка, теплоснабжение – чугунные радиаторы, телефонная связь и ретрансляционная сеть. Здание специализированное автомобильного транспорта – 1970 года постройки, отдельно стоящее, одноэтажное общей площадью 117,5 кв. м, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы бетонные, ворота металлические, электроосвещение – скрытая проводка
Условия использования недвижимого имущества	Ремонт фасада и благоустройство территории в течение трех лет с момента заключения договора купли-продажи
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 424350100001001863 (для обслуживания здание гаража) площадью 0,0141 га, земельный участок с кадастровым номером 424350100001000560 (для обслуживания административного здания) площадью 0,18 га, срок договора аренды земельных участков – 51 год
Условия использования земельного участка ограничения по использованию	В случае изменения функционального назначения объекта получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)

1. Аукцион состоится **14 мая 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 11 мая 2009 года до 13.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

3. К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет Организатора аукциона;
- **юридическим лицом** – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
- **индивидуальным предпринимателем** – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;
- **иностранным юридическим лицом** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- **представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;
- **представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549.

5. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. Организатор аукциона, опубликовавший извещение, вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

7. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся в случаях, если:

- заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;
- ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;
- ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

8. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

9. Решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

10. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды этого участка, возместить расходы, связанные с проведением данного аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка.

11. После совершения победителем аукциона действий, указанных в **п.10**, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями этого аукциона Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Победитель обязан осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка.

12. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке:

- победителем аукциона, являющимся резидентом Республики Беларусь – в рублях - победителем аукциона, являющимся нерезидентом Республики Беларусь, – в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ЦЯЛЬЦЫ МОГУЦЬ ЗМЯНІЦЬ МЕСЦА ЖЫХАРСТВА, А РЫБАЎ ЧАКАЕ РАМАНТЫЧНАЕ ЗНАЁМСТВА

БАРАН. Праявіце больш актыўнасці і творчай ініцыятывы на працы. Забудзьцеся пра тое, што такое лянота і стомленасць, працуйце столькі, колькі зможаце. Усё будзе цудоўна, калі не будзеце спрачацца з начальствам. Асабліва будуць радаваць стасункі з дзецьмі — толькі не варта патураць усім іх капрызам. Абмяжуйцеся некалькімі дзясяткамі.

ЦЯЛЕЦ. Назіраецца ўздым актыўнасці: усё ў рост, усё на карысць. Пажынайце лаўры і вынікі сваёй працы. Справы палепшацца дзякуючы партнёрству. Можа адбыцца змена месца жыхарства. Неабходна быць больш уважлівымі падчас працы з дзелавымі паперамі, дакументамі ці матэрыяльнымі каштоўнасцямі.

БЛІЗНЯТЫ. Актыўнасць і аптымізм дазволяць дабіцца жаданага поспеху. У панядзелак павышанай увагі з боку кіраўніцтва лепш пазбягаць, інакш вам могуць даць не вельмі прыемнае даручэнне. У чацвер праявіце абачлівасць, не спадзявайцеся нядбала на чыесьці словы. Даверлівасць можа негатыўна адбіцца на вашым фінансавым становішчы.

РАК. Могуць раздзіраць унутраныя супярэчнасці, што не лепшым чынам адаб'ецца на працаздольнасці. Верагодна ўзнікненне непрадказальнай сітуацыі, якая будзе спрыяць змяненню працоўных абавязкаў ці вашага стаўлення да іх. Задуманы праект можа ажыццявіцца пры дапамозе ўплывовых асобаў, аднак неабходна прадумаць некалькі запасных варыянтаў.

ЛЕЎ. Тыдзень спрыяльны для павышэння прафесійнага ўзроўню. Можаце завяршыць і вырашыць амаль усе свае справы, але на гэта спатрэбіцца шмат сілаў. Таму рацыянальна размяркоўвайце час на працу і на адпачынак. Пастарайцеся праяўляць асцярожнасць і абачлівасць пры афармленні афіцыйных папераў.

ДЗЕВА. З'явіцца магчымасць адкрыць новыя прасторы для сваёй дзейнасці — а сябры будуць гэтаму спрыяць. У справах праявіце дыпламатычнасць і гнуткасць, абавязкова прыслухайцеся да голасу інтуіцыі. У сярэдзіне тыдня давядзецца прымаць сур'ёзнае рашэнне, ад якога могуць залежаць далейшыя падзеі вашага жыцця.

ШАЛІ. Зможаце станоўча зарэкамендаваць сябе ў соцыуме, праявіць свае лепшыя якасці ярка і арыгінальна. Але пры гэтым улічвайце і інтарэсы калектыву, у якім працуеце. У гэты перыяд нават дробязь можа стаць істотнай для вас. Пастарайцеся пазбягаць паспешлівых рашэнняў як у дзелавых пытаннях, так і ў праблемах асабістага характару.

СКАРПІЁН. Перш чым прыняць канчатковае рашэнне, неабходна ўсё прадумаць і не спакушацца прывабнымі перспектывамі, бо тыдзень будзе вельмі супярэчлівым. Да серады пажадана не рабіць ніякіх рэзкіх дзеянняў. Пастарайцеся не ўлазіць у канфлікты без асаблівай неабходнасці. У пятніцу давядзецца прыняць сур'ёзнае рашэнне, ад якога могуць залежаць перспектывы на найбліжэйшую будучыню.

СТРАЛЕЦ. Не варта рэагаваць на патрабаванні начальства занадта эмацыянальна — паберажыце свае нервы. Вы знойдзеце дыпламатычны спосаб уцячы ад непрыемнасцяў і абавязкова даб'яцеся рашэння, якое патрэбна вам. У панядзелак пастарайцеся ажыццявіць патаемнае жаданне. Серада спрыяльная для важных спраў і арганізацыі сустрэч.

КАЗЯРОГ. Новыя справы, праекты і прапановы падаспеюць да месца — гэта спрыяльны час для канструктыўных перамен. З'явіцца магчымасць павысіць свой сацыяльны статус. У аўторак не варта прымаць важнае рашэнне ў адзіночку. Варта прааналізаваць адносіны з навакольнымі. Калі ўсё выглядае не так, як хацелася б, даруйце даўнія крыўды і падумайце пра новыя сумесныя справы.

ВАДАЛЕЙ. Не спрабуйце зрабіць так, каб навакольныя зразумелі вас і ўвайшлі ў ваша становішча. Вырашаць свае праблемы давядзецца самастойна — і пачаць трэба з таго, што не ствараць лішніх праблем іншым. Пастарайцеся не афішаваць свае планы на будучыню. Перагледзьце жаданні: магчыма, варта змяніць прыярытэты ці скарэктаваць напрамак прымянення сілаў і магчымасцяў.

РЫБЫ. Ваша сабранасць і дасціпнасць будуць дзейнічаць на навакольных мабілізуюча. Калі не разгубіцеся ў незвычайнай сітуацыі, то можа парадаваць рамантычнае знаёмства. Вырашайце праблемы па меры іх узнікнення, не губляючы лішніх сілаў на крытыку і жаль да сябе.

Открытое акционерное общество «Синявская мебельная фабрика»

сообщает, что общее собрание акционеров состоится 22 апреля 2009 года в 12.00 в актовом зале (3-й этаж) ОАО «Синявская мебельная фабрика».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О реорганизации ОАО «Синявская мебельная фабрика» путем присоединения его к ОАО «Борисовдрев».
2. Об утверждении договора о присоединении ОАО «Синявская мебельная фабрика» к ОАО «Борисовдрев».
3. Об утверждении состава комиссии по присоединению ОАО «Синявская мебельная фабрика» к ОАО «Борисовдрев».

Собрание состоится по адресу: Минская область, Клецкий район, д. Синявка, ул. Фабричная, 1.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская область, Клецкий район, д. Синявка, ул. Фабричная, 1, в приемной директора (в рабочие дни понедельник—четверг с 8.00 до 17.00).

Список акционеров для участия в общем собрании будет составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 1 апреля 2009 года.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 11.00 до 11.50.

Напоминаем, что участник собрания акционеров должен иметь паспорт (представитель акционера — паспорт, доверенность).

Наблюдательный совет ОАО «Синявская мебельная фабрика».

ОАО «Синявская мебельная фабрика» предлагает для реализации емкости для хранения ГСМ объемом от 3 до 26 м куб. Предлагаем в аренду производственные 2000 м кв. высота 7 м категории А класс П-1 и офисные площади.

Тел./факс: (01793) 45 8 38, 45 4 80.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Открытое акционерное общество Полоцкий завод «Проммашремонт»

211408, Витебская область, г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101

Бухгалтерский баланс на 1 января 2009 года

млн руб.

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
АКТИВ			
1. Внеоборотные активы	190	20256	22985
2. Оборотные активы	290	4178	4403
Баланс	300	24434	27388
ПАССИВ			
3. Капитал и резервы	490	18556	21781
4. Обязательства	690	5878	5607
Баланс	700	24434	27388

Отчет о прибылях и убытках

млн руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период	Период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	9407	7222
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	7204	6973
Прибыль (убыток) от реализации	070	706	-824
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	9	64
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	-334	-830
Прибыток (убыток) за отчетный период	200	381	-1590
Налоги и сборы, производимые из прибыли	260	260	236
Прибыль (убыток) к распределению	300	87	-1834
Сумма чистой прибыли, направленной на выплату дивидендов в данном отчетном периоде		4	–
Дивиденды на одну акцию (рублей)		4,015	–

УНП 300075193.

ГОДОВОЙ БАЛАНС

ОАО «Торговый центр «Уручье» за 2008 год

Минск, ул. Руссиянова, 36, тел. 260 81 51

Актив	млн руб.	Пассив	млн руб.
1. Основные средства	366	Уставной фонд	37
2. Запасы	990	Резервный фонд	41
3. Дебиторы	48	Фонды	206
4. Денежные	451	Кредиты банка	–
5. Прочие активы	–	Кредиторская задолж.	1571
Баланс	**1855**	**Баланс**	**1855**

Отчет о прибылях и убытках ОАО «Торговый центр «Уручье»

Наименование показателей (млн руб.)	За 2008 год
Выручка от реализации товаров и услуг	19780
Себестоимость реализованных товаров и услуг	14024
Расходы на реализацию	2508
Внереализационные доходы	-297
Прибыль за отчетный период	57
Налоги и платежи из прибыли	145

Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Торговый центр «Уручье»

№	Наименование показателей	Ед. изм.	За 2008 г.
1.	Выручка от реализации товаров, услуг (за минусом налогов)	млн руб.	19780
2.	Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	млн руб.	14024
	Управленческие расходы, расходы на реализацию из них на оплату труда	млн руб.	-
	Расходы на реализацию	млн руб.	2508
3.	Прибыль за отчетный период, всего	млн руб.	
	В том числе:		
	Прибыль от реализации товаров	млн руб.	499
	Прибыль от внереализационных расходов	млн руб.	-297
4.	Налоги и другие платежи из прибыли	млн руб.	145
5.	Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	-
6.	Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	-
7.	Нераспределенная прибыль	млн руб.	57
8.	Начислено на выплату дивидендов	млн руб.	-
9.	Дивиденды на одну акцию	млн руб.	-
10.	Количество акционеров, всего	лиц	39
	В том числе:		
	юридических лиц	лиц	1
	физических	лиц	38
11.	Среднесписочная численность	человек	147
12.	Обеспеченность акции имуществом Общества	тыс. руб.	305

Директор И.Г. Ермолаева
Главный бухгалтер А.С. Стрелковская

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПАКАТАЛІСЯ НА ЗІЛЕ

У Жыткавіцкім раёне два 25-гадовыя грамадзяніны, добра выпіўшы, не знайшлі лепшай забавы, як пакатацца на грузавым аўтамабілі, які стаяў ля дома па вуліцы Садовай у вёсцы Кольна. Машына ЗІЛ-131 належыць ААТ «Дэльта», якое знаходзіцца ў Рэчыцкім раёне, і вадзіцель пакінуў яе ля дома сваякоў. Пасля заявы кіроўцы ў міліцыю быў тэрмінова ўведзены план «Перахоп». На працягу 20 хвілін, пакуль ён рэалізоўваўся, п'яныя зладзеі атрымалі асалоду ад катання і вырашылі вярнуцца. Нягледзячы на гэта, узбуджана крымінальная справа. Суд вызначыць, як ацаніць іх дзеянні на нецвярозую галаву.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (4 красавіка). Па гарызанталі: Прысак. «Карсар». Абза. Лель. Ежа. Цар. Камю. Рапак. Магістрат. Ура. Акр. Клаксан. Атам. Ахоп. Була. Аскома. Улік. Сын. Каса. Баск. Ікар. Том. Іпадром. **Па вертыкалі:** Цмокі. Самалі. Рыбец. Англаман. Стаер. Сусак. Батыр. Кулак. Трахома. Агранам. Самум. Кілім. Парк. Юрта. Кабукі. Партулак. Аліса. «Ратамка». Макар. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

9	6	7	4	1	8	3	2	5
5	3	2	9	7	6	1	4	8
4	8	1	5	3	2	9	7	6
6	4	3	2	5	1	8	9	7
2	5	9	8	6	7	4	1	3
1	7	8	3	4	9	5	6	2
3	2	6	1	9	5	7	8	4
8	9	5	7	2	4	6	3	1
7	1	4	6	8	3	2	5	9

Сканворд (7 красавіка). Па гарызанталі: Вясёлка. Тэраса. Вяча. Аскет. Сак. Гром. Ананд. Роба. Капітан. Абарот. Каса. Джала. «Казакі». Сала. Кон. Іван. Чыстка. Салата. Шыба. Ост. Рамонт. Акаба. Кар. Траса. Эму. Імя. Паводка. **Па вертыкалі:** Ластаўка. Падснежнік. Капеж. Сіла. Арава. Тытул. Лато. Том. Ананас. Сан. Такт. Караван. Карэя. Якар. Арам. Сыч. Суп. Хна. Агдам. Чарада. Нары. Корак. Сом. Мора. Акт. Бос. Кокан. Праталіна. Тундра.

Сканворд (8 красавіка). Па гарызанталі: Ніягара. Осмій. Вада. Эсхіл. Бор. Грак. Арэол. Сіла. Лакатар. Ясенін. Корч. Аймак. Канада. Грам. Тур. Рама. Сабака. Эталон. Фіга. Ком. Легата. Аклад. Ная. Гарсэт. Акр. Капітан. Эскімос. **Па вертыкалі:** Манрэаль. Харэограф. Хакей. Град. Марал. Літва. «Амок». Кімано. Бар. Мана. Раствор. Каран. Арэх. Ляск. Інд. Эрэ. Чай. Агляд. Салдат. Вага. Засек. Бег. Кіно. Ата. Лір. Дукат. «Хванчкара». Альянс.

Усміхнёмся!

Чым камп'ютар падобны на мужчыну?

1. Тыкнеш пальцам — ён і завядзецца.
2. Патрабуе шмат прымочак і цацак.
3. Заўсёды марыць трапіць у сетку.
4. У яго ўсё падае з зайздроснай перыядычнасцю.
5. Так і намагаецца задаць дурное пытанне.
6. Любіць, каб з яго здзімалі пылінкі і прамывалі спіртам.
7. Лічыць сябе разумным, але не можа абысціся без мамы.
8. Не выносіць рэзкіх перападаў напружання.
9. Спачатку завісае, а потым адключаецца.
10. Бурчыць, калі яго грузяць.
11. Калі надакучвае прыводзіць яго ў парадак, нарэшце, разумееш — танней абзавесціся новым.

☺

Мужык скардзіцца псіхолагу:
— Мне здаецца, што ў нас у халадзільніку хтосьці жыве.
— Чаму вы так вырашылі?
— Жонка туды носіць ежу!

☺

Жанчына была ў ад'ездзе. Па вяртанні пытаецца ў сына:

— Тата сумаваў, калі мяне не было дома?

— Спачатку не, але апошнія два дні ён станавіўся ўсё больш і больш сумным.

☺

Дзень абароны дыпломнага праекта ў ВНУ заўсёды заканчваецца аднолькава. Але ніхто не памятае, як.

Тэлесеткі

ВЫ ТАНЦУЕЦЕ? А МЫ ГЛЯДЗІМ!

За пуцёўку на конкурс «Танцавальнае Еўрабачанне» ў Беларусі, мяркуючы па ўсім, барацьба разгараецца не меншая, чым на больш звыклае песеннае. З больш як трох дзясяткаў вядомых тэлевядучых, выканаўцаў, акцёраў, спартсменаў пасля месяца рэпетыцый журы адабрала ўсяго восем чалавек, з ліку прафесійных танцораў трэнеры, якія працуюць на праекце, і спецыялісты з Беларускай федэрацыі танцавальнага спорту падабралі партнёраў, і — панеслася! Тое, што ніводная з васьмі пар не мае намеру саступаць, стала зразумела ўжо падчас першага паўфінальнага шоу «Зорныя танцы», на здымках якога пабывала і карэспандэнт «Звязды».

...Дарэчы, ці ўмееце вы танцаваць? Калі ўпэўненыя, што навука гэта няхітрая — «два притопа, три прихлопа» — абавязкова паглядзіце «Зорныя танцы». Не толькі для таго, каб пераканацца, што навука танца не менш складаная за ўсе іншыя навукі, але і для таго, каб зразумець — навучыцца можна нават самым філігранным па. Калі вельмі захацець і палюбіць справу, якой займаешся.

Аляксей Хлястоў і Алена Ляшкевіч: гэта самая невысокая пара паказвае высокі ўзровень майстэрства.

Хто гэтыя людзі?

Ці не першае пытанне, якім зададуцца многія гледачы. Калі вядучых, артыстаў, акцёраў мы больш ці менш ведаем, то імя гасьці з беларускіх прафесійных танцораў назаве далёка не кожны. Між тым, сярод прафесіяналаў таксама адбываўся своеасаблівы кастынг — улічваліся і знешнія даныя — рост, постаць, тыпаж, і спартыўныя дасягненні — у шоу прымаюць удзел шматразовыя чэмпіёны Беларусі, прызёры рэспубліканскіх і міжнародных турніраў, словам, танцоры, вядомыя далёка за межамі нашай краіны. Знаёмім: права на пуцёўку ў Баку (менавіта там адбудзецца сёлета «Танцавальнае Еўрабачанне») будуць аспрэчваць: Дзмітрый Карась—Ірына Казанцава, Венера—Павел Грабёнкін, Кірыл Клішэвіч—Святлана Пашкевіч, Іскуі Абалян—Арцём Гарбачоў, Руслан Чарнецкі—Кацярына Папова, Вікторыя Сянкевіч—Сяргей Кісялёў, Юлія Раскіна—Дзяніс Марасін, спявак Аляксей Хлястоў—Алена Ляшкевіч.

У кожным шоу пары будуць дэманстраваць па адным танцы лацінаамерыканскай і еўрапейскай праграмы — на ўласны выбар. Напрыклад, у першым выпуску мы ўбачым квік-стэп, джайв, ча-ча-ча, факстрот, пасадобль, румбу і адразу два вальсы — хуткі венскі і павольны. Прычым выконвацца ўсё гэта будзе пад сусветна вядомыя хіты — спалучэнне ў многіх выпадках, трэба сказаць, атрымалася неардынарнае.

Галоўнае — каб касцюмчык сядзеў

Усім «зорным» удзельнікам шоу, расказала кіраўнік прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі Святлана Смалонская-Краскоўская, для кожнага выступлення шыюцца адмысловыя касцюмы і абутак — у залежнасці ад тэмы танца касцюмеры распрацоўваюць вобраз пары. Да прафесіяналаў падыход індывідуальны: у кагосьці ёсць уласны ўбор, камусьці ўборы шыюцца або бяруцца напракат. Праўда, спецыяльны абутак, па чутках, некаторыя ўдзельнікі, хто найбольш актыўна рэпеціруе, набываюць і самі — на паркеце ён зношваецца літаральна за адзін нумар.

Арганізатары не хаваюць — касцюмы сталі адным з самых вялікіх артыкулаў выдаткаў у праекце, хоць іх і стараліся патаніць па меры сілаў. Умельцам-касцюмерам давялося выкручвацца, каб адзенне было не празмерна дарагім, а выглядала на ўзроўні. Крызіс крызісам, а тэлевізійная карцінка павінна быць прыгожай...

Дарэчы, некаторыя элементы ў касцюмах мяняюцца літаральна з колаў — напрыклад, на першым прагоне Аляксей Хлястоў красаваўся ў пунсовай кашулі і такім жа гальштуку, а ўжо для здымак вырашыў дадаць у вобраз яркую дэталь — і змяніў гальштук на зялёны.

— Што будзе з усімі гэтымі ўборамі пасля заканчэння шоу? — пацікавіліся мы.

— Мы ўжо думалі над гэтым пытаннем, — расказала Святлана Смалонская-Краскоўская, — і вырашылі, што проста павесіць іх у шафу ва ўмовах крызісу, безумоўна, будзе няправільна. Магчыма, правядзём дабрачынны аўкцыён. А магчыма, калі нехта з «зорак» упадабае пэўны касцюм і захоча набыць яго для наступных выступленняў ці для заняткаў танцамі — абмяркуем і такі варыянт.

У тэмпе вальса

Схема шоу прынцыпова не новая — знаёмая прыхільнікам расійскіх лядовых і звычайных «танцаў з зоркамі» як свае пяць пальцаў. Пару выклікаюць «на паркет» (насамрэч на пляцоўцы спецыяльнае пакрыццё, не лінолеум і не шкло, нешта сярэдняе), паказваюць сюжэт з рэпетыцый, дэманструецца конкурсны нумар. Потым вядучыя — акцёр Віталь Макарэвіч і фітнэс-трэнер Святлана Кашыцкая — падзяляюць абавязкі: адзін задае колькі пытанняў удзельнікам, другі просіць выставіць ацэнкі (па 6-бальнай сістэме) і падзяліцца ўражаннямі членаў журы. Усё дастаткова хутка... калі б не запісваліся на ўсякі выпадак два дублі.

Максімальны бал — аднагалосна!

А суддзі хто?

Суддзяў у «Зорных танцах» пяцёра, але толькі дваіх з іх мы будзем бачыць пастаянна — старшыню журы, намесніка старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Мартыненку і мастацкага кіраўніка праекта «Зорныя танцы», старшыню Беларускай федэрацыі танцавальнага спорту, дырэктара Белдзяржцырка Таццяну Бандарчук. Астатнія члены журы будуць мяняцца ў кожным шоу — напрыклад, у першым выпуску пары ацэньвалі з розных пунктаў гледжання харэограф Аляксандр Мяжэнны і мадэльер Саша Варламаў, у адным з наступных шоу чакаецца ў госці знакамітая гімнастка, а цяпер расійскі дэпутат Святлана Хоркіна, вядуцца перамовы з іншымі вядомымі медыяперсонамі — але ўсё залежыць ад іх графіка.

Таццяна Бандарчук, дарэчы кажучы, ужо на першым шоу прызналася, што з асаблівым хваляваннем сочыць за выступленнямі Юліі Раскінай у пары з Дзянісам Марасіным, бо Юля цяпер — паветраная гімнастка, артыстка Белдзяржцырка. Зрэшты, і іншыя выступленні Таццяна Мікалаеўна ацэньвала шматслоўна, эмацыйна, па-жаночаму. «О, джайв — гэта мой любімы танец, дагадзілі!» — каментавала яна адзін з нумароў, напэўна ўяўляючы сябе ў ролі іншай экспрэсіўнай Таццяны — Тарасавай.

А вось Аляксандр Мартыненка, наадварот, выступленні ацэньваў коратка і па сутнасці, празмерная прыхільнасці да «сваіх» — тэлевядучых — не выказаў, і ўвогуле, як нам падалося, быў самым строгім з суддзяў.

— Далей буду яшчэ больш строгім! — папярэдзіў Аляксандр Іванавіч. — На першым шоу мы стараліся ўсіх падтрымаць, а далей будзем арыентаваць на барацьбу, старацца, каб нашы артысты паказвалі больш высокі ўзровень. Так што ніякіх паблажак удзельнікам-тэлевядучым рабіць не буду — мы зацікаўлены ў моцным аб'ектыўным фінале, у відовішчным шоу. Думаю, і Таццяна Мікалаеўна, калі казала пра сваю прыязнасць да пэўнай пары, толькі пажартавала.

Форс-мажор

Ён здарыўся ўжо на першым шоу — адна пара набрала найменшую колькасць галасоў, а перадапошняе месца падзялілі адразу дзве пары. Аднак па правілах кандыдатамі на выбыванне становяцца толькі дзве пары, адну з якіх могуць «выратаваць» СМС-галасаванне тэлегледачы. Сітуацыю выправіла журы, унутраным галасаванне вырашыўшы, каму з удзельнікаў застацца ў праекце, а каму трапіць у намінацыю.

Хто трапіў у гэту тройку, хто абяцаў «паказаць усё», у чым выкананні харэограф Аляксандр Мяжэнны так і не ўбачыў факстрота, хто прымерыў на сябе вобраз Мерылін Манро, а хто прадэманстраваў бой быкоў, і, нарэшце, што ўсім ім за гэта было — раней эфіру арганізатары прасілі не раскрываць. Так што глядзіце самі — у нядзелю, 12 красавіка, у вячэрнім эфіры Першага канала, прэм'ера шоу «Зорныя танцы».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прэс-службы БТРК.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЫХТУЕМСЯ ДА СВЯТА

Велікодныя прысмакі

Сярод хрысціянскіх рэлігійных святаў няма свята больш урачыстага, чым Вялікдзень. Гэта самая галоўная, самая значная падзея — дзень дзівоснага ўваскрэсення Хрыстова. Да яе пачынаюць рыхтавацца загадзя, каб сустрэць Вялікдзень у чысціні і ў доме, і ў душы. У гэты асаблівы дзень — толькі адзін раз у год! — выстаўляюцца спецыяльныя рытуальныя стравы, якія нясуць у сабе глыбокі сімвалічны змест.

Як заўсёды, мы падрыхтавалі для вас рэцэпты велікодных прысмакаў і спадзяёмся, што яны дапамогуць зрабіць свята смачным, багатым і добрым.

Куліч «Царскі»

1,6 кг мукі, 100 г дражджэй, 500 г цукру, 500 г сметанковага масла, 150—200 г цукатаў, 200 г сечанага міндалю, 500 мл малака, 8 яек, ванілін, кардамон (калі ёсць), 100 г манных круп.

Злёгку падагрэйце 300 мл гатаванай вады. Яна павінна быць крыху цёплай. Развядзіце ў ёй дрожджы, дадайце 250 г мукі, перамяшайце, пастаўце рошчыну ў цёплае месца, каб яна павялічылася ў аб'ёме. Падагрэйце малако, змяшайце яго з мукой, што засталася, убіце 7 яек, насыпце соль і цукар, змяшайце з рошчынай. Масла злёгку нагрэйце, злучыце з цестам, старанна перамяшайце. Пастаўце цеста ў цёплае месца, каб яго аб'ём павялічыўся ў два разы. Калі цеста паднімецца, яго трэба абмяць, затым дадаць цукаты, папярэдне абкачаўшы іх у муцэ, частку сечанага міндалю, ванілін (і кардамон). Нагрэйце духоўку да 180°. Форму змажце маслам ці маргарынам, пасыпце манкай і вылажыце ў яе цеста, каб яно займала не больш чым трэць вышыні формы. Пастаўце на 30 хвілін у цёплае месца. Верх куліча змажце яйкам, пасыпце рэшткамі міндалю, пастаўце ў духоўку. Выпякайце куліч на працягу прыкладна 40 хвілін. Гатовы куліч можна ўпрыгожыць глазурай, крэмам, згушчаным малаком, рознакаляровай абсыпкай.

Пасха шакаладная

500 г тварагу, 200 г цукру, 150 г масла, 3 ст. лыжкі смятаны, 2 ст. лыжкі парашку какавы, каліва ванілінy, 1/4 ч.лыжкі солі.

Цёплае сметанковае масла разатрыце драўлянай лыжкай да гушчыні смятаны. Дадайце цукар, соль, ванілін, парашок какавы. Усё старанна перамяшайце. Творог пратрыце праз сіта, дадайце смятану. Паступова па лыжцы кладзіце творог у шакаладнае масла. Добра размяшайце, каб маса стала аднароднай. Форму засцяліце марляй, вылажыце творожную масу, зверху накрыйце талеркай, дыяметр якой крыху меншы за дыяметр формы, пастаўце на яе шклянку з вадой ці што-небудзь іншае. Прыбярыце ў халаднаватае месца.

Праз 6—7 гадзін форму асцярожна перакуліце на вялікую талерку, зніміце з пасхі, выдаліце марлю. Пасху ўпрыгожце цукатамі, ягадамі ці фруктамі.

Са згушчаным малаком

1,3 кг тварагу, 300 г масла, 250 г смятаны, 400 г згушчанага малака, 0,5 шк. цукру, 1 шк. разынак, ванілін.

Творог пратрыце праз сіта разам з размякчаным маслам, цукрам і ванілінам, дадайце смятану і згушчанае малако, добра перамяшайце драўлянай лыжкай, пакуль маса не стане аднароднай. У апошнюю чаргу пакладзіце папярэдне распараныя і прасушаныя разынкі. Усё яшчэ раз перамяшайце, пакладзіце ў форму.

-2567-

Дарагое яечка да Святога Вялічка

Здаўна на Вялікдзень людзі абменьваліся фарбаванымі яйкамі. Згодна з царкоўнымі традыцыямі, фарбаваць яйкі трэба ў апошні чацвер перад Вялікаднем. Яго яшчэ называюць Чысты чацвер.

А вы ўмееце фарбаваць яйкі? Вядома, умееце! Нічога складанага ў гэтым няма. Самы просты спосаб — у шалупінні цыбулі ці ў харчовых фарбавальніках, якія можна купіць у краме. Атрымліваюцца яйкі любога колеру: чырвоныя, зялёныя, жоўтыя, фіялетавыя. Аднак мы прапануем паспрабаваць зрабіць што-небудзь больш складанае. Напрыклад,

Драпанкі

Вазьміце яйкі карычневага адцення. Шкарлупіна такіх яек больш моцная. Спачатку яйкі зварыце, затым пафарбуйце ў які-небудзь колер і высушыце. Нанясіце ўзор любым вострым прадметам: шылам, нажом, тоўстай іголкай. Папярэдне зрабіце эскіз алоўкам. У час работы яйка трымайце ў левай руцэ, а востры прадмет — у правай. Ажурны малюнак добра глядзіцца на цёмнай фарбе.

Крапанкі

Спачатку яйкі пафарбуйце адным колерам, затым, калі яны высахнуць і астынуць, нанясіце кроплі гарачага воску. Як толькі воск астыне, яйкі пакладзіце ў раствор іншага колеру. Пасля высыхання яйкі апусціце ў гарачую ваду. Воск растане, і атрымаюцца вельмі забаўныя яйкі. Воск можна і акуратна саскрэбці.

А яшчэ можна мокрыя яйкі абкачаць у сухім рысе, закруціць кожнае ў марлю, канцы марлі шчыльна завязаць ніткай, каб рыс прыліп да яек, і гатаваць у шалупінні цыбулі звычайным спосабам. Яйкі атрымаюцца ў крапінку, нібы іх знесла нейкая заморская птушка.

Маляванкі

Вельмі прыгожа выглядаюць «мармуровыя» яйкі. Каб іх атрымаць, сырыя яйкі абматайце яркімі каляровымі ніткамі ці кавалачкамі тканіны, якія ліняюць, абкруціце марляй і пакладзіце ў каструлю з халоднай вадой. Гатуйце 15—20 хвілін.

ВЕЛІКОДНАЯ ПРЫКМЕТА

Дзяўчаты ўважліва разглядалі яйка ў разрэзе: чым бліжэй жаўток да краю бялка, тым бліжэй замужжа; чым ярчэйшы жаўток, тым шчаслівейшы шлюб.

КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

♦ Каб удаўся куліч, неабходна мець пазітыўны настрой. Цеста лепш вымешваць рукамі, а не міксерам, бо іх цяпло і добрыя думкі здольныя стварыць кулінарны цуд.

♦ Мясіць цеста трэба доўга, каб яно цалкам адставала ад рук і стала.

♦ Цеста не любіць шуму і скразнякоў, а любіць цяпло, таму кулічы павінны падыходзіць у цёплым месцы пры тэмпературы 25—30 °С.

♦ Форму для куліча (можна скарыстаць высокія каструлі) запаўняюць цестам толькі напалавіну, даюць падняцца да 3/4 формы, а затым ставяць у духоўку.

♦ Аснова любой пасхі — свежы, яшчэ вільготны творог. Яго можна двойчы прапусціць праз мясарубку, аднак калі працерці праз сіта, ён стане больш лёгкім і далікатным, што значна палепшыць смак стравы.

♦ Каб яйкі пры гатаванні не трэснулі, патрымайце іх каля гадзіны ў цёплай вадзе. У ваду, у якой будзеце варыць яйкі, дадайце сталовую лыжку солі.

♦ Прыемны бляск фарбаваным яйкам надае алей, якім можна працерці шкарлупіну.

♦ Перад тым як фарбаваць яйкі, прамыйце іх у содавым растворы ці пратрыце спіртам — фарба ляжа раўней.

-2568-

БРАКАНЬЕРЫ ЛАВІЛІ ПЛОТАК СЕТКАМІ

2 красавіка ў Круглянскім раёне ў час рэйда затрыманы браканьеры. Два жыхары адной з вёсак раёна на Цяцерынскім вадасховішчы лавілі рыбу сеткамі.

Гэта была двойчы незаконная рыбалка. Мала таго, што мужчыны выйшлі на промысел на другі дзень дзеяння забароны на лоўлю рыбы (ён дзейнічае ад 1 красавіка да 31 мая), дык яшчэ і лавілі незаконнымі прыладамі.

Супрацоўнікі Магілёўскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету затрымалі браканьераў на беразе з рыбай у сетках. Там было амаль 300 плотак, а таксама яршы, ляшчы і акуні. У сувязі з дзейнай забаронай на лоўлю рыбы, урон інспектары палічылі ў трайным памеры: ён склаў больш за 6,3 мільёна рублёў.

Вяскоўцы абвінавачваюцца ў незаконнай здабычы рыбы з уронам у асабліва буйных памерах. Па гэтым артыкуле ім можа пагражаць да 6 гадоў пазбаўлення волі.

Алена КАЗЛОВА.

ГОДОВОЙ БАЛАНС ОАСО «ПЕНСИОННЫЕ ГАРАНТИИ» за 2008 год

220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38/16, к. 3

лицензия № 02200/0447164, 18.11.2008 г. — 19.12.2013 г. выдана МФ РБ

УНП 806000061

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	**64,5**	**Источники собственных средств, всего**	**3 641,6**
Нематериальные активы	**3,0**	в том числе: уставный фонд	3 472,1
Финансовые вложения, всего	**1 215,9**	резервный фонд	4,3
в том числе: инвестиции в дочерние общества		добавочный фонд	0,6
инвестиции в другие организации		фонд накопления	82,7
облигации и другие долговые обязательства	1 215,9	фонд потребления	
прочие финансовые вложения		целевое финансирование	
Доля перестраховщиков в страховых резервах		нераспределенная прибыль прошлых лет	0,1
Дебиторы, всего	**11,3**	нераспределенная прибыль отчетного года	81,8
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования		**Страховые резервы и фонды, всего**	**2 537,7**
депо премий по рискам, принятым в перестрахование		в том числе: страховые резервы	2 537,5
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	11,3	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	0,1
Прочие активы, всего	4 886,7	гарантийный фонд	0,1
в том числе: незавершенное строительство		**Кредиторы, всего**	**2,1**
материальные ценности и затраты	30,2	в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	
денежные средства	4 856,5	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	
собственные акции (доли)		депо премий по рискам, переданным в перестрахование	
прочие активы		заемные средства	
Непокрытые убытки прошлых лет		кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	2,1
Непокрытые убытки отчетного года		**Прочие пассивы**	
БАЛАНС	**6 181,4**	**БАЛАНС**	**6 181,4**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ОАСО «ПЕНСИОННЫЕ ГАРАНТИИ» за 2008 год

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	12,2
Страховые выплаты	020	123,8
Изменения резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	- 134,0
Отчисления в фонды	040	0,2
Расходы на ведение дела	041	0,6
Результат от операций по страхованию жизни, (+ или -)	**050**	**- 246,4**
II. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в раздел I		
Операционные доходы	140	608,7
Операционные расходы	145	1,0
Внереализационные доходы	150	
Внереализационные расходы	155	
Платежи и расходы производимые из прибыли	156	108,5
Финансовый результат	157	252,8
Использование прибыли	158	171,0
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	81,8

ВЫДЕРЖКИ ИЗ АУДИТОРСКОГО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ
(С ВЫРАЖЕНИЕМ БЕЗУСЛОВНО ПОЛОЖИТЕЛЬНОГО АУДИТОРСКОГО МНЕНИЯ).
ОАСО «ПЕНСИОННЫЕ ГАРАНТИИ»

Аудитор: индивидуальный предприниматель Волчкова Алина Константиновна.

Местонахождение: г. Минск, ул. Жилуновича, д. 37, кв. 47.

УНН: 100961335, свидетельство № 0067877 от 4.03.2002 г. выдана администрацией Заводского района г. Минска, лицензия на осуществление аудиторской деятельности выданная 28.11.2008 года № 02200/0040484 Министерством Финансов РБ, срок действия до 22 января 2014 г., квалификационный аттестат аудитора № 0000894 от 30.07.2003 года выданный Министерством Финансов РБ.

Мы провели аудит бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАСО «ПЕНСИОННЫЕ ГАРАНТИИ», состоящей из:

бухгалтерского баланса на 01.01.2009 г.;

отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств, отчета о платежеспособности страховой организации, расчета чистых активов, приложения к бухгалтерскому балансу за 2008 г.;

пояснительной записки.

Мнение.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАСО «ПЕНСИОННЫЕ ГАРАНТИИ», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАСО «ПЕНСИОННЫЕ ГАРАНТИИ» на 1 января 2009 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 г., при этом совершенные ОАСО «ПЕНСИОННЫЕ ГАРАНТИИ» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Аудитор — индивидуальный предприниматель Волчкова А.К.
«20» февраля 2009 г.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1950. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12